Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

27 САКАВІКА 2007 г.
АЎТОРАК

№ 57 (25922)

Кошт 400 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

СЁННЯ — АПОШНІ ДЗЕНЬ ПАДПІСКІ. СПЯШАЙЦЕСЯ!

Падпіска-2007

«Хай свеціць нам «Звязда»!

«...Вясновае назіранне: холадна пралесачцы, але яна смела раскрывае свае сінія вочкі насустрач сонцу. Холадна жаўруку, але ж ён уздымаецца ў неба і пяе свае гімны жыццю. Холадна часам нашай мове, але яна жыве і сваёй жаўруковай песняю абуджае душы беларусаў... Ад надвор'я цяпер цяжка чакаць пастаянства, але ж мы ведаем, што цяпло пераможа. І пераможа мова. Расставацца з адзінай беларускамоўнай газетай не магу, не хачу і не буду. Падпісалася. А гэта значыць, што ў мяне і ў хаце, і на душы будзе светла».

Галіна Эдуардаўна ТАЎЛУЙ, *г. Навагрудак.*

* * *

«Звязду» выпісваў мой тата, а я, прыязджаючы да яго, чытала. Потым стала выпісваць сама. А аднойчы — і менавіта падпіску — выйграла. Была такая шчаслівая! Муж кажа сыну: «Глядзі, мама аж свеціцца... Быццам там машына». А я адказала, што калі б выйграла яе ці які «Джэк-пот», то пару мільёнаў падарыла б «Звяздзе», каб яшчэ тысячы людзей адчулі, перажылі такую ж радасць, як я...»

Святлана ЯРМАЛЮК, *г. Брэст.*

У Беларусі прынята Нацыянальная праграма дэмаграфічнай бяспекі на 2007—2010 гады

Прэзідэнт Беларусі зацвердзіў Нацыянальную праграму дэмаграфічнай бяспекі Беларусі на 2007—2010 гады. Адпаведны ўказ № 135 Аляксандр Лукашэнка падпісаў 26 сакавіка.

Галоўнай мэтай праграмы з'яўляецца паляпшэнне дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне. Праграма ўключае комплекс канкрэтных мераприемстваў па рэалізацыі мераў сацыяльна-эканамічнага, адміністрацыйна-прававога і арганізацыйнага характару, накіраваных на падтрымку сем'яў з дзецьмі, умацаванне здароўя і павышэнне якасці жыцця ўсяго насельніцтва, павелічэнне нараджальнасці і працягласці жыцця, зніжэнне захворванасці і смяротнасці, аптымізацыю міграцыйных працэсаў, паляпшэнне дэмаграфічнай структуры насельніцтва і асабліва — у сельскай мясцовасці.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Прынята Дзяржаўная праграма інавацыйнага развіцця на 2007—2010 гады

Прэзідэнт Беларусі зацвердзіў Дзяржаўную праграму інавацыйнага развіцця рэспублікі на 2007—2010 гады. Адпаведны ўказ № 136 кіраўнік дзяржавы падпісаў 26 сакавіка.

Галоўная мэта дзяржпраграмы — перавод нацыянальнай эканомікі ў рэжым інтэнсіўнага інавацыйнага развіцця ў рамках беларускай эканамічнай мадэлі. У працэсе яе рэалізацыі намечаецца стварыць 100 новых прадпрыемстваў і важнейшых вытворчасцяў і 386 новых вытворчасцяў на дзеючых прадпрыемствах, правесці мадэрнізацыю 609 важнейшых прамысловых прадпрыемстваў на аснове ўкаранення 888 перадавых тэхналогій. Асабліва важна, што больш як 80 працэнтаў усіх інавацый будуць грунтавацца на айчынных распрацоўках, падкрэслілі ў прэс-службе.

Да 2010 года плануецца павялічыць долю важнейшых інавацыйна актыўных прадпрыемстваў у агульнай колькасці прадпрыемстваў прамысловасці да 25 працэнтаў.

На рэалізацыю дзяржпраграмы плануецца зрасходаваць у 2007—2010 гадах увогуле Br6113,2 млрд.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Ад ПДВ вызваляюцца работы па будаўніцтву і рамонту жылфонду, паслугі ЖКГ

У Беларусі ад абкладання падаткам на дабаўленую вартасць вызваляюцца абароты па рэалізацыі работ па будаўніцтву і рамонту аб'ектаў жыллёвага фонду, а таксама жыллёва-камунальных і эксплуатацыйных паслуг, якія аказваюцца фізічным асобам, у тым ліку праз арганізацыі, што ажыццяўляюць эксплуатацыю жыллёвага фонду. Адпаведны ўказ № 138 «Аб некаторых пытаннях абкладання падаткам на дабаўленую вартасць» кіраўнік дзяржавы падпісаў 26 сакавіка.

Такія меры прыняты ў мэтах недапушчэння росту цэн і тарыфаў на жыллёва-камунальныя і эксплуатацыйныя паслугі, якія аказваюцца фізічным асобам, а таксама на работы па будаўніцтву і рамонту жыллёвага фонду.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

«ЗА НЕЗАЛЕЖНУЮ БЕЛАРУСЬ!»

У нядзелю, 25 сакавіка, у Мінску пачалася рэспубліканская акцыя «За незалежную Беларусь!». Адразу на дзвюх пляцоўках горада праходзілі вялікія музычныя фестывалі.

У канцэрце на пляцоўцы каля будынка Нацыянальнай бібліятэкі на праспекце Незалежнасці прымалі ўдзел Нацыянальны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі Міхаіла Фінберга, Тэатр песні Ірыны Дарафеевай і многія іншыя калектывы і выканаўцы. Паводле ацэнкі Мінгарвыканкама, на працягу дня пляцоўку перад бібліятэкай наведалі каля 10 тыс. чалавек.

Значна больш людзей наведалі другую пляцоўку акцыі, якая знаходзілася ў аэрапорце «Мінск-1». Тут на працягу дня пабывала прыкладна 40 тыс. чалавек. У канцэрце тут прымалі ўдзел папулярныя беларускія эстрадныя і рок-выканаўцы. Акрамя таго, для наведвальнікаў былі падрыхтаваныя конкурсы, віктарыны, спаборніцтвы па міні-футболу.

Мерапрыемствы акцыі «За незалежную Беларусь!» (яе ініцыятарамі сталі Міністэрства культуры і Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі) на працягу сакавіка-красавіка пройдуць ва ўсіх абласных і раённых цэнтрах рэспублікі. Заключнае мерапрыемства акцыі адбудзецца там жа, дзе яна і пачыналася, — у Мінску. З ліпеня, у Дзень незалежнасці Беларусі, на стадыёне «Дынама» адбудзецца вялікі гала-канцэрт.

Сяргей КУЗНЯЦОЎ. Фота БЕЛТА.

Нехарчовыя тавары з большым попытам?

Летась сярэднямесячныя спажывецкія расходы адной беларускай сям'і складалі 699,7 тыс. рублёў. Прычым, як паказала выбарачнае абследаванне хатніх гаспадарак (сем'яў і адзінокіх грамадзян) краіны, што было праведзена Міністэрствам статыстыкі і аналізу, у параўнанні з 2005 годам гэты паказчык павялічыўся на 126,6 тысячы. Паводле звестак міністэрства, летась доля выдаткаў сярэдняй хатняй гаспадаркі Беларусі на набыццё прадуктаў харчавання склала 42,3 працэнта, і ў параўнанні з 2005 годам знізілася на 2,3 пункта. І ў той жа час на 2,2 пункта (да 33,7 працэнта) павялічылася ўдзельная вага выдаткаў на куплю нехарчовых тавараў. І яшчэ адзін цікавы вынік. Як паказаў маніторынг міністэрства, у параўнанні з 2005 годам адбылося зніжэнне долі хатніх гаспадарак з даходамі ніжэй бюджэту пражыткоўага мінімуму — з 9,3 да 8,4 працэнта. Пры гэтым найбольшы паказчык хатніх гаспадарак з даходамі ніжэй рысы БПМ быў адзначаны на Гомельшчыне (11,4 працэнта), а найменшы (2,6 працэнта) — у сталіцы.

Сяргей ГРЫБ.

Прэзідэнт павіншаваў

...прэзідэнта Народнай Рэспублікі Бангладэш Яўдзіна Ахмеда з нацыянальным святам — Днём незалежнасці.

Кіраўнік беларускай дзяржавы выказаў надзею на пашырэнне двухбаковага супрацоўніцтва ва ўсіх галінах і ўмацаванне дружалюбных адносінаў паміж нашымі краінамі.

...кіраўніка грэчаскай дзяржавы Кароласа Папульяса з нацыянальным святам — Днём незалежнасці.

Аляксандр Лукашэнка выказаў надзею, што нашы краіны будуць і ў далейшым умацоўваць дружалюбныя адносіны і развіваць узаемавыгаднае супрацоўніцтва.

Прэс-служба Рэспублікі Беларусь.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ЗНОЎ ТРАГЕДЫЯ Ў НЕБЕ НАД САМАЛІ

23 сакавіка ў 14 гадзін пры вылеце з аэрапорта самалійскай сталіцы быў збіты самалёт ІЛ-76 беларускага РУП «Авіякампанія «Трансавіяэкспарт».

Паводле інфармацыі Мінтранса, паветраны борт выконваў палёт па маршруту Магадзіша—Дзібуці—Мінск па перавозцы грузу з экіпажам у колькасці 11 чалавек. Здарэнне адбылося за 8—10 кіламетраў ад аэрапорта. З 23 сакавіка працуе спецыяльна створаная камісія пры Міністэрстве транспарту і камунікацый па расследаванню прычын і ліквідацыі наступстваў здарэння.

Нагадаем, што самалёт ІЛ-76 гэтай жа авіякампаніі ў небе над аэрапортам быў абстраляны з зямлі падчас выканання гуманітарнага рэйса з Уганды ў Самалі. Гэта здарылася 9 сакавіка. Зарад трапіў у фюзеляж і на борце пачаўся пажар. Аднак экіпажу ўдалося пасадзіць самалёт. Тады ніхто з 15 чалавек, што знаходзіліся ў ім, не пацярпелі... Збіты 23 сакавіка самалёт якраз перавозіў дэманціраванае абсталяванне з паветранага борта, які пацярпеў аварыю 9 сакавіка.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 24 сакавіка выказаў спачуванні родным і блізкім беларускіх лётчыкаў, якія загінулі ў Самалі.

* * *

Авіякампанія «Трансавіяэкспарт» прыпыніла палёты ў Самалі да ўрэгулявання ваенных канфліктаў, паведамілі карэспандэнту **БЕЛТА** ва ўпраўленні дзяржаўнай інспекцыі па бяспецы палётаў і авіяцыйнай бяспецы дэпартамента па авіяцыі Мінтранса. Палёты будуць адноўлены толькі пасля атрымання поўных гарантый бяспекі для спецыялістаў, якія знаходзяцца ў г. Магадыша. Усе намаганні накіраваны на тое, каб падтрымаць беларусаў і ў бліжэйшы час забяспечыць ім бяспечны вылет з аэрапорта Магадыша.

У БЕЛАРУСІ НА ГЭТЫМ ТЫДНІ БУДЗЕ СУХОЕ І МАЛАВОБЛАЧНАЕ НАДВОР'Е

У бліжэйшыя трое сутак Беларусь яшчэ застанецца ва ўладзе Скандынаўскага антыцыклону, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга Фядотава. Пры павышаным фоне атмасфернага ціску захаваецца сухое, малавоблачнае надвор'е.

У начныя гадзіны тэмпература паветра складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, а 28 і 29 сакавіка месцамі чакаюцца замаразкі да мінус 5 градусаў. Днём паветра прагрэецца да 10—16 градусаў. Да канца гэтага тыдня ў рэспубліцы захаваецца павышаны фон атмасфернага ціску. Тэмпература паветра істотна не зменіцца: ўначы па-ранейшаму будзе халаднавата, а ўдзень — 11—16 градусаў вышэй за нуль.

БЕЛТА.

АВАРЫЯ НА ПАЛІЎНЫМ ПРОВАДЗЕ

23 сакавіка каля васьмі вечара на цэнтр упраўлення Віцебскай службы МНС паступіў сігнал аб паніжэнні ціску ў нафтаправодзе Унеча—Вентспілс, па якому транспартуюць дызпаліва.

Высветлілася, што недалёка ад вёскі Быцава Бешанковіцкага раёна з трубы дыяметрам больш за 370 мм вылілася каля 400 тон паліва. Было забруджана больш за 1 гектар тэрыторыі. Прыблізна ў 23.00 аварыя была лакалізавана. Ноччу 25 сакавіка падачу паліва аднавілі. На гэты момант працягваюцца работы па ачыстцы мясцовасці, у якіх задзейнічана больш за 180 чалавек і 68 адзінак тэхнікі. Высвятляюцца прычыны аварыі, падлічваюцца фінансавыя страты.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Сусветны ўзровень

У ЦЭНТРЫ ЕЎРОПЫ ПАВІННА БЫЦЬ ЗАБЯСПЕЧАНА ЕЎРАПЕЙСКАЯ ЯКАСЦЬ ПАСЛУГ

Штрыхі да партрэта філіяла СП ЗАТ «Слаўнафта-Старт» у Гродне

«ВІЗІТНАЯ КАРТКА». Перапрацоўку нафты СП ЗАТ «Слаўнафта-Старт» (генеральны дырэктар Сяргей Шаўчэнка) ажыццяўляе на Мазырскім нафтаперапрацоўчым заводзе, чыя прадукцыя традыцыйна вызначаецца высокай якасцю, нізкім утрыманнем сярністых злучэнняў у дызельным і рэактыўным паліве, адсутнасцю тэтраэтылсвінца ў аўтамабільных бензінах, высокай цеплатворнай здольнасцю мазутаў. За гады сваёй працы на беларускім рынку СП ЗАТ «Слаўнафта-Старт» заслужыла бездакорную рэпутацыю прадпрыемства, якое з павагай ставіцца да сваіх кліентаў, пастаянна пашыраючы спектр і якасць паслуг. Аб'екты СП размешчаны ва ўсіх абласцях рэспублікі, у тым ліку і на Гродзеншчыне. Гэты філіял працуе на рынку нафтапрадуктаў Прынёманскага краю з верасня 2003 года. У яго склад уваходзяць два сучасныя комплексы ў абласным цэнтры (аўтазаправачныя станцыі, аўтаматызаваныя мыйкі і шынамантаж для легкавых і грузавых аўтамабіляў, магазіны па продажу тавараў народнага спажывання, кафэ) па вуліцы Белуша, 60 (АЗК № 36) і праспекту Кляцкова, 2а (АЗК № 41), АЗК № 50 па вул. Свярдлова, 187а ў горадзе Лідзе, а таксама склад нафтапрадуктаў (станцыя Аульс, Скідальская шаша, 22).

«Звязда» прапануе ўвазе нашых чытачоў і патэнцыяльных кліентаў гэтага прадпрыемства некаторыя штрыхі да партрэта філіяла СП ЗАТ «Слаўнафта-Старт» у Гродне.

ЗА ВЫНІКІ НЕ СОРАМНА

Падчас дамовы аб сустрэчы з кіраўніцтвам філіяла карэспандэнтам «Звязды» параілі прыехаць у так званы кадравы дзень. Першая думка была такая, што на гэты дзень запланаваны нейкія кадравыя прызначэнні альбо вучоба, аднак аказалася інакш, хоць вучэбны аспект усё ж прысутнічаў. Зрэшты, аб усім па парадку.

Мерапрыемствы кадравага дня распачаліся на аўтазаправачным комплексе № 41. У памяшканні аднаго з падраздзяленняў сабраліся работнікі АЗК (за выключэннем, зразумела, тых, хто ў гэты час быў заняты абслугоўваннем кліентаў) і кіраўнікі ўсіх службаў філіяла. Тэма сустрэчы — падвядзенне вынікаў работы за мінулы год і студзень гэтага. Са справаздачай выступіў начальнік аўтазаправачнага комплексу **Валерый Кузьменка.** Яму за гэтыя вынікі было не сорамна, паколькі літаральна па ўсіх паказчыках дасягнуты значны плюс. Прычым, што прынцыпова важна, у асноўным не за кошт росту цэн, а дзякуючы павелічэнню аб'ёмаў рэалізацыі свайго тавару і паслуг. І гэта датычыцца не толькі галоўнай складовай — нафтапрадуктаў. Магазін летась зарабіў 1 мільярд 753 мільёны рублёў выручкі, што прыкладна на 700 мільёнаў больш у параўнанні з 2005 годам. Сакрэт поспеху ў тым, што прапануецца шырокі выбар тавараў не толькі, скажам так, аўтамабільнага профілю, але і іншых, у тым ліку харчовых. Амаль паўмільярднага абароту дасягнулі і ў кафэ-бары, дзе апошнім часам распрацавалі шмат новых страў. Кліенты гэта ацанілі: сюды з задавальненнем прыходзяць не толькі аўтааматары і работнікі АЗК, але і людзі з бліжэйшых прадпрыемстваў, нават пасля начной змены.

Амаль удвая на мінулы год павялічылі выручку і на мыйцы, дзе «навялі марафет» больш за 15 тысяч аўтамабіляў. Аказваецца, такі значны крок наперад (раней мыйка была стратнай, а цяпер, як і ўсе іншыя падраздзяленні АЗК, працуе рэнтабельна) можна зрабіць не за кошт дадатковага абсталявання, а калі прыцягнуць добрасумленных людзей і сапраўдных прафесіяналаў у сваёй справе — машыністаў мыйных установак. А дзе якасць абслугоўвання і не «кусаюцца» цэны — там і давер з боку кліентаў, многія з якіх ужо становяцца пастаяннымі.

Зрэшты, кіраўніцтва філіяла задачу кадравага дня бачыць не толькі ў тым, каб выслухаць справаздачы падначаленых. У работнікаў аўтазаправачнага комплексу пацікавіліся, у вырашэнні якіх пытанняў ім патрэбна дапамога, паставілі задачу яшчэ раз прааналізаваць становішча спраў і магчымыя рэзервы па кожнаму падраздзяленню. Каб не толькі не страціць сённяшнія аб'ёмы рэалізацыі нафтапрадуктаў, аказання паслуг, гандлёвай выручкі ў магазіне і кафэ, але і павялічыць іх. Таксама абмеркавалі ход выканання заўваг і прапаноў, якія былі выказаны ў калектыве АЗК № 41 падчас кадравых дзён у мінулым годзе. Аказалася, што ўсе 82 пытанні вырашаныя.

Пасля заканчэння сходу мы спыталіся ў начальніка АЗК № 41, за кошт чаго ўдалося так значна прыбавіць літаральна ў кожным структурным падраздзяленні.

— Найперш за кошт зладжанасці і ўзаемадзеяння — ад дырэктара філіяла да мяне і кожнага нашага работніка, — лічыць Валерый Кузьменка. — Дзякуючы павазе да нашых кліентаў, адказнасці за справу, якую выконваеш на сваім рабочым месцы — пачынаючы з дысцыпліны, той жа формы адзення.

У ЗВЫЧАЙНЫМ РЭЖЫМЕ

Дарэчы, ці спраўдзіліся апасенні, што сітуацыя з нафтапрадуктамі на аўтазаправачных станцыях можа пагоршыцца?

— Сапраўды, такія прагнозы гучалі, аднак яны не спраўдзіліся, паколькі ніякіх зрываў у рабоце ў нас не было, — сцвярджае Валерый Кузьменка. Пастаўкі нафтапрадуктаў ажыццяўляюцца своечасова, у неабходнай колькасці і без нейкіх абмежаванняў. Мы даражым даверам сваіх кліентаў — і вадзіцелям сваіх аўтамабіляў, і, канешне, прадпрыемствам і арганізацыям, якія займаюцца перавозкамі вялікагрузным транспартам. Дарэчы, на прадпрыемствах СП ЗАТ «Слаўнафта-Старт» уведзена гібкая сістэма цэнавых скідак, якая, мяркую, павінна зацікавіць нашых кліентаў.

У звычайным рэжыме, не скарачаючы аб'ёмы, а згодна з патрэбнасцямі сваіх кліентаў працуюць і іншыя прадпрыемствы філіяла. Роўна, спакойна. Адносіны з Мазырскім нафтаперапрацоўчым заводам склаліся нармальныя, не было сітуацый, каб адсутнічала паліва альбо здараліся іншыя збоі ў рабоце.

Вытворчую нараду праводзіць дырэктар гродзенскага філіяла «Слаўнафта-Старт» Аляксандр Сцяпанавіч КАЛОДКА.



На АЗК № 41.

У тым, што ніякіх катаклізмаў з палівам не адбываецца, карэспандэнты «Звязды» неўзабаве пераканаліся на АЗК № 36 і на складзе захоўвання нафтапрадуктаў, дзе ў той дзень таксама былі абмеркаваны самыя надзённыя вытворчыя і сацыяльныя пытанні жыцця гэтых калектываў. Пры гэтым скрупулёзна аналізавалася сітуацыя не ўвогуле, а канкрэтна па кожнаму падраздзяленню, як кажуць, усёй талакой разбіраліся, дзе слабыя месцы. У прыватнасці, было вырашана арганізаваць вучобу работнікаў па шынамантажу грузавых аўтамабіляў.

НЕ «НОЎ—ХАЎ», А СІСТЭМА РАБОТЫ Ў РАМКАХ УСЯГО СП

Карэспандэнты «Звязды» пацікавіліся ў дырэктара філіяла СП ЗАТ «Слаўнафта-Старт» у Гродне **Аляксандра Калодкі,** ці задаволены ён выніковасцю гэтых кадравых дзён.

— Хачу адзначыць, што гэта не нейкае наша «ноў-хау», а сістэма работы ў рамках усяго СП ЗАТ «Слаўнафта-Старт», — адказвае Аляксандр Сцяпанавіч. — Нас, кіраўнікоў філіялаў, запрашаюць для абмеркавання тых ці іншых пытанняў на галаўное прадпрыемства. А наша традыцыя — рэгулярна сустракацца з калектывамі сваіх падраздзяленняў: аўтазаправачных комплексаў, станцыі, склада захоўвання нафтапрадуктаў і сумесна аналізаваць вынікі работы, ставіць задачы на перспектыву. Бытуе такое меркаванне, што ўласная ініцыятыва заўсёды лягчэй выконваецца, чым ініцыятыва, якая навязана зверху. Аднак на гэтых сустрэчах мы імкнёмся не навязваць таму ці іншаму калектыву пазіцыю кіраўніцтва філіяла, а выпрацоўваць нейкае агульнае меркаванне. На парадку дня кадравых дзён — абмеркаванне вынікаў работы ўсіх структурных падраздзяленняў, прычым кіраўніцтва філіяла не толькі выказвае ім заўвагі, але і выслухоўвае крытыку і прапановы ў свой адрас. Усё гэта прыносіць станоўчы вынік. Нашы кадры, рабочыя і спецыялісты, ведаюць свае працоўныя абавязкі і валодаюць тымі пытаннямі, якія ўзнікаюць перад калектывам прадпрыемства ў цэлым.

Паводле інфармацыі інспектара па кадрах гродзенскага філіяла СП ЗАТ «Слаўнафта-Старт» **Святланы Сышчанка,** увогуле летась падчас кадравых дзён было ўзнята 269 пытанняў — і вытворчых, і асабістых. Заўвагі і прапановы ўносяцца ў пратакол сходу, і можна не сумнявацца, што ўсе яны будуць абавязкова разгледжаны тымі ці іншымі службамі. Дарэчы, практычна ўсе леташнія пытанні былі вырашаны строга ў адпаведнасці з устаноўленым тэрмінам, на кантролі застаюцца толькі некалькі найбольш складаных.

— Такія сустрэчы вельмі важныя не толькі для кіраўніцтва філіяла, але і для работнікаў нашых вытворчых падраздзяленняў, паколькі ім не трэба шукаць час для наведвання той ці іншай службы, — лічыць Святлана Мікалаеўна.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

Намеснік дырэктара склада нафтапрадуктаў № 12 Ілья КОСЦІН (першы справа) і супрацоўнікі склада Сяргей БАРДЗІЛОЎСКІ, Аляксандр ЖЫГАЛА, Ігар КУЛІК, Аляксандр ЯРАШЫНСКІ.

ISSN 1990-763X

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»!

Вось нарэшце і апошні буйны звяздоўскі прыз знайшоў сваіх гаспадароў. Гэтымі днямі мы ўручылі мікрахвалевую печ сям'і Арлоўскіх з Мінска. Арлоўскі Анатоль Паўлавіч працуе канцэртмайстрам у школе мастацтваў у Самахвалавічах, кожны дзень ездзіць на працу ў Мінскі раён. Таму наш прыз аказаўся дарэчы — цяпер яго гаспадыні Вользе Якаўлеўне, якая працуе настаўніцай рускай мовы і літаратуры, прыгатаваць снеданне будзе і хутчэй, і прасцей. Арлоўскія — людзі занятыя, адданыя сваёй справе, знайсці вольную хвіліну на працоўным тыдні аказалася немагчыма. Давялося тут ужо нам падстроіцца і ўручыць печку, як кажуць, «без адрыву ад вытворчасці»: прыз мы прывезлі ў першую мінскую гімназію імя Ф. Скарыны, дзе працуе Вольга Якаўлеўна. Ад яе мы даведаліся, што сям'я Арлоўскіх выпісвае «Звязду» ўжо некалькі гадоў, а вось картку да розыгрышу даслалі ўпершыню — і пашанцавала!

Што ж, такой удачы хочацца пажадаць усім нашым падпісчыкам, а мы з задавальненнем прывязём да вас і ў наступным квартале печ СВЧ, тэлевізар, халадзільнік. Выпісвайце! Удзельнічайце ў розыгрышы! Заставайцеся са «Звяздой»!

Таццяна ЛЯЎКОВІЧ. Фота аўтара.

ЭКАНОМІКА САЮЗА

Пасля завяршэння вечарам 23 сакавіка ў Мінску пасяджэння Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі і прэм'ер-міністр Расіі Міхаіл Фрадкоў расказалі журналістам пра абмеркаванне пытанняў парадку дня пасяджэння і адказалі на пытанні.

Як адзначыў Сяргей Сідорскі, падчас пасяджэння бакі канстатавалі, што «2006 год быў самым удалым годам для знешнегандлёвага абароту паміж Беларуссю і Расіяй. Мы маем тавараабарот амаль 20 млрд долараў». Пры гэтым ён дадаў, што па ўсіх пытаннях парадку дня «былі прыняты станоўчыя рашэнні». У прыватнасці, бакі падтрымалі прагнозныя балансы попыту і прапановы па важнейшых відах прадукцыі Саюзнай дзяржавы на 2007 год.

Міхаіл Фрадкоў у сваю чаргу заявіў, што «сустрэча прайшла ў рэжыме спрыяння. У вельмі добразычлівай абстаноўцы, якая адпавядае ўзроўню нашых адносінаў. Мы глядзім з аптымізмам на перспектыву развіцця інтэграцыйных працэсаў паміж Расіяй і Беларуссю».

Каментуючы падпісанае на пасяджэнні Пагадненне аб мерах па развіццю гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Расіяй (дакумент стаў вынікам «эканамічнага канфлікту» апошніх месяцаў), Сяргей Сідорскі адзначыў, што Пагадненне мае не рамкавы, а канкрэтны характар па тых момантах, «якія закранаюць асноўныя пытанні экспартна-імпартных аперацый паміж нашымі краінамі». Галоўнае ж у тым, што пагадненне накіраванае на дасягненне ў бліжэйшы час «рэальнага адзінага мытнага саюза Саюзнай дзяржавы».

Міхаіл Фрадкоў, гаворачы пра Пагадненне, заявіў, што «асноўная ідэя ў тым, каб стварыць умовы па больш свабоднаму доступу тавараў нашых краін на рынкі адзін аднаго. Мы гэта зрабілі».

Адказваючы на пытанне пра рэакцыю расійскага боку на зварот беларускага ўрада з просьбай аб выдзяленні стабілізацыйнага крэдыту ў памеры 1,5 млрд долараў, Міхаіл Фрадкоў адзначыў, што расійскі ўрад зараз разглядае гэтае пытанне. Расійскі бок, паводле яго слоў, удакладняе пытанні, звязаныя з магчымым выдзяленнем крэдыту, «каб прыняць няпростае рашэнне, якое звязана і з вялікімі сумамі, і з тым, што мы павінны быць упэўнены, што гэта пойдзе на карысць нашым адносінам, дапаможа вырашыць шэраг пытанняў эканамічнага характару Беларусі і, натуральна, будзе падмацавана наступнымі плацяжамі».

Гаворачы пра тое, як на сітуацыю ў эканоміцы Беларусі паўплывала павелічэнне кошту расійскага газу і змяненне ўмоў пастаўкі расійскай нафты, Сяргей Сідорскі адзначыў, што «ў адзін час складана павялічыць праплаты за газ, а таксама 70 працэнтаў (даходаў. — **Аўт.**) з агульных экспартных паставак нафты ўзяць з бізнэсу і перадаць расійскаму бюджэту». У той жа час, паводле слоў беларускага прэм'ер-міністра, урад краіны прымае меры, каб эканоміка «адчувала сабе ўпэўнена ў рынкавых умовах» паставак энерганосьбітаў.

Сяргей Сідорскі заявіў таксама, што расійскія кампаніі, якія сёння адмаўляюцца пастаўляць нафту ў Беларусь на перапрацоўку, «паводзяць сябе не ў адпаведнасці з тымі дамоўленасцямі, якія былі дасягнуты». «Мы ўзгаднілі прынцыповую схему і формулу цаны пастаўкі нафты з Расіі ў Беларусь. Аднак сёння ўзнікаюць пытанні аб тым, што даходнасць хочуць (расійскія кампаніі. — **Аўт.**) мець большую. Расійскія кампаніі атрымліваюць даход большы пры пастаўцы ў Беларусь, чым у Еўропу!» Пры гэтым прэм'ер-міністр Беларусі дадаў, што ў выпадку, калі беларускаму боку будуць імкнуцца «навязваць па кошце іншыя пытанні», то ён «будзе разглядаць магчымасць прасіць свайго калегу» разгледзіць праблему.

Каментуючы інфармацыю аб цяжкасцях з афармленнем аўтатранспарту на беларуска-расійскай мяжы, Міхаіл Фрадкоў сказаў, што бакі «імкнуцца не ствараць адзін аднаму штучных праблем». «Мы яшчэ раз уважліва паглядзім і прымем адпаведныя меры і на расійскім, і на беларускім баку. Гэтае пытанне выходзіць за рамкі мытнага афармлення, пагранічнага. Ёсць праблемы перамяшчэння тавараў праз неўладкаваныя пераходы».

Прэм'ер-міністр Расіі паведаміў таксама журналістам, што пакуль беларускі бок не звяртаўся да расійскага з прапановай прыняць удзел у будаўніцтве атамнай станцыі на тэрыторыі Беларусі. «Будзе пастаўлена пытанне — будзе падрыхтаваны адказ. Магчымасці Расіі вядомыя. Мы будуем і ў сябе, і па ўсім свеце».

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

ЦУКАР У РАСІЮ — У СВАБОДНЫМ РЭЖЫМЕ

Прадпрыемствы канцэрна «Белдзяржхарчпрам» гатовы выканаць дасягнутыя дамоўленасці па пастаўках цукру на расійскі рынак у рамках падпісанага 23 сакавіка ў Мінску міжурадавага пагаднення па гэтаму пытанню. Аб гэтым карэспандэнту **БЕЛТА** паведаміла начальнік галоўнага ўпраўлення па міжнародных сувязях канцэрна Таццяна Чычыра. Паводле яе слоў, падпісанае пагадненне аб пастаўках цукру адмяніла рэжым увозу праз адзіны склад часовага захоўвання ў Расіі, якім з'яўляецца цяпер Траякураўскі мытны пост у Маскве.

На варце спакою і бяспекі

Сёння наўрад ці хто з нас засумняваецца ў аператыўнай, а самае галоўнае, у эфектыўнай рабоце супрацоўнікаў Дэпартамента аховы МУС.

У гэтым мы ў чарговы раз упэўніліся, наведаўшы Ленінскі аддзел Дэпартамента аховы г. Гродна. У лічаныя хвіліны экіпаж у складзе міліцыянера-кінолага сяржанта Андрэя Варанцова і міліцыянера-вадзіцеля прапаршчыка Юрыя Навумовіча па сігналу з пульта кіравання прыбыў на ўмоўнае месца здарэння і быў гатовы неадкладна прыступіць да выканання любой задачы. Якніяк, а ўказаным падраздзяленнем ахоўваецца звыш 2300 аб'ектаў, прычым пад пільным «вокам» пульта цэнтралізаванага назірання знаходзіцца 1500 кватэр, прыватных дамоў і гаражоў, а з дапамогай «трывожнай кнопкі» ахоўваецца звыш 560 аб'ектаў.

Праўда, на гэты раз усё спакойна. Хоць вучэбны выклік заўсёды можа аказацца рэальным — летась супрацоўнікамі Ленінскага аддзела Дэпартамента аховы ўдалося папярэдзіць каля дзесятка спроб зламыснікаў пранікнуць на ахоўныя пункты. Таму штодзень супрацоўнікам, што служаць пад «знакам савы», трэба быць у адпаведнай фізічнай форме і ўмець імгненна прыняць рашэнне, у залежнасці ад абстаноўкі.

Яскравым прыкладам у добрасумленным нясенні службы, калі слова «мужнасць» выкарыстана не дзеля галачкі, з'яўляецца ўчынак старшага сяржанта міліцыі Кастрычніцкага аддзела Дэпартамента аховы г. Гродна Аляксея Лянцэвіча. З гэтай нагоды хацелася б працытаваць заяву грамадзянкі Гродна Т.Б. Пузырскай на адрас начальніка УУС Гродзенскага аблвыканкама Г.Я. Хацько.

«Прашу аб'явіць падзяку супрацоўніку Кастрычніцкага аддзела аховы старшаму сяржанту міліцыі Лянцэвічу Аляксею Аляксеевічу, які 9 сакавіка гэтага года выратаваў майго сына Пузырэўскага Аляксандра Георгіевіча ад смерці. Па дарозе да мяне сын упаў у раку Нёман і не мог самастойна выбрацца на бераг, атрымаўшы моцнае пераахалоджванне. Вяртаючыся з работы, супрацоўнік міліцыі А.А. Лянцэвіч кінуўся ў раку і выцягнуў сына з вады...»

Каментарыі тут не патрэбныя. І як не паверыць у прымаўку, што ў жыцці заўсёды ёсць месца подзвігу. Галоўнае, не шукаць гэтае месца, а кіраванцы чалавечымі прынцыпамі сумлення і павагі да блізкага.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

На здымках: 1. Аляксей ЛЯНЦЭВІЧ заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу. **2.** Дзяжурная пульта кіравання Ленінскага аддзела Дэпартамента аховы Ларыса КАРПУЦЬ. **3.** Баявы разлік ў складзе Андрэя ВАРАНЦОВА і Юрыя НАУМОВІЧА.

Открытое акционерное общество «Каскад-93»

Отчет о прибылях и убытках за 2006 г.

ОАО «Каскад-93» г. Минск, ул. Ф. Скорины, 14-226

Наименование показателя	Код стр.	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
I. Доходы и расходы по видам деятельности.			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	12330	10715
Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	020	2085	1858
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей) (010-020)	030	10245	8857
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	040	8757	7696
Прибыль (убыток) от реализации (030-040-050-060)	070	1488	1161
II. Операционные доходы и расходы			
Операционные доходы	080	747	2128
Операционные расходы	110	518	2101
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (100-110+/-120)	130	206	20
III. Внереализационные доходы и расходы			
Внереализационные доходы	140	70	206
Внереализационные расходы	170	98	150
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (160-170+180)	190	-31	55
Прибыль (убыток) за отчетный год (+/-070+/-130+/-190)	200	1663	1236
Налоги и сборы, производимые из прибыли	210	533	541
Прибыль (убыток) к распределению (+/-200-210-220-230)	240	1130	573

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА) СОВМЕСТНО С ГОСУДАРСТВЕННЫМ УЧРЕЖДЕНИЕМ «ГЛАВНОЕ ХОЗЯЙСТВЕННОЕ УПРАВЛЕНИЕ» УПРАВЛЕНИЯ ДЕЛАМИ ПРЕЗИДЕНТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

повторно проводят открытый аукцион по продаже находящихся в республиканской собственности объектов недвижимости, расположенных в деревне Приморье Минского района:

Лот № 1 — не завершенный строительством жилой дом (коттедж) № 1 (общая площадь — 438,9 кв.м); не завершенный строительством жилой дом (коттедж) № 2 (общая площадь — 557,7 кв.м); не завершенный строительством жилой дом (коттедж) № 3 (общая площадь — 568,2 кв.м); не завершенный строительством жилой дом (коттедж) № 4 (общая площадь — 523,2 кв.м); не завершенный строительством жилой дом (коттедж) № 5 (общая площадь — 429,3 кв.м); не завершенный строительством физкультурно-оздоровительный комплекс (общая площадь — 836 кв.м).

Начальная цена лота — 1 496 100 000 белорусских рублей.

Площадь земельного участка — 1,27 га. Задаток в размере 10% от начальной цены лота перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Договор купли-продажи между продавцом и покупателем заключается в течение 15 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта осуществляется в течение 30 календарных дней с даты подписания договора.

Аукцион состоится 4 апреля 2007 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 3 апреля 2007 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 15.03.2007 г.

Телефоны для справок: 227-48-36, 222-63-59, 222-48-60.

Сардэчна віншуем ветэрана народнай адукацыі Слуцкага раёна, былога дырэктара сярэдняй школы ў в. Сярагі ***Аляксея Андрэевіча НОВІКА*** *з 86-годдзем. Зычым здароўя, бадзёрасці, аптымізму. Родныя, блізкія, знаёмыя, вучні і настаўнікі.*

Утерянный страховой полис по обязательному страхованию гражданской ответственности транспортных средств на территории РБ филиала СООО «Белкоопстрах» в г. Гомеле серии АД 5035970 считать недействительным.

Гульня № 1

«МОМАНТ ІСЦІНЫ ПРЫЙДЗЕ Ў МАТЧЫ З БАЛГАРАМІ»

З Люксембурга Юрый Пунтус, галоўны настаўнік нацыянальнай зборнай па футболу, вярнуўся ў добрым настроі (што зразумела пасля перамогі) і адправіўся на фінальны матч беларускай хакейнай экстралігі. Дарэчы, не ў першы раз яго можна было ўбачыць на хакейных трыбунах. «Кагосьці ў зборную падбіраеце?» — пажартавала я. «Не, — усміхнуўся Юрый Іосіфавіч, — я ж сам гуляю ў хакей, мне падабаецца гэта гульня». Такую сустрэчу было б шкада не выкарыстаць у карысных мэтах і не пагутарыць з трэнерам аб выступленні нашай зборнай у адборачным матчы чэмпіянату Еўропы-2008 з Люксембургам. Нагадаю, што беларусы выйгралі ў гасцях з лікам 2:1 (галы на рахунку Цімафея Калачова і Віталя Кутузава адпаведна на 26-й і 54-й хвілінах, а нашы вароты былі «прабіты» на 68-й).

— Юрый Іосіфавіч, віншую з перамогай! Як праментуеце гульню сваіх падначаленых і саперніка?

— Люксембург мяне крыху здзівіў, бо яны дазволілі сабе гуляць не ад абароны, як з галандцамі, балгарамі, славенцамі (гэтыя матчы я праглядваў у час падрыхтоўкі), а паказалі больш адкрыты футбол, прэсінгавалі. Мяркую, што мы выйгралі заслужана, таму што на працягу ўсяго матча, за выключэннем апошніх 15 хвілін, цалкам кантралявалі сітуацыю, мелі шанц зрабіць лік нават 3:0, пры якім канцоўка не была б такой нервовай, але прапусцілі неабавязковы гол і наклікалі на сябе бяду, трымаліся ў напружанні да фінальнага свістка.

— За час вашай працы ў зборнай праз яе прайшло ўжо каля 40 ігракоў. Можаце назваць тых футбалістаў, якія будуць касцяком каманды ў далейшым?

— Думаю, што гэта тыя ігракі, якія былі на зборы ў Руйце, гулялі ў матчы з Люксембургам (у стартавым саставе на поле выйшлі Жаўноў, Юрэвіч, Карыцька, Штанюк, Кульчы, Калачоў, Страхановіч, А. Глеб, В. Глеб, Кутузаў, Карніленка. — **Аўт.**). Адсутнічаў толькі Амельянчук. І ўсё ж гэта не значыць, што іншыя футбалісты не могуць трапіць у каманду. Месца ў ёй яны могуць зарабіць сваёй гульнёй і добрай спартыўнай формай. Дзверы ў зборную не зачыненыя.

— Наступныя матчы зборная правядзе супраць балгараў (2 чэрвеня ў Мінску, 6 чэрвеня ў гасцях). Што скажаце аб саперніку?

— Мне ўдалося пабачыць балгараў у справе, у тым жа матчы з камандай Люксембурга, але гэта не паказчык. 28 сакавіка я адлятаю на гульню Балгарыя — Албанія, пасля якой у мяне будзе больш матэрыялу для абдумвання. Сустрэча з балгарамі стане для нас момантам ісціны, бо будзем змагацца за высокае трэцяе месца.

Сапернікі нашай каманды па групе «G» так і не здолелі адкрыць лік: Албанія — Славенія, Галандыя — Румынія — 0:0. Становішча каманд: Галандыя — 11 ачкоў, Балгарыя, Румынія — 8, Беларусь — 7, Славенія — 4, Албанія — 2, Люксембург — 0. Вынікі матчаў у іншых групах. Група «А»: Польшча — Азербайджан — 5:0, Казахстан — Сербія — 2:1, Партугалія — Бельгія — 4:0. Група «В»: Шатландыя — Грузія — 2:1, Фарэрскія а-вы — Украіна — 0:2, Літва — Францыя — 0:1. Група «С»: Грэцыя — Турцыя — 1:4, Малдова — Мальта — 1:1, Нарвегія — Боснія і Герцагавіна — 1:2. Група «D»: Ірландыя — Уэльс — 1:0, Кіпр — Славакія — 1:3, Чэхія — Германія — 1:2. Група «Е»: Харватыя — Македонія — 2:1, Ізраіль — Англія — 0:0, Эстонія — Расія — 0:2. Група «F»: Ліхтэнштэйн — Паўночная Ірландыя — 1:4, Іспанія — Данія — 2:1.

Ірына ПРЫМАК.

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» СОВМЕСТНО С ИМНС ПО МОСКОВСКОМУ РАЙОНУ Г. МИНСКА

повторно проводят открытый аукцион по продаже объекта незавершенного строительства – многоэтажного гаража, расположенного по адресу: г. Минск, пер. С. Ковалевской, д. 46 (восьмиэтажное каркасное здание с панельными стенами и кирпичными вставками). Начальная цена снижена и составляет – 1481706 040 рублей.

Задаток в размере 5% от начальной цены объекта перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Оплата объекта осуществляется в сроки, указанные в протоколе о результатах аукциона. Отвод земельного участка будет осуществляться в установленном порядке Минской городской землеустроительной и геодезической службой. Аукцион состоится 27 апреля 2007 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 26 апреля 2007 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6. Извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 24.01.2007.

Телефоны для справок: (017)227-48-36, 227-40-22.

Калегі па працы, усе звяздоўцы, шчыра віншуюць ***Ірыну САМУЛЕВІЧ*** *са знамянальнай падзеяй у яе жыцці — нараджэннем першынца. Сыночак з'явіўся на свет сапраўдным волатам — больш як 4 кг! Жадаем вырасці яму сапраўды вялікім Чалавекам. А маладым маме і тату — моцнага здароўя, бадзёрасці, аптымізму і — не спыняцца на дасягнутым!*

«ТРЭБА ЛЮБІЦЬ СЯБЕ І ЖЫЦЦЁ — тады хвароба толькі абточыць зубы, кусаючы вас», — вучыць мсціслаўская лекарка Ганна Сазанкова

Ганне Сазанковай — 44 гады, яна нарадзілася і жыве ў Мсціславе, выкладае музыку ў гімназіі, але найбольш вядомая як лекарка, да якой звяртаюцца па дапамогу людзі.

Ганна гаворыць, што нібыта яе сваякі на Арлоўшчыне калісьці займаліся лекарствам, а ў яе самой інтарэс да гэтай справы абудзіўся яшчэ ў дзяцінстве, калі бабуля брала малую з сабой на працу ў аптэку. Там дзяўчынка гуляла з маленькімі вагамі і зёлкамі. А цяпер Ганна стала спецыялістам у зёлках. А таксама — і ў энергетыцы чалавека.

Яна даўно заўважыла, што калі падносіць руку да хворага месца ў чалавека, то ў пальцах пачынае калоць. І Сазанкова змагла развіць свае здольнасці: прымусілі жыццёвыя абставіны.Яна лічыць, што ўсё навокал жывое — жывёл, расліны, зямля, прадметы і гэтак далей. І калі чалавек укладае ў іх свае добрыя эмоцыі, то тым жа адкажа і любая істота. І Ганна дэманструе ў якасці доказу сваю любімую хатнюю кветку: яна прасіла фуксію зацвісці да жаночага свята 8 Сакавіка, і тая, уявіце сабе, выканала просьбу сваёй гаспадыні!

У гэтым ёсць нешта дзіцячае, пагаджаецца жанчына. І гаворыць, што яе сапраўды лепей разумеюць дзеці, чым дарослыя. Ім якраз цяжэй перакрочыць праз стэрэатыпы і прыняць іншую філасофію жыцця — філасофію любові.

Людзі прыходзяць да лекарки са сваім болем і хваробамі. Першая нагода — не дапамагла афіцыйная медыцына і, здараецца, урачы самі раяць звярнуцца да народных лекараў, якія працуюць з энергетыкай чалавека і яго душой.

— На любыя хваробы можна ўздзейнічаць, вось толькі раку я баюся, хоць і адчуваю яго, — прызнаецца Сазанкова. — Аднойчы быў выпадак з сяброўкай: яна папрасіла зрабіць масаж хворай спіны. А ў мяне аж пальцы зводзіла, такі холад ішоў ад нырак. Я ёй параіла тэрмінова звярнуцца да медыкаў. Апасенні мае, на жаль, спраўдзіліся. Але ўмяшаліся своечасова, і цяпер яна жывая і здаровая.

Таксама да Сазанковай ідуць на масаж. Яна адчувае боль і шукае яго крыніцу. Потым расцірае цела алеем са святаянніку, які дзейнічае як пратэктар. Лекарка гаворыць, што з праблемамі пазваночніка абавязкова трэба разбірацца своечасова, не зацягваць.

Праўда, наўрад ці народны лекар можа стварыць цуд і ўвогуле пазбавіць ад праблем са здароўем.

— Не пазбавіць, але паставіць падпорку, — акцэнтуе Сазанкова. — Мы не пазбаўляем ад хваробаў, а даём пэўны штуршок чалавеку, тлумачым, што ён сам можа выкараскацца, а мы проста крышачку дапаможам, паспрыяем. А можа, лекар — гэта якраз будзе апошняя інстанцыя, якая прымусіць хваробу сысці? Чаму б і не? Мы ўсе людзі, і надзея нам патрэбная.

Каб захаваць здароўе, засцерагчыся ад хваробаў, раіць лекарка, трэба трымаць добры настрой. Калі ты не ўпадаеш у дэпрэсію, калі не нясеш у сабе абурэнне і злосць, а трымаешся пазітыву і аптымізму — гэта добры задзел для здароўя. Што б ні здарылася, чалавеку варта верыць, што арганізм справіцца: і ён сапраўды пачынае слухацца і працаваць як трэба. Паводле назіранняў Сазанковай, аптымісты лепей за песімістаў ідуць на папраўку.

* * *

Зёлкі — асобная і вялікая частка жыцця Сазанковай. Яна іх так любіць, што шкадуе зрываць: «Зёлкі — жывыя, і я прашу травіну: «Разумніца, добрая, чалавеку патрэбна твая дапамога...» І нават падушкі цяпер набівае не пер'ем, а духмяным сенам з мятай.

Першыя звесткі пра лекавыя зёлкі яна атрымала ад бабулі ў аптэцы, потым сама вывучала з дапамогай літаратуры і даведнікаў, калі давялося разбірацца з кучай дзіцячых хваробаў і праблем.

— Я не лічу траўніцтва нетрадыцыйнай медыцынай, — цвёрда гаворыць Ганна. — Як раз мы — самыя традыцыйныя. Таму што спачатку таблеткі былі прэсаванымі каранямі і зёлкамі, і толькі потым з'явілася хімія. Памятайце, што расліны нас лечаць. А хімія — гэта двубой: адно лечыць, іншае псуе.

Сама Ганна толькі нядаўна хварэла на грып, але прынцыпова не стала піць таблеткі, а ратавалася чаем з зёлак і лімонам. Для гарбаты, якая будзе карыснай для любога чалавека, траўніца раіць наступныя зёлкі: ліпу, лісток чорных парэчак, галінкі маліны.

— А чабор — гэта ўвогуле цуд! — кажа лекарка. — Лічыцца, што ён засцерагае ад любой злой энергіі. Гэта лекавая зёлка і сагрэе, і супакоіць, і супраць запалення спрацуе, а таксама падоўжыць неверагодны пах.

Чарада і плады чырвонай рабіны чысцяць кроў. Ліпа, акрамя ўсяго іншага, мае заспакаяльны эфект. Кветкі суніц вельмі карысныя для сэрца. Ісоп ачышчае бронхі. Парасткі сасны таксама ачысцяць бронхі і, акрамя гэтага, сасна, паводле сістэмы друідаў, дае чалавеку энергію.

Шышкі чырвонай канюшыны асабліва карысныя для састарэлых людзей: яны дапамагаюць супраць атэрасклерозу і шуму ў вушах. Каляндула карысная супраць запаленняў і для тых, хто хворы на анкалогію. Цяпер, вясной, не трэба забывацца на шыпшыну.

— Хачу таксама параіць, як рабіць вітамінную салату з зёлак, што з'яўляюцца вясной, — расказвае Ганна. — Звычайна людзі робяць салату з зялёнай цыбулі, яек і смятаны. Аднак прапаную і маладыя травы ў дадатак: снытку — як прыродны полівітамін, лісток чорных парэчак — як крыніцу вітаміну С, дзьмухавец — для сасудаў і страўніка, трыпутнік выдатна ачысціць сценкі сасудаў. Смак у гэтай салаты будзе звычайны — яек і цыбулі, а карысць — вялікая.

Тым, хто вымушаны ўжываць шмат лекаў, Сазанкова раіць набыць у аптэцы парашок з пладоў растаропшы. Паводле слоў лекаркі, гэта расліна забірае з арганізма ўсе таксіны і шлакі.

— Цяпер шмат людзей мае праблемы з высокім ціскам, — працягвае Ганна. — Магу даць ім параду. Ведаеце насенне кропу, якое даюць немаўлятам ад уздуцця жывата? Вось яго адвар карысны для сардэчнікаў і гіпертонікаў: адна чайная лыжка на кубак кіпеню. Дапамагае зніжаць ціск, мае магчонны эфект, чысціць сасуды.

Ганна збірае зёлкі ў Мсціславе на Манастырскай горцы, дзе ў старажытнасці быў кляштар. Праўда, за савецкім часам тут пабудавалі масласырзавод, але цудоўная энергія спакою гэтага месца і адчуванне знікнення часу, сцвярджае лекарка, нікуды не прапалі. Там, сярод 50 соснаў, пасаджаных выхаванцамі інтэрната да юбілею БССР, можна сысці на час ад цывілізацыі і проста назіраць навакольны свет. А таксама збіраць духмяныя зёлкі.

* * *

— Што робіць з дзіцячай больнай маці? — даступна тлумачыць сваю методу лекарства Ганна Сазанкова. — Гладзіць, цалуе, дзьме — гэта значыць, аддае энергію, добры пасыл. Тое ж самае і я раблю — як помпа, выцягваю і выкідаю «бруд», а з расторы прыцягваю чыстую энергію. І з дапамогай праваслаўнай веры — я хварэю за чалавека, суперажываю і прашу святых аб заступніцтве.

У працэсе лячэння Ганна чытае малітву да Маці Божай Сямістрэльнай для змякчэння злых сэрцаў.

— Брыдота ідзе на агонь свячы, а хворае месца трэба зараўняць, — працягвае лекарка. — На чалавеку нібыта апрануты энергетычны скафандр, і на месцы дзіркі трэба абавязкова паставіць латку. Потым — малітва ўдзячнасці і вада. Але калі хвароба адпускае, я раю перагледзець жыццё і паводзіны. Мала рабіць добро, трэба яшчэ і не рабіць свядома зла. І трэба радавацца жыццю і лічыць кожны новы дзень за падарунак.

Мсціслаўская лекарка карыстаецца таксама старымі замовамі. Ім яе навучылі бабулі, якія шукалі ў замовах паратунак ад хваробаў і часта яго знаходзілі.

— Мне падабаецца сувязь слоў замоваў, — прызнаецца Ганна. — Там сапраўды ёсць нейкі лекарскі рытм, вібрацыя. Як і ў малітвах, якія нібыта чалавека заварочваюць у абаронны кокан. Паслухайце, як загаворваюць рожу: «Рожа, рожа, ты здесь непригожа. Пойди на сухой лес, на гнилое болото. Там тебе жить, со мхов воду пить...» Ты нібыта ўгаворваеш хваробу, як жывую істоту, сысці і знайсці іншае месца. Гэтую замову стваралі непісьменныя бабулі ў даўнія часы, навучанню. Яна вывучае нетрадыцыйную медыцыну, масаж, камяні, зёлкі і іншыя карысныя для лекарства і проста жыцця дысцыпліны.

А таксама, гаворыць лекарка, ёй дапамагаюць кнігі Карнэгі. У першую чаргу, у зносінах з людзьмі: «У Карнэгі ўсё ледзь не паводле Божых запаветаў: не асуджай чалавека, а палюбі яго і ўхвалі».

* * *

Шмат людзей, у якіх пачынаюцца рушыцца сем'і ці нешта не ладзіцца ў жыцці, ідуць да лекаркі здымаць псоту. Тут сваю ролю адыгрываюць і рэўнасць, і зайздрасць, і непрымірэнне. І на гэта ёсць замова: «Хто думаў і рабіў — вярні ім зваротна...»

Прыходзяць да Ганны і па цудоўнае каханне.

— Сямейныя праблемы — рэч складаная, — гаворыць лекарка. — А сама я ў сямейныя адносіны імкнуся не ўмешвацца: хто ведае, дзе лепей жыць і каго кахаць.

Ганне не падабаецца погляд на мужа ці жонку як на ўласнасць, якую прывязаў навечна штамп. Аднак чалавек шукае сабе шчасця паводле душы, а не штампа. І яна ніколі не дапамагае тым, хто хоча помсты. Таму што сапраўднае каханне ўмее дараваць.

— Сёння прадаюцца кнігі, якія вучаць, як з дапамогай магіі можна нашкодзіць чалавеку, — асуджальна кажа Ганна. — Я супраць такой адкрытасці: таму што каб добрае зрабіць, трэба душу ўкласці, а каб злое — шмат розуму не трэба. Я хачу параіць людзям: нават калі вам зрабілі нешта злое, пастаўце свечку ў царкве на здароўе. Аддайце сваю праблему на Божы суд — там разбяруцца.

* * *

Ганна не мае сумненняў, што думка чалавека матэрыяльная. Ад думкі ідзе рэакцыя: толькі не адразу яна адчуваецца, таму што свет, лічыць яна, вельмі забруджаны людскімі эмоцыямі — у асноўным дрэннымі, і прабіцца думкам цяжка. Сазанкова ўпэўненая, тым не менш, што добрае адразу знаходзіць шлях у хаосе. З гэтай прычыны лекарка вучыцца сама і вучыць іншых стрымлівацца.

— Нават тым, хто вам непрыемны, трэба ўсё ж такі жадаць дабра, — гаворыць Ганна. — Бо так можна абязздроіць зло. Калі плюс накладаецца на мінус, атрымліваецца нуль. А калі на мінус даслаць свой мінус, то атрымліваецца камок зла, які можа на каго заўгодна абрушыцца.

Злосць і грубасць чалавека часта можна перамагчы добрым словам і ўсмешкай, настойвае лекарка. Але калі не атрымліваецца, то як абараніцца ад злых людзей? Ганна раіць простыя спосабы: шпількай, бо метал мае ўласцівасць адбіваць. Яе трэба патрымаць у руцэ, задаць нешта накшталт праграмы — «Дапамажы абараніцца ад зла», а потым зашпіліць галоўкай уніз на адзенне. Таксама дапамагае і люстэрка, якое трэба насіць слоем, які адлюстроўвае святло, звонку. Калі ведзяце гутарку — трэба скрыжаваць ногі альбо рукі. Гэта будзе прыкрыццём, праз якое чужая энергетыка не праб'ецца. Калі на душы стала дрэнна, трэба пайсці ў душ, каб праточная вада змыла цяжкую энергетыку. А яшчэ лепей — проста не заўважаць злых людзей, гэта і будзе абаронай.

* * *

— Калі дрэнна, трэба прыхінуцца да дрэў, — раіць лекарка. — Корпанне ў зямлі на градках, нягледзячы ні на што, таксама супакойвае і дае адпачынак розуму. Яшчэ кнігі і музыка — мой сродак «адляцець» на іншую планету, дзе ўсё ружовае і цвітуць сады...

— Мае агульныя парады простыя, — падводзіць вынік Ганна Сазанкова. — Першае: любіць сябе, і астатнім будзе карысць — ад шчаслівага чалавека ідзе дабро. Другое: вышэй нос, што б ні здарылася! Трэцяе: беражыце блізкіх людзей і спяшайцеся рабіць ім дабро, інакш можа быць позна. Чацвёртае: умейце дараваць, не адказвайце злом на зло. І самае апошняе: не будзьце абыякавымі, радуйцеся звычайным рэчам і цаніце тое, што ў вас ёсць. Гэты вялізны свет дастаўся нам у падарунак, атрымайце ад яго асалоду!

Ілона ІВАНОВА,
Мсціслаўскі раён.

Філасофія любові

3-ЗА ПАДПАЛУ ТРАВЫ ЗАГІНУЎ ЧАЛАВЕК

У мінулыя выхадныя 45-гадовы жыхар вёскі Мікулічы Брагінскага раёна загінуў пры выпальванні сухой травы і смецця.

Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях, мужчына быў знойдзены супрацоўнікамі раённага аддзела па НЗ, якія прыбылі ў вёску па выкліку на тушэнне ўчастка.

Паводле інфармацыі прэс-службы, у мінулыя выхадныя ў рэгіёне значна абвастрылася пажаранебяспечная сітуацыя ў сувязі з масавым выпальваннем сухой

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

27 сакавіка 2007 г. № 13 (67)

УЛАДА Ў АСОБАХ

СЯРГЕЙ АШМЯНЦАЎ, СТАРШЫНЯ БРЭСЦКАГА АБЛАСНОГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ:

«СТАРШЫНЯ РАЙВЫКАНКАМА ЎЖО НЕ СКАЖА, ШТО СЕЛЬСКАЯ ЎЛАДА — НЕ ЯГО КЛОПАТ»

На першай сесіі новы склад абласнога Савета абраў сваім старшынёй Сяргея Ашмянцава. Сяргей Дзмітрыевіч працаваў на партыйнай рабоце, узначальваў калгас, затым — Кобрынскі райвыканкам. Некалькі апошніх гадоў быў намеснікам старшыні аблвыканкама па сельскай гаспадарцы. На пачатку нашай размовы новы кіраўнік прадстаўнічай улады рэгіёна сказаў, што ўсё яго працоўнае жыццё было звязана з вёскай. Праблемы вясковага жыхара яму добра знаёмыя. І на новай пасадзе ён мае намер асаблівую ўвагу надаваць рабоце сельскіх Саветаў як пярвічнага звяна мясцовай улады.

— З чаго пачынае сваю работу новы старшыня абласнога Савета дэпутатаў?

— Рыхтуем вялікую нараду з удзелам старшынь усіх 222 сельсаветаў вобласці, кіраўнікоў раённых Саветаў і выканкамаў. Строга кажучы, будзем абмяркоўваць Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб павышэнні ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва». А калі сказаць прасцей, будзем раіцца, як лепей пабудаваць тую аптымальную мадэль дзейнасці мясцовай улады, якая дазволіць падтрымліваць неабходную якасць жыцця вёскі ў цэлым і ахапіць увагай кожнага вясковага жыхара. Сёння сельсаветы знаходзяцца на пярэднім плане масавай арганізатарскай работы з людзьмі і адначасова замыкаюць вертыкаль. Цяпер ужо і старшыня райвыканкама не скажа, што сельская ўлада — не яго клопат. Кіраўнік раёна заключае кантракт са старшынёй сельскага выканкама і тым самым бярэ на сябе адказнасць за дзейнасць гэтага пярвічнага звяна ўлады.

Мы ведаем, як няпроста працаваць работнікам сельскіх Саветаў. У іх зараз невялікія штаты, пастаянны дэфіцыт сродкаў адчуваецца ў мясцовых бюджэтах. Таму паслухаем іх прапановы, разважанні, пастараемся разам выпрацаваць нейкія шляхі, накірункі агульнай дзейнасці.

— За гэты час вы ўжо наведалі якія-небудзь сельсаветы, пазнаёміліся з іх работай, зрабілі нейкія вывады?

— Менавіта падчас падрыхтоўкі да названай нарады я пабываў у Чарнаўчыцкім, Тамашоўскім сельсаветах Брэсцкага, Белавежскім Камянецкага раёнаў. Адрасы былі выбраны невыпадкова. Я хацеў паглядзець лепшыя прыклады работы з насельніцтвам, арганізацыі добраўпарадкавання населеных пунктаў з тым, каб на нарадзе давесці іх вопыт да астатніх. Хоць добрыя прыклады, цікавы вопыт, я ўпэўнены, можна знайсці ў кожным раёне вобласці. І мы абавязкова абмяркуем здабыткі некаторых калег, а яшчэ больш будзем гаварыць пра недахопы.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ЗА ІМ ЯК ЗА СЦЯНОЮ.

Мікалай Булатоўскі ўжо пяць гадоў на грамадскай «пасадзе» лідара вёскі. Ён — староста. Вядома, што ў вясковым асяродкуспрадвеку ў пашане былі такія рысы, як працавітасць і гаспадарлівасць. Па іх і дагэтуль ацэньваюць суседа, аднавяскоўца, прыезджага. Дарэчы, у вёсцы Хвойнік Пружанскага раёна Мікалай Булатоўскі і яго сям'я — прыезджыя (больш за 10 гадоў таму пераселіліся сюды з забруджанага радыяцыяй Лунінецкага раёна). Працуючы ў мясцовым лясніцтве лесніком, а затым паляўніцтвазнаўцам, любую даручаную яму справу Мікалай выконвае сумленна. Вёска Хвойнік — невялікая, і кожны яе жыхар навідавоку ў іншых, як пад «рэнтгенам». І хоць у гэтым далёкім ад райцэнтра пасяленні няма, як кажуць, недастойных, Мікалай Булатоўскі — надзейны абраннік ад імя сваіх вяскоўцаў.

На здымку: Мікалай Булатоўскі (справа) і ляснік Сяргей Шчэрба адпраўляюцца на агледзіны тэрыторыі лясніцтва. Лайка па мянушцы Зурна проста ў захапленні ад такіх падарожжаў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НА ПРЫЁМЕ

З ЧЫМ ІДУЦЬ ДА ДЭПУТАТА?

Разам з дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, намеснікам старшыні камісіі па аграрных пытаннях Віктарам АНІКЕЕНКАМ карэспандэнт «Местного самоуправления», правёў прыём наведвальнікаў з Вілейскага раёна.

Чачэнскі след

Жыццёвая праўда была на баку наведвальніка — маёра запасу Юрыя Мамчыца. У 1990 годзе ён закончыў ваеннае вучылішча і быў накіраваны служыць у Чачню, горад Маздок. Там стаў сведкам чачэна-інгушскага канфлікту, а затым і ўдзельнікам першай і другой ваенных чачэнскіх кампаній. І ўвесь гэты час сям'я Мамчыца знаходзілася ў Чачні.

У 2000 годзе ён звольніўся ў запас па стану здароўя, пераехаў у Смаленск, там атрымліваў пенсію. У 2006 годзе вярнуўся на радзіму ў Вілейскі раён. Як баявы ў нядаўнім мінулым афіцэр, звярнуўся ў райваенкамат, паказаў дакументы аб удзеле ў ваенных аперацыях. Разлічваў на пэўныя льготы як удзельнік лакальнага ваеннага канфлікту. Яму ветліва растлумачылі, што ў беларускім пераліку тых, хто некалі ваяваў за межамі рэспублікі (напрыклад, у Афганістане), Чачня не значыцца. А значыць і льготы на яго не распаўсюджваюцца.

Гэта і здзівіла і абурыла Юрыя. У Расіі тыя, хто прайшоў мясарубку Чачні і выжыў, карыстаюцца льготамі: бясплатны праезд па чыгунцы раз у год, бясплатная пуцёўка ў санаторый, 50-працэнтная аплата камунальных паслуг, магчымасць дзецям без конкурсу паступаць у ВНУ сілавых структур і шэраг іншых. А на радзіме — нічога. Хоць, на яго думку, Чачня была пеклам, падобным на Афган, а часам можа яшчэ і горшым.

Звычайна Віктар Пятровіч даволі хутка адказвае наведвальнікам на іх пытанні і запыты — за два з паловай гады дэпутацтва ўжо набыў пэўны вопыт і цяпер можа з вялікай доляй дакладнасці сказаць чалавеку, ці ў яго сілах яму дапамагчы. Можа адразу параіць, куды варта звярнуцца, якія мець пры сабе дакументы і якія падрыхтаваць паперы, каб потым не марнаваць час. Бо людзі часцей за ўсё прыходзяць з тыповымі жыццёвымі праблемамі, якія па нейкіх аб'ектыўных і суб'ектыўных прычынах чамусьці не вырашаюцца ў іншых інстанцыях. Падчас прыёму Віктар Анікеенка ці яго памочнік Мікалай Жукаў некуды тэлефанавалі, нешта нагадвалі камусьці аб яго абавязках, і здаралася, што дробнае пытанне вырашалася ці амаль вырашалася.

А вось на гэта чачэнскае пытанне не знаходзіўся хуткі адказ. Праўда, адну праблему 39-гадовага ветэрана баявых дзеянняў у Расіі Віктар Пятровіч, здаецца, часткова вырашыў: патэлефанаваў камандзіру ваеннай часці, размешчанай на тэрыторыі раёна, і папрасіў узяць Юрыя на работу. Камандзір паабяцаў.

Наконт жа таго, каб зраўняць правы «афганцаў» і тых, хто змагаўся ў Чачні з агрэсіяй міжнароднага тэрарызму, трэба падумаць, параіцца ў парламенце, іншых дзяржаўных структурах краіны. Магчыма, прыйдзецца ініцыяваць пагадненне з Масквой, каб Расія матэрыяльна падтрымлівала ветэранаў-беларусаў, якія ваявалі ў Чачні.

Дрэва спілаваць — не поле перайсці

А вось праблема, з якой прыйшлі жыхары Вілейкі, чыста мясцовая. Двухкватэрны дом, дзе яны пражываюць, паступова прыйшоў у заняпад, а рамантаваць яго ніхто не спяшаецца. Тым часам дом дае асадку, па сценах пайшлі трэшчыны. Анікеенка тут жа прыняў пэўныя захады.

Адначасова ўсплыло яшчэ адно — на першы погляд, дробнае, але ўжо набыўшае рэгіянальную актуальнасць пытанне. Жыхары старога дома паскардзіліся, што пабудове пагражаюць вялізныя дрэвы, якія ў любы момант ад моцнага ветру могуць паваліцца на страху і паламаць яе.

Віктар Пятровіч гаворыць, што праблема старых аварыйных дрэў непакоіць ужо сотні жыхароў Вілейскага і Мядзельскага раёнаў. Сёння такая паслуга каштуе 500—600 тысяч рублёў. Пры гэтых расцэнках нават сям'я з сярэднім даходам на душу насельніцтва моцна падумае, заказваць ці не спецыяльную брыгаду.

Усяго ў раёне, па даных сельсаветаў, 2284 аварыйныя дрэвы. Іх могуць спілаваць работнікі жыллакамунгаса, дарожнай арганізацыі і службы электрыкаў. Цікава, што кожная з іх бярэ сваю немалую цану.

У райсавеце вырашылі разам з сельскімі Саветамі да пачатку красавіка сфарміраваць сваю брыгаду, якая б згодна з патрабаваннямі тэхнікі бяспекі занялася ліквідацыяй гэтых дрэў. Расцэнкі ў брыгады будуць на парадак ніжэй. «Лічу, што гэта правільны падыход», — гаворыць Анікеенка.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ТЕМА ДНЯ

НЕ УПУСТИТЕ ВРЕМЯ

«Власть не дают, власть берут» — именно этой фразой, ставшей уже классической, завершилось выступление председателя Постоянной комиссии Совета Республики Национального собрания по региональной политике и местному самоуправлению Анатолия МАЛОФЕЕВА перед председателями сельских и поселковых Советов депутатов. В ходе встречи, которая — уже традиционно — проводилась на базе Института высших управленческих кадров Академии управления при Президенте Республики Беларусь, обсуждались задачи, стоящие перед местными Советами депутатов в связи с реализацией Указа Президента № 21 «О повышении роли органов местного управления и самоуправления в решении вопросов жизнеобеспечения населения».

Подписание Указа стало реальным шагом к решению проблем первичного уровня власти. Можно сказать, что сегодня отсчет времени у председателей местных Советов депутатов начинается с чистого листа. Что будет написано на этом «листе», во многом зависит от инициативы каждого из них.

В Указе, подчеркнул Анатолий Малофеев, четко очерчены многие позиции, касающиеся деятельности сельских и поселковых Советов. Но реализовать их сегодня непросто. Зачастую — из-за неповоротливости на местах, нежелания что-либо менять в привычной, устоявшейся системе. «Журналисты уже спрашивают меня, как реализуется Указ, каковы первые результаты. Если бы все было так просто...».

Не секрет, что многие представители первичного уровня власти ожидали большего от вышеназванного документа. По крайней мере, в той его части, которая касается формирования бюджета первичного звена. Но «золотой дождь» не пролился — Указ предложил не источники обогащения, а, скорее, пути и возможности зарабатывания денег. Используют ли сельские Советы эти возможности, покажет время. Пока же, как констатировал Анатолий Малофеев, больших подвижек и активности в этом направлении не наблюдается. Он призвал и присутствующих, и — в их лице — всех председателей первичного уровня власти еще раз внимательно пересмотреть запланированные мероприятия по социально-экономическому развитию своих территории и в соответствии с Указом внести до 1 июня текущего года в Советы депутатов районного уровня предложения о размерах отчислений от местных налогов и сборов, суммах дотаций.

«Не дадите этих предложений — к концу года придете ни с чем», — заявил Анатолий Малофеев.

Возникает ряд вопросов и по реализации положения 8.2 Указа, касающегося проведения инвентаризации дорог, а также систем водоснабжения и водоотведения населенных пунктов и передачи этих систем специализированным организациям, ЖКХ.

«Начинайте уже инициировать это движение. В районе вам могут сказать, что сегодня у ЖКХ нет мощностей, нет возможностей. Но это не ваши проблемы. Пусть шевелятся! Надо к этому их приучить. То же самое касается и передачи дорог. Создадим систему — все получится. И здесь председатели районных Советов, райисполкомы не должны быть в стороне», — считает Анатолий Малофеев.

Как известно, в ближайшее время, также в соответствии с положением Указа № 21, будет сформирован Совет по взаимодействию органов местного самоуправления. Создается он на общественных началах, и задача его — «не приказывать, а консультировать». Совет, выступая как бы «связным» между органами местного самоуправления и высшими государственными органами власти, должен будет аккумулировать все проблемы и вопросы с мест, определять, что из наболевшего можно решить сейчас, а что — отложить на перспективу.

«Возможности и полномочия вам даны. Так что нужно научиться работать, как власть, используя в том числе и Положение о председателе сельского, поселкового и городского исполнительного комитета, и сам Указ № 21, и другие законодательные документы, касающиеся института местной власти. Они должны не просто лежать у вас на столе, а быть отправной точкой в работе. Теперь многое зависит от вас, не упустите время», — подвел черту под выступлением Анатолий Малофеев.

Дальнейшая дискуссия с председателями первичного звена власти показала, что внедрение Указа Президента № 21 на местах пока еще пробуксовывает по ряду причин. Поэтому в ближайшее время будут приняты определенные шаги по обеспечению его скорейшей реализации. Предполагается, в частности, определить в каждом районе базовый сельсовет, который станет «площадкой» по отработке положений Указа, а также провести совещания с районными властями, службами и специалистами по вопросам внедрения Указа.

Сергей ЛЕШИК, председатель Леснянского сельского Совета депутатов Барановичского района:

— Хорошо, что повернулись к нам, к сельским Советам. Но проблем пока хватает. Например, нашему автомобилю «Нива» уже 15 лет, ездим на нем правдами и неправдами. 50 процентов коллег по нашему району имеют старые, практически добитые машины. Зато оргтехнику выдали полностью, не знаю только, когда за нее рассчитаемся.

Пока еще нас, сельские Советы, нагружают несвойственными нам обязанностями. Взять хотя бы уличное освещение. Чтобы снять электропоказания счетчика, лезешь (без права допуска) туда сам. А кто еще полезет, если нет специалиста? Наш сельский Совет и закупом молока занимается, и водопровод на нем, и уборка мусора. За несанкционированные свалки нас постоянно наказывают, а ведь у сельсовета порой нет средств, чтобы топливо приобрести да вывезти мусор.

Не повезло и в том плане, что на нашей территории нет базового хозяйства. Значит, надо как можно быстрее провести инвентаризацию и передать вышеуказанные объекты специализированным организациям. Хотя с дорогами тоже вопрос. На баланс ДРСУ передаются дороги с твердым и гравийным покрытием. А у нас по всему сельсовету их раз-два и обчелся. Остальные — проселочные. То есть, они снова останутся на наших плечах? Как их подсыпать и грейдировать, если на благоустройство сельсовета в этом году выделено всего 800 тысяч рублей?

Инна ПОПОВА, председатель Мирского поселкового Совета депутатов Кореличского района:

— Очень ждала этот Указ. Спасибо, что сохранили историю, что Советы остались Советами, а не муниципалитетами, как некоторые предлагали. К нам ведь идут люди. Зачем же перестраивать их мышление?

Но есть большие трудности с формированием бюджета поссовета. Как известно, Мир — поселок особенный, денег на поддержание порядка нужно много... Мы сдаем в аренду здание при бане (получаем 300 евро в месяц). Продали с аукциона здание, находившееся на нашем балансе, за 20 млн рублей. Но эти деньги у нас забрали на строительство агрогородка. Хорошо, понимаю... В нашем сельсовете люди активно оформляют землю в частную собственность. Например, в позапрошлом году мы получили благодаря этому 5 миллионов рублей, в прошлом — 3 миллиона. Но если в позапрошлом году я успела израсходовать эти деньги на нужды своей территории, то в прошлом году заработанные 3 миллиона финотдел у нас забрал.

Нужно, чтобы было четко понятно, сколько денег, какие налоги остаются в сельском Совете, чтобы мы, зная это, старались работать лучше, чтобы был стимул.

И еще очень хотелось бы в рамках учебы председателей сельских Советов, которая проводится в Институте высших управленческих кадров, встретиться с финансистом, который помог бы разобраться с документами. Потому что в нашем районном финотделе мы никому не нужны. Там говорят: «А вы, сельсоветы, не наши!». Тогда чьи? Не ездить же по каждому вопросу в столицу!

Любовь ОБОЛЕВИЧ, председатель Опсовского сельского Совета депутатов Браславского района:

— На сегодняшний день по формированию бюджета должны быть разработаны на уровне министерств четкие нормативы. Все знают, как активно вводится уличное освещение. Но единого подхода к его финансированию нет. Одному сельсовету районные финансисты дают столько-то, другому — столько-то, третьему — еще столько-то, на свое усмотрение... А надо по-другому. Есть, например, тысяча населения, положена на эту тысячу определенная сумма — ее и дайте. У нас же все зависит от желания местных финансистов.

И еще проблема. Браславский район территориально граничит с Литвой и Латвией. Многие иностранные граждане имеют на территории нашего Совета дома, доставшиеся им по наследству, и участки, которые оформляются сегодня на условиях договора аренды. Но ставка арендной платы для иностранцев настолько мизерна!.. Она не поддается никакому сравнению с суммами, которые платят наши граждане. А ведь это прямые деньги сельского Совета, которые уходят мимо. Иностранные граждане пользуется нашей землей, некоторые даже проживают, а отдачи — никакой.

Михаил ШУЛЬГИН, председатель Гервятского сельского Совета депутатов Островецкого района:

— Очень хорошо, что у нас появится Совет по взаимодействию с органами местного самоуправления — будет куда обратиться в случае возникновения проблемы, которую нельзя разрешить своими силами. А вообще считаю, что все вопросы нужно решать «полюбовно» со своими местными хозяйствами. У нас границы сельсовета совпадают с границами СПК, достаточно крепкого. Поэтому по жилищно-коммунальному хозяйству проблем практически никаких. Работаем сообща: мы, например, определяем день для вывоза мусора, а руководитель СПК выделяет транспорт.

Есть Советы, которые пользуются услугами ЖКХ района. В конце месяца им выставили счет на 400 тыс. рублей. Кто его будет платить? А долг с каждым месяцем нарастает...

Наталия КАРПЕНКО.

ПОСЛЕ ВЫСТУПЛЕНИЯ «МС»

ВСЕ БУДЕТ ХОРОШО?

В № 8 «Местного самоуправления» за 21 февраля под руб-рикой «Форс-мажор» была опубликована критическая статья Наталии Карпенко под названием «Разрешите вам не поверить...». Напомним, что речь в ней шла о небольшой деревеньке Синило, что в Минском районе. Там расположены иловые отстойники КУП «Минскводоканал», куда после специальной обработки вывозятся все канализационные нечистоты столицы. Жители деревни, которые уже не первый год задыхаются от зловонных выделений, бьют тревогу — пишут письма во все инстанции, обращаются к депутатам, вызывают специалистов санитарной службы. И все это с одной целью: добиться либо отселения из опасной зоны, либо улучшения условий проживания.

Редакция получила реагирования на данную публикацию.

«Сообщаем, что статья «Разрешите вам не поверить» рассмотрена специалистами УП «Минскводоканал».

Очистные сооружения г. Минска, принимающие сточные воды от населения, городских предприятий и организаций, обеспечивают очистку хозяйственно-бытовых и промышленных стоков столицы. В процессе очистки сточных вод образуются осадки, обработка которых является одним из наиболее сложных вопросов в работе очистных комплексов и включает несколько этапов. На первом этапе для уменьшения объемов образующихся осадков на Минских очистных сооружениях с 1998 года применяется высокоэффективная современная технология — механическое обезвоживание осадков на центрипрессах с последующим захоронением на иловых прудах-накопителях. При этом объемы захораниваемых осадков уменьшены в 6—8 раз.

Решениями Миноблисполкома от 22.11.1982 г. № 73/20, от 25.11.1991 г. № 12/14-14, от 02.02.1997 г. № 41/37, распоряжением Совета Министров БССР от 16.09.1988 г. № 602р было разрешено ПО «Минскводоканал» проведение проектно-изыскательских работ на выработанных площадях песчано-гравийного карьера «Волма» под строительство иловых прудов, предназначенных для складирования обезвоженного осадка после очистки сточных вод г. Минска. Строительство иловых прудов осуществлялось с учетом всех природоохранных мероприятий по недопущению загрязнения прилегающей к прудам территории, согласованных в установленном порядке в 80—90-х годах прошлого столетия с Госстроем БССР, Госагропромом БССР, Минздравом БССР, Госкомприроды БССР и Миноблисполкомом.

Учитывая возросшие природоохранные требования, при строительстве иловых прудов проектно-сметной документацией была предусмотрена гидроизоляция стен и днища, исключающая фильтрацию в нижележащие слои грунта. Конструкция изоляции принималась по рекомендациям ВНИИГ им. В.Е. Веденеева, ВНИИВОДГЕО и ВНИИ «Водполимер» и была согласована с органами санэпиднадзора, Белорусской геолого-гидрологической экспедиции, Госкомитетом БССР по охране природы.

Следует отметить, что иловые пруды-накопители, которые построены вблизи д. Синело, являются единственными в РБ объектами данного профиля, где применена высокоэффективная гидроизоляция и исключена реальная угроза загрязнения подземных вод.

В связи со строительством иловых прудов для обеспечения жителей д. Синело качественной питьевой водой ПО «Минскводоканал» в 1990 году построил водопроводную сеть протяженностью 1,5 км с установкой 10 водоразборных колонок, а также выполнил работы по ремонту и восстановлению дорожного покрытия в этой деревне. Указанные объекты безвозмездно переданы на баланс опытному хозяйству МИС, которое должно поддерживать их в технически исправном состоянии.

На основании обращения граждан Миноблисполком принял также решение о переселении жителей д. Колодежки.

Согласно действующим нормативам, для иловых прудов определена санитарно-защитная зона, составляющая 500 метров, вблизи которой не должно производиться жилищное строительство. Однако в нарушение этих норм по решению Лугово-Слободского сельского Совета и согласованию соответствующих служб Минского райисполкома имели место случаи строительства индивидуальных жилых домов в непосредственной близости к границе санитарно-защитной зоны. В связи с этим ПО «Минскводоканал» предложил прекратить строительство жилых домов и информировал в установленном порядке Минский областной комитет по экологии (письмо № 141-02/233 от 27.10.1993 г.).

Одновременно сообщаем, что в целях нормализации экологической обстановки в районе расположения прудов-накопителей, значительного сокращения газовыделения, объемов захораниваемых осадков и земельных площадей на заключительном этапе обезвоживания осадков сточных вод УП «Минскводоканал» обратился в Министерство природных ресурсов и охраны окружающей среды РБ с просьбой рассмотреть возможность включения проекта «Реализация технологий получения электрической и тепловой энергии из биогаза на Минских очистных сооружениях» в перечень проектов совместного осуществления в рамках Киотского протокола. Реализация данной технологии позволит осуществить полное сбраживание (разложение органической части осадков в закрытых емкостях с использованием образующегося биогаза). Оставшаяся часть осадков будет уменьшена дополнительно в 8—10 раз при полном устранении запаха. Реализация технологии разложения органической части осадков с получением и последующим использованием биогаза включена в проект отраслевой схемы развития системы водоотведения г. Минска с реализацией в 2012—2015 гг..

Директор КУП «Минскводоканал» И.А. ГЕРАСИМЕНОК».

У ПРАЦЯГ ТЭМЫ

ПАЧАТАК ЁСЦЬ

31 студзеня на старонках «МС» мы напісалі пра форс-мажорную сітуацыю, якая склалася ў пасёлку Юбілейны Сеніцкага сельсавета Мінскага раёна.

На скрыжаванні вуліц Цэнтральная і Палявая колькі гадоў быў катлаван, які служыў назапашвальнікам ліўневых ападкаў у радыусе 1,5 кіламетра, бо знаходзіўся ў нізавой складцы мясцовасці. Цяпер побач узводзіцца шматпавярховы жылы дом. Каб новабудоўлю бясконца не падтаплівала, была пабудавана дамба, за якую адкачалі ваду з катлавана, а ўзровень першага паверха будынка зрабілі на 1,2 метра вышэй узроўню існуючай дарогі. (Потым вакол дома зробяць земляны вал). Але ў выніку аказаліся ў яме забудоўшчыкі індывідуальных дамоў вуліц Палявой і Цэнтральнай... і вада цяпер ідзе на іх участкі.

Як паказала інспекцыя Дэпартамента дзяржаўнага будаўнічага нагляду па Мінскай вобласці, у свой час пры будаўніцтве жылых дамоў сіламі забудоўшчыкаў з-за адсутнасці праектнай дакументацыі не была выканана вертыкальная планіроўка ўчастка забудовы. Акрамя таго, не была захавана схема планавага і вышыннага размяшчэння жылых дамоў, у выніку чаго ў рэльефе існуючай дарогі не захаваўся натуральны ўхіл. Праектам будаўніцтва 80-кватэрнага жылога дома па вуліцы Палявой ліўнёвая каналізацыя не прадугледжана.

Аднак ліўнёўка там неабходная. У сельскім Савеце сродкаў на гэта няма, пытанне паабяцаў вырашыць Мінскі райвыканкам. Днямі адтуль мы атрымалі афіцыйны адказ на змешчаны ў газеце артыкул за подпісам намесніка старшыні Сяргея Руты.

«Мінскі раённы выканаўчы камітэт разгледзеў звароты наконт адвядзення паверхневых вод у пасёлку Юбілейны па вуліцы Палявой і паведамляе наступнае.

КУП «УКБ-будінвест» атрымаў тэхнічныя ўмовы ад ВКУП «ЖКГ Мінскага раёна» для праектавання ліўнёвай каналізацыі па дадзенай вуліцы. Заключаецца дагавор з падраднай арганізацыяй на праектаванне ліўнёвай каналізацыі. Будаўніцтва дадзенага аб'екта будзе праведзена пасля падрыхтавання праектна-каштарысnай дакументацыі. На час веснавой паводкі, а таксама моцных дождж сіламі ВКУП «ЖКГ Мінскага раёна» выконваецца комплекс работ па недапушчэнню падтаплення жылых дамоў, размешчаных у нізкай кропцы рэльефа».

Інга МІНДАЛЁВА.

З ЧЫМ ІДУЦЬ ДА ДЭПУТАТА?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Неўтаймаваны самагоншчык

Пакуль на некалькі хвілін утварыўся перапынак, Віктар Пятровіч дзеліцца думкамі наконт практыкі ажыццяўлення зваротаў выбаршчыкаў. Так, паводле яго слоў, не ўдалося пакуль у заканадаўчым плане вырашыць адну надзвычай злабадзённую праблему: увесці крымінальную адказнасць за самагонаварэнне, яго збыт і выкарыстанне для продажу спіртазмяшчальных вадкасцяў. І наведвальнікі пастаянна ставяць пытанні: чаму той, хто атручвае людзей, нясе непараўнальна лёгкую адказнасць за маральныя, матэрыяльныя і сацыяльныя наступствы сваіх учынкаў? Самае вялікае пакаранне самагоншчыка — штраф у 10 базавых велічынь. Гэту акалічнасць улічваюць аматары лёгкіх грошай. Сярод іх сустракаюцца і былыя супрацоўнікі сілавых міністэрстваў, якія пасля выхаду на вельмі нядрэнную пенсію займаюцца самагонаварэннем. Пры шматмільённых прыбытках для іх такі штраф не перашкода.

— Таму летась я ініцыяваў прапанову аб унясенні ў закон пункта аб узмацненні адказнасці за збыт алкагольнай атруты. Пакуль пытанне вывучаецца і разглядаецца, неўтаймаваны самагоншчык адчувае сябе прывольна, — канстатуе дэпутат.

Кватэрнае пытанне шматдзетнай сям'і

Гэта хударлявая жанчына з цікім голасам прыйшла па кватэрнаму пытанню. Яна і чацвёра яе непаўналетніх дзяцей жывуць разам з маці, але адносіны з ёй, паводле слоў наведвальніцы, вельмі дрэнныя. У гаспадарцы, дзе яна працуе ў паляводчай брыгадзе, ёсць свабодная двухпакаёвая кватэра. Жанчына звярнулася да кіраўніка з просьбай выдзеліць ёй гэту кватэру як шматдзетнай сям'і. Той адмовіў. Вось і прыйшла да дэпутата.

Было бачна, што гэта гісторыя кранула Віктара Пятровіча. У паляводстве, як вядома, самыя нізкія заробкі і можна здагадацца, як жанчыне не проста выхоўваць дзяцей, карміць і апранаць. А на якія даходы ёй пабудаваць уласнае жыллё? Таму Анікеенка цвёрда паабяцаў дапамагчы па меры магчымасці.

Не бытам адзіным...

Былі і наведвальнікі, якія «не грузілі» дэпутата сваімі праблемамі, а прыйшлі, каб падзякаваць і параіцца. Загадчык Вілейскай гарадской бібліятэкі Тамара Валынец уводзіць мяне ў курс справы. Пры бібліятэцы ўжо больш як 20 гадоў існуе аб'яднанне «Натхненне», у яго ўваходзяць паэты і літаратары раёна. Пішуць яны добрыя творы, а вось магчымасці выдацца няма. Вось і звярнулася да дэпутата з просьбай пасадзейнічаць. Той паабяцаў падумаць. Адказ даў не адразу, але да радасці Тамары Міхайлаўны, ён быў станоўчым.

— Мне ўдалося пераканаць начальніка МПМК № 185 Фёдара Васільевіча Смоліка падтрымаць мясцовыя таленты і выступіць у ролі спонсара. Неўзабаве ў свет быў выдадзены прыгожа аформлены паэтычны зборнік «Пад шэпт хваляў Вілі». Дарэчы, ужо выдадзена пяць літаратурных зборнікаў пры падтрымцы мясцовых спонсараў, — гаворыць Анікеенка.

Вілейскі краязнаўчы музей — у сваёй катэгорыі адзін з лепшых у краіне. Тут цікавая і багатая экспазіцыя, ёсць нават асобная выставачная зала, працуюць кваліфікаваныя спецыялісты. Вось толькі адна незадача: зімой у музеі вельмі холадна. Таму і завітала да дэпутата яго дырэктар Валянціна Лапко. З дапамогай Віктара Пятровіча яна «прабівае» газіфікацыю музея, бо ацяпленне будынка электрычнымі прыборамі абыходзіцца даволі дорага — 8—10 млн рублёў штомесяц. Газ быў бы значна танней. Тым больш што труба пракладзена побач з музеем і падключэнне да яе каштавала б прыкладна 15 млн рублёў. Але ўзніклі бюракратычныя бар'еры і зараз дырэктар і дэпутат разам спрабуюць іх пераадолець.

Дырэктар сярэдняй школы № 5 Наталля Занковіч прынесла кветкі дэпутату з нагоды свята, Дня Канстытуцыі. Яна таксама ў асобе Віктара Пятровіча знайшла аднадумца. Яму спадабалася ідэя новага кіраўніка пераўтварыць гэту школу ў адну з лепшых у раёне і па ўзроўню навучання, і па знешняму выгляду, аснашчэнню аргтэхнікай. Кіраўнікі мэблевай фабрыкі Анатоль Сяргеевіч Драздоў, камбікормавага завода — Франц Міраслававіч Касцевіч і хлебазавода Анатоль Пятровіч Сяргей па парадзе дэпутата набылі для школы ксеракс, факс, музычны цэнтр. Цяпер Наталля Мікалаеўна прыйшла сказаць, што настаў час заняцца камп'ютарызацыяй класаў.

Інфармацыя для роздуму

— Па вялікаму рахунку, маё асноўнае месца работы як дэпутата — авальная зала парламента і дэпутацкая камісія, — гаворыць Віктар Анікеенка, — менавіта там ідзе заканатворчая праца. Але, каб прымаць новыя і мадэрнізаваць, прыводзіць у адпаведнасць з часам раней прынятыя законы, трэба ведаць, чым жывуць людзі, што іх хвалюе і турбуе. У гэтым сэнсе прыём наведвальнікаў, сустрэчы ў акрузе з выбаршчыкамі даюць вялікую інфармацыю да роздуму і асэнсавання рэчаіснасці. Дэпутату вельмі важна ведаць праблемы рэгіёна, яго асобных тэрыторый з першых вуснаў.

> Бывае, што дробнае пытанне, якое не вырашаецца гадамі, пасля «падключэння» дэпутата здымаецца на працягу дзвюх-трох гадзін.

Так, за час майго дэпутацтва зваротаў выбаршчыкаў, якія датычыліся б заканатворчай дзейнасці, было няшмат. Значыць, на мой погляд, прымаемыя парламентам законы ў цэлым задавальняюць людзей. Іх больш хвалююць праблемы ўзроўню мясцовай улады: у першую чаргу камунальнай гаспадаркі, сферы паслуг, добраўпарадкавання населеных пунктаў і г.д. Асабліва часта па гэтых пытаннях звяртаюцца жыхары Мядзельскага раёна. Відаць таму, што Вілейскі раён эканамічна мацнейшы, тут больш магчымасцяў для вырашэння бытавых праблем. Ды і вілейскія камунальнікі на мае дэпутацкія запыты звычайна аператыўна адгукаюцца.

Хоць фармалізму, абыякавасці, цяганіны ў рабоце некаторых мясцовых службаў са зваротамі і скаргамі людзей яшчэ, трэба прызнаць, дастаткова. Бывае, што дробнае пытанне, якое не вырашаецца гадамі, пасля «падключэння» дэпутата здымаецца на працягу дзвюх-трох гадзін. Мяне ўразіў такі выпадак. Адна сталая жанчына прынесла сваё пісьмо з рэзалюцыяй намесніка старшыні Вілейскага райвыканкама — вырашыць пытанне на працягу месяца. Зірнуў на дату і вачам не паверыў — рэзалюцыя была зроблена... 16 гадоў таму! Увесь гэты час жанчыну кармілі абяцанкамі. А справа была «смешная» — пракласці трубу для адводу вады, якая падтоплівала вясковую хаціну.

Такія выпадкі больш засмучаюць, чым радуюць. Яны — яшчэ адно сведчанне таго, што ініцыяваная Саветам Рэспублікі і Палатай прадстаўнікоў і падтрыманая Прэзідэнтам работа па актывізацыі дзейнасці мясцовай улады, у першую чаргу сельскіх Саветаў, надзвычай актуальная. На асабістым вопыце пераканаўся, што рэзервы тут велізарныя. Апошнім часам, напрыклад, стала модным сярод начальнікаў даваць ветлівы і своечасовы адказ і не спяшацца з выкананнем выкладзенай у пісьме просьбы. Чыстай вады фармалізм. Каб яго выкараніць, не трэба матэрыяльных выдаткаў. Дастаткова мясцовай уладзе наладзіць сістэмны кантроль за адказамі на звароты людзей.

Шчыра скажу: тое, што мне і маім памочнікам удаецца зрабіць па зваротах выбаршчыкаў, — вынік узаемадзеяння з абласнымі і раённымі кіраўнікамі. Мне ў выбарчай акрузе пашанцавала з выканаўчай і судовай уладай, бо часта людзі ідуць і з юрыдычнымі пытаннямі. Калі я выбіраўся дэпутатам, ад выбаршчыкаў атрымаў два сур'ёзныя наказы: у Вілейцы пасадзейнічаць завяршэнню 18-гадовай будоўлі басейна, у Мядзельскім раёне — узвесці новую школу ў вёсцы Старлыгі. Зразумела, без удзелу абласных уладаў такія пытанні не вырашаюцца, і на першай сустрэчы са старшынёй Мінаблвыканкама Мікалаем Дамашкевічам я перадаў яму змест гэтых наказаў.

У выніку аблвыканкамам было прынята станоўчае рашэнне па гэтых двух аб'ектах, за што выбаршчыкі вельмі ўдзячныя губернатару.

Узаемапаразуменне і добрыя, дзелавыя адносіны склаліся са старшынямі Мядзельскага і Вілейскага райвыканкамаў Аляксандрам Даніленкам і Яўгенам Сінілам.

Радуе, што апошнім часам і райсаветы, сельскія Саветы абодвух раёнаў усё больш прафесійна працуюць. Разам, упэўнены, нам многае ўдасца зрабіць.

***

Сям'я Ярашэвіч у пэўным сэнсе стала ахвярай урбанізацыі. Паступова яе дом у Вілейцы ўзяла ў жорсткія абдымкі гарадская забудова, ды так шчыльна, што прысядзібны ўчастак амаль у 30 сотак паступова звузіўся да памераў невялікай пляцоўкі. А пасля смерці мужа дом пенсіянеркі Марыі Іванаўны і ўвогуле аказаўся ў аварыйным стане, без ацяплення, водазабеспячэння і г.д. Тады летась і прыйшла яна на прыём да Анікеенкі... Разам з памочнікам дэпутата М. Жукавым едзем да Ярашэвіч. Марыя Іванаўна сустракае яго як дарагога госця, паказвае, што ўжо зроблена рамонтнікамі.

— У маёй хаты нібы пачалося другое жыццё. І ўсё дзякуючы Віктару Пятровічу. Бо колькі гадоў я стукала ў розныя дзверы, і ўсё дарэмна. А цяпер паглядзіце — жыць можна сталаму чалавеку. Дай Бог здароўя гэтаму дэпутату.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

УЛАДА Ў АСОБАХ

«СТАРШЫНЯ РАЙВЫКАНКАМА ЎЖО НЕ СКАЖА, ШТО СЕЛЬСКАЯ ЎЛАДА — НЕ ЯГО КЛОПАТ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Ці вызначаны план работы абласнога Савета на бліжэйшы час?

— Якраз перад вашым прыходам (16 сакавіка. — **С.Я.**) закончылася пасяджэнне прэзідыума аблсавета. На чарговай сесіі мы вырашылі разгледзець пытанне медыцынскага абслугоўвання сельскіх жыхароў. Пастараемся прасачыць праблему ў перспектыўным развіцці. За апошнія гады, як мы ведаем, закрылася шмат сельскіх бальніц. І, наадварот, у некаторых населеных пунктах былі адкрыты новыя ФАПы, амбулаторыі. Установы аснашчаліся новай медыцынскай тэхнікай, транспартам. Урачы ўчастковых бальніц сталі выязджаць па графіку на прыём хворых у ФАПы, дамы сацыяльных паслуг. Як гэта ўсё паўплывала на стан медыцынскага абслугоўвання канкрэтнага вяскоўца, наколькі медыцына даступная жыхару нават аддаленай вёсцы, — вывучаць народныя выбраннікі, каб на сесіі зрабіць высновы і абагульненні.

Наступная сесія будзе прысвечана ходу рэалізацыі праграмы развіцця вёскі. Нас перш за усё цікавіць сацыяльны аспект праблемы. З пункту гледжання сацыяльных стандартаў паспрабуем прааналізаваць якасць жыцця сваіх выбаршчыкаў, і не толькі ў аграгарадках. Зразумела, што прыярытэт у стварэнні аб'ектаў сацкультбыту аддадзены аграгарадкам. А маленькія вёскі паступова мялеюць і адміраюць. Нідзе ў свеце няма больш такіх вёсак. Гэты працэс непазбежны, бо вытворчасць дыктуе сацыяльны стан. На змену старым прыходзяць новыя тэхніка і тэхналогіі. Адзін магутны «Джон-Дзір» здольны замяніць некалькі трактароў, а значыць, патрэба ў кадрах механізатараў памяншаецца. Але ж пакуль у тых маленькіх вёсачках жывуць людзі, наш абавязак — зрабіць даступнымі для іх медыцынскае, бытавое абслугоўванне, увесь комплекс паслуг па апрацоўцы прысядзібнага ўчастка і ўтрыманні хатняй гаспадаркі. І бліжэй за ўсё да людзей, вядома, сельскія Саветы.

— Калі зайшла размова пра апрацоўку прысядзібных участкаў, хачу спытаць пра ваша стаўленне да гаспадарча-разліковых прадпрыемстваў пры сельсаветах. Адной-чы іх вельмі актыўна пачалі ствараць, потым многія пазакрываліся па прычыне нерэнтабельнасці...

— Гэта складанае пытанне. Там, дзе названыя прадпрыемствы знайшлі сваю нішу, у іх усё атрымліваецца, — няхай застаюцца. Але жыццё паказала, што існаваць ім будзе вельмі няпроста. Таму ёсць сэнс развіваць падобныя паслугі пры структурах ЖКГ, прадпрыемствах бытавога абслугоўвання. Нават асобныя звёны райаграсэрвісаў маглі б гэтым займацца. Як бы там ні было, трэба знайсці такую форму аказання паслуг, каб чалавек быў упэўнены, што вясной бульба будзе пасаджана, восенню выкапана, летам пасевы дагледжаны. І ў падраздзяленняў ЖКГ, на мой погляд, у гэтай справе большыя магчымасці, чым у іншых. Як, дарэчы, і з навядзеннем парадку, уборкай смецця і бытавых адходаў. Памылковае меркаванне, што з гэтай задачай справяцца на сваіх тэрыторыях адны сельскія Саветы. Нават калі ў іх штат увесці па дзве-тры адзінкі рабочых, атрымаецца толькі разбазарванне сродкаў. Справа сельсаветаў — правесці тлумачальную работу, арганізаваць людзей, укараніць такі парадак, каб смецце не выкідвалася ў першы равок, а падвозілася ў вызначаны час у вызначанае месца, куды падыдзе транспарт і яго забярэ. Адны вырашаюць праблему шляхам складання графікаў і вызначэння гадзін прыходу транспарту. Іншыя будуюць і абсталёўваюць стацыянарныя кантэйнеры. Усяляк добра, калі толькі смецце не валяецца, а своечасова вывозіцца.

Якім бы маленькім ні быў населены пункт, нельга зарастаць у ім брудам. Менавіта са знешняга выгляду пачынаецца агульная культура. Трэба выхоўваць людзей. Такая ўжо наша спрадвечная традыцыя — пераконваць, выхоўваць. За мяжой гэту праблему даўно вырашылі сістэмай жорсткіх пакаранняў рублём. У нас жа менталітэт крыху іншы. Значыць, мы павінны найперш звяртацца да сумлення. Ну а калі прапаганда і агітацыя не дапамагаюць, то можна і ўладу прымяніць, якая ёсць на гэты конт, напрыклад, у санітарнай службы.

— Многія службы займаюцца гэтай праблемай...

— А праблема застаецца. Пакутуюць ад стыхійных звалак прыгарадныя лясы і работнікі лясной гаспадаркі, якім даводзіцца прыбіраць за нядбайнымі суайчыннікамі. Я даўно гаварыў кіраўнікам і спецыялістам гэтай галіны, што трэба парушальнікаў парадку літаральна хапаць за руку і паказваць потым па тэлебачанні, змяшчаць у газеты партрэты «герояў». А цяпер скажу, што ўсім гэтым павінна займацца і мясцовая ўлада.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

БОТЫ ПАВІНЕН РАБІЦЬ ШАВЕЦ

Водаправодамі і дарогамі ў вёсцы будуць займацца прафесіяналы

Вядомы студзеньскі Указ № 21 «Аб павышэнні ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва» прадугледжвае шэраг розных мераў. У тым ліку гэты дакумент прадпісвае ў шасцімесячны тэрмін правесці інвентарызацыю сістэм водазабеспячэння населеных пунктаў і сельскіх дарог і перадаць іх спецыялізаваным арганізацыям. Гэта, мяркуецца, будзе спрыяць паляпшэнню якасці інфраструктуры вёсак, добраўпарадкаванню вуліц і развіццю транспартных зносінаў.

Як ідзе працэс інвентарызацыі і перадачы сельскіх дарог і водаправодаў у сельскіх раёнах Магілёўскай вобласці? Высветлілася, што большасць вясковых водаправодаў была перададзена жыллёва-камунальным службам і мясцовым арганізацыям водаканала яшчэ да выхаду Указа № 21.

— У Шклоўскім раёне сельскія водаправоды масава будаваліся недзе ў 70-х гадах, — расказвае старшыня Шклоўскага раённага Савета дэпутатаў Мікалай Яроміч. — У нас 206 вёсак, і амаль усе яны маюць водаправоды. А потым, праз два-тры дзесяткі гадоў усё стала разбурацца, і шмат чаго трэба мяняць. Разам з тым у 90-я гады пачало скарачацца пагалоўе жывёлы ў калгасах, зачыняліся фермы, і свідравіны сталі працаваць у асноўным на патрэбы насельніцтва. Але ў гаспадарках не хапала сродкаў на іх абслугоўванне. З гэтых прычын яшчэ некалькі гадоў таму мы перадалі водаправоды водаканалу. Гэта добрая справа, пра ваду павінны дбаць спецыялізаваныя прадпрыемствы, і пра дарогі таксама.

Аднак з дарогамі — усё ж іншая справа. Больш складаная, таму што іх рамонт і будаўніцтва патрабуе яшчэ большых сродкаў. У раёнах не хаваюць, што дарожныя арганізацыі не вельмі радуюцца «падарунку» ў выглядзе сельскіх дарог і іх абслугоўвання. Гэта, як кажуць, лішні «галаўны боль». Дарожнікі ўжо прынялі на баланс усе пад'езды да могілак і таксама прынялі альбо паводле рашэнняў выканкамаў гатовыя прыняць дарогі, якія вядуць праз вёскі да іншых населеных пунктаў.

Прадметам спрэчак сталі вуліцы вёсак. Мясцовая ўлада лічыць, што і іх трэба аддаць прафесіяналам, бо сёння на балансе сельскіх Саветаў няма трактароў і грэйдэраў, каб чысціць, падсыпаць, рамантаваць дарогі, як і не стае фінансавых сродкаў.

Як і ў іншых, у Чавускім раёне будзе працаваць камісія па інвентарызацыі і перадачы дарог, якая і будзе з удзелам дарожнікаў і мясцовых уладаў вырашаць усе спрэчныя пытанні.

— Перадача сістэм водазабеспячэння і сельскіх дарог — гэта надзённае пытанне, — лічыць старшыня Чавускага раённага Савета дэпутатаў Аляксандр Чыканаў. — Таму што жыллёва-камунальныя службы маюць рэсурсы — фінансавыя, тэхнічныя і тэхналагічныя, каб сачыць за водаправодамі і рамантаваць іх. Мы амаль усю жыллёва-камунальную гаспадарку перадалі раней, засталіся толькі некалькі калонак у вёсках. І вялікае дзякуй раённаму жылкамунгасу: там не сталі цягнуць час і адразу пасля выхаду ўказа запыталі інфармацыю і забралі ўсё, што ім павінна належаць.

Стан водаправодаў у вёсках Чавускага раёна цяпер ацэньваецца як лепшы, чым быў да перадачы жыллёва-камунальнай службе. Ёй удалося нават «рэанімаваць» тыя калонкі, якія не працавалі па некалькі гадоў. І сістэма работы арганізацыі дазваляе падтрымліваць водазабеспячэнне вёсак у здавальняючым стане.

Гэта пацвярджае старшыня Вайнілаўскага сельскага Савета Тамара Жыркевіч.

— У нас на тэрыторыі два водаправоды — у цэнтры сельсавета Вайнілах і ў вёсцы Капані, — расказала Тамара Іванаўна. — Яны вельмі старыя, іх будавалі гаспадарчым спосабам, і нават дакументацыю на іх мы не здолелі адшукаць. Мы перадалі водаправоды гадоў пяць таму і не памылілісяся. У гаспадарцы пры хранічным безгрошоўі няма магчымасці клапаціцца пра водаправоды, а камунальнікі рамантуюць іх сістэматычна і без затрымак. Мы вельмі задаволеныя іх працай, асабліва ў апошнія два гады: яны, відаць, набылі тэхніку і робяць усё аператыўна.

А вось дарогі, прызналася старшыня, знаходзяцца ў падвешаным стане. Дарогі, якія звязваюць населеныя пункты (іх тут называюць «шкілетнымі»), абслугоўваюць дарожнікі. А іншыя — ніхто, яны нават на балансе сельскага Савета не лічацца. Вось і атрымліваецца, што ў Вайнілаўскім сельсавеце палова дарог — у нядрэнным стане, а іншая палова — наадварот, у нядобрым. Таму ў Вайнілах лічаць, што перадача дарог прафесіяналам абавязкова дасць плён: ва ўсякім разе, у іх ёсць матэрыяльная база, каб імі займацца.

У Ходасаўскім сельскім Савеце, што ў Мсціслаўскім раёне, лічаць, што вуліцы вёсак дарожнікі на свой баланс прымаць усё ж не будуць. Цэнтральныя дарогі, якія ідуць праз Ходасы, і так заасфальтаваныя і ў добрым стане. А вось бакавыя дарогі і тут практычна «нічыйныя» і, каб чысціць іх ад снегу і грэйдзіраваць, сельвыканкаму даводзіцца «круціцца». Старшыня сельвыканкама Анатоль Шаванаў тлумачыць: «Дарогі не на нашым балансе, таму плаціць за іх рамонт і чыстку не маем права. Але ж народ трываць безгаспадарнасці не будзе, таму трэба шукаць спосабы і... урэшце знаходзіць».

А вось У Галіцкім сельскім Савеце Клімавіцкага раёна не бачаць праблем з тым, каму належаць вясковыя дарогі. Новы старшыня Валерый Філімонаў паведаміў, што на добраўпарадкаванне ім даюць грошы — на гэты год выдаткавалі 10 мільёнаў рублёў, і за іх робіцца падсыпка дарог і ўсталяванне агароджы. Калі не хопіць гэтых сродкаў, то дадуць яшчэ, спадзяецца старшыня.

Намеснік старшыні Клімавіцкага райвыканкама Леанід Саўчанка паведаміў, што ўжо цяпер у раёне перададзена на баланс Аблдарбуда 576 кіламетраў дарог, куды ўваходзяць пад'езды да могілак і транзітныя дарогі праз населеныя пункты.

— А вось бакавыя вуліцы — на балансе сельскіх Саветаў, і пакуль іх перадача не плануецца, — паведаміў Леанід Якаўлевіч. — Канешне, выдаткі на іх утрыманне вялікія, але мы аказваем дапамогу сельсаветам праз дарожныя арганізацыі. Дарогі ў аграгарадках, а іх цяпер у Клімавіцкім раёне ўжо 5, абслугоўваюць камунальнікі.

У Круглянскім сельскім Савеце засталося зусім няшмат зрабіць па перадачы водаправодных сетак. Праца гэта па ініцыятыве кіраўніцтва Круглянскага раёна пачалася даўно і цяпер засталіся толькі дробязі. Хоць забіраюць іх, прызнаюцца мясцовыя ўлады, без асаблівай ахвоты — усё ж такі лішні цяжар.

Фотв Анатоля КЛЕШЧУКА.

Але ўказ ёсць указ, павінны выконваць.

А вось перадача дарог стала прадметам абмеркавання на сесіі раённага Савета дэпутатаў. Пра злабадзённасць гэтай праблемы казаў з трыбуны старшыня Круглянскага сельскага Савета Валерый Ярковіч.

— У сувязі з тым, што розным установам належаць дарогі, узнікаюць абсурдныя сітуацыі, — тлумачыць Валерый Іванавіч. — Вось у нас за 20 кіламетраў ад цэнтра ёсць вёска Скляпава. Стаіць не на трасе, а каля яе. Дарожнікі абслугоўваюць трасу і чысцяць яе ад снегу, каб хадзілі аўтобусы і іншы транспарт. Аднак не чысцяць вуліцы самога Скляпава — маўляў, гэта не наша. А нам трэба, каб у вёску магла праехаць «хуткая дапамога», каб заехала аўталаўка і каб завезлі газ. Таму мы «ціснем» на кіраўніка гаспадаркі, і цяпер ужо ён адпраўляе свой трактар за два дзесяткі кіламетраў, каб пачысціць вясковыя вуліцы. Ну ці гэта па-гаспадарску?

Валерый Ярковіч гаворыць, што ў сельсавеце няма трактара, а ў гаспадарцы, асабліва ўзімку, здараецца, і вядра саляркі не знойдзеш, каб накіраваць тэхніку на расчыстку дарог. І калі ў сельскіх дарог з'явіцца адзін гаспадар, будзе нашмат лепей для людзей. Тым больш што ў Круглянскім раёне з тымі дарогамі, якія абслугоўвае спецыялізаваная арганізацыя, ніякіх праблем няма.

Таму палажэнні Указа аб перадачы дарог старшыня лічыць своечасовым. «Гэта важная праблема і, відаць, не толькі наша, але і ўсёй рэспублікі, — лічыць Ярковіч. — Добра, што пачулі ўверсе голас народа».

— Я лічу, што гэта вельмі патрэбны пункт указа, — выказаў сваё меркаванне старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Панцюхоў. — І плён ад яго рэалізацыі будзе ўжо толькі таму, што кожны павінен займацца сваёй справай. І сачыць за працай сістэм водазабеспячэння і за якасцю дарог павінны прафесіяналы. Боты павінен рабіць шавец!

Ілона ІВАНОВА.

Другое жыццё

Дэпутаты Лепельскага райсавета вырашылі, што неабходна «даць другое жыццё» Бярэзінскай воднай сістэме, якая ў свой час была створана па ўказу Паўла I. Яе агульная працягласць — каля 170 кіламетраў. Частковае аднаўленне будзе фінансавацца з мясцовага бюджэту і ўжо прадугледжана ў праграме развіцця раёна.

Ініцыятары рэалізацыі такога грандыёзнага праекта ўпэўнены, што гэты незвычайны водны шлях пасля аднаўлення зможа спрыяць развіццю турызму. Паколькі цудам захаваўся будынак канторы воднай сістэмы, тут плануецца адкрыць музей. Паралельна будуць адкрывацца атэлі і рэстараны, каб турыстычная галіна ў рэгіёне адпавядала ўсім сучасным патрабаванням.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:

САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:

МАЛАФЕЕЎ А. А., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню;

САСОНКА М. П., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту;

СЯЛІЦКІ В. С., старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў;

СІВАКОЎ В. А., старшыня Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў;

ЯРКОВІЧ В. І., старшыня Круглянскага сельскага Савета Магілёўскай вобласці.

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК: Наталля КАРПЕНКА.

Кантактны тэлефон 292-21-03.

Открытое акционерное общество «Солигорскпромстрой»
Адрес: г. Солигорск Минской обл., ул. Козлова, 37, тел./факс 8-01710-29946
Основной вид деятельности: общестроительные работы

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 1 ЯНВАРЯ 2007 ГОДА

в млн рублей

№ строки	АКТИВ	На начало года	На конец года	№ строки	ПАССИВ	На начало года	На конец года
190	Внеоборотные активы	50027	65464	510	Уставный фонд	48	48
210	Запасы и затраты	12188	17185	520	Резервный фонд	1333	1774
220	Налоги по приобретенным ценностям	2026	3089	530	Добавочный фонд	57643	72517
				540	Нераспределенная прибыль	5329	3885
230	Готовая продукция и товары	640	1994	560	Целевое финансирование	408	4
240	Товары отгруженные	7702	16151	590	Источники собственных средств	64761	78228
250	Дебиторская задолженность	16845	20919	690	Доходы и расходы	-902	-1505
260	Финансовые вложения	156	12	710	Краткосрочные кредиты и займы	2282	6935
270	Денежные средства	4068	5897	720	Долгосрочные кредиты и займы	3269	6347
280	Прочие оборотные активы	2	0	730	Кредиторская задолженность	24244	40706
290	Итого оборотные активы	43627	65247	790	Расчеты	29795	53988
390	БАЛАНС	93654	130711	890	БАЛАНС	93654	130711

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ЗА 2006 ГОД

Наименование показателя	Код стр.	За отчетный период
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей)	030	236434
В том числе бюджетные субсидии на покрытие разницы в ценах	031	119
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг и расходы на реализацию	040-060	220454
Прибыль от реализации	070	15980
Прибыль от операционных доходов и расходов	130	125
Убыток от внереализационных доходов и расходов	190	-2173
Итого прибыль за отчетный период	200	13932
Налоги и сборы, производимые из прибыли	210	4513
Расходы и платежи из прибыли	220	51
Сумма льготы по налогу на прибыль	230	1576
Прибыль к распределению	240	7792

Руководитель Н.З. АШЕЙЧИК Главный бухгалтер А.М. ШАДУРКО

Данные отчетности подтверждены РУП «Служба ведомственного контроля при Минстройархитектуры».
Специальное разрешение (лицензия) Министерства финансов РБ № 02200/0061752 от 17.05.2004.

НА КАНТРОЛІ ЎЛАДЫ

ЗАХАЦЕЛІ БУДАВАЦЬ? ДАБУДОЎВАЙЦЕ!

Больш года прайшло пасля выхаду Указа Прэзідэнта Беларусі ад 7 лютага 2006 года № 87 «Аб некаторых мерах па скарачэнню незавершаных будаўніцтвам незакансерваваных жылых дамоў, дач». Ён пачаў дзейнічаць 1 красавіка мінулага года. Наколькі эфектыўна? З якімі праблемамі сутыкаюцца на месцах тыя, хто будуе індывідуальнае жыллё? Аб выкананні патрабаванняў Указа на Віцебшчыне мы папрасілі расказаць старшынь сельскіх Саветаў.

Паводле слоў старшыні Кастрычніцкага сельскага Савета Віцебскага раёна Валерыя Чалнакова, незавершаных будаўнічых аб'ектаў на тэрыторыі Савета ў мінулым годзе не было. «Як і прадугледжана дакументам, мы праводзім работу па выяўленню недабудаваных і незакансерваваных жылых дамоў, дач. Грамадзяне абавязаны завяршыць усе работы, у тым ліку і ўзгадненні з рознымі інстанцыямі, напрыклад, з пажарнай аховай, на працягу максімум 3,5 года з моманту атрымання дакумента аб пасведчанні дзяржаўнай рэгістрацыі права прыватнай уласнасці альбо пажыццёвага атрыманага ў спадчыну ўладання на зямельны ўчастак. Тэрмін будаўніцтва ў некаторых выпадках можа быць падоўжаны мясцовымі ўладамі, але ж не больш чым на адзін год з улікам матэрыяльнага становішча грамадзяніна...

У нас такіх выпадкаў няма. Людзі летась пабудавалі каля 20 індывідуальных дамоў, у тым ліку і з выкарыстаннем ільготнага крэдытавання. Здалі ў эксплуатацыю 60-кватэрны кааператыўны жылы дом... За незавершанае будаўніцтва прадугледжаны падаткі, якія трапляюць у бюджэт прадстаўнічай улады. Яшчэ і таму за гэтым пытаннем кантроль асаблівы...»

Старшыня Лепельскага сельскага Савета Лепельскага раёна Адам Ташліковіч, адказваючы на пытанні па гэтай тэме, адзначыў, што пасля выхаду Указа Прэзідэнта тры сям'і звярнуліся з просьбай даць дазвол на працяг будаўніцтва. А сярод сапраўдных «даўгабудаў» такія, што забудоўваюцца па 5, 7 і нават 10 гадоў...

«Сумленным забудоўшчыкам, якія гатовы выканаць усе патрабаванні Указа, мы пайшлі насустрач. Разумеем, што будаўніцтва — справа цяжкая: і грошай не заўсёды своечасова хапае, ды і шмат іншых праблем можа ўзнікнуць. Калі падлічыць, колькі ў нас каштуе дом прыватны пабудаваць, мільёнаў пад трыццаць атрымліваецца! Канешне, гэта шмат.

Таму вельмі актуальныя патрабаванні кіраўніка дзяржавы аб паніжэнні кошту будаўніцтва. Да разгляду ў судовым парадку ў нашым Савеце яшчэ не даходзілі, бо Указ дзейнічае параўнальна нядаўна, таму час завяршыць будаўніцтва ў людзей ёсць... Яшчэ некалькі індывідуальных дамоў на нашай адміністрацыйнай тэрыторыі фактычна пабудаваныя, але ж не атрыманы дазволы на засяленне з боку санстанцыі, пажарных і іншых службаў.

Вядзём актыўную асветніцкую работу з тымі, хто атрымлівае дамы ў спадчыну. Канешне, прасцей атрымаць участак ды перавезці туды ўжо пабудаваны дом, даць яму рамонт, зрабіць дабудову. Альбо непасрэдна на месцы «перапланаваць» дом. Будынак, які не эксплуатуецца, можна набыць і за 1 тысячу і за 1,5 тысячы ўмоўных адзінак. Добраўпарадкаваць тэрыторыю, запрасіць будаўнікоў альбо самім зрабіць такі стары дом сучасным.

Тыя, хто маюць права, атрымліваюць так званае службовае жыллё: за два гады такім чынам каля 50 дамоў пабудаваны для работнікаў сельгаспрадпрыемстваў. З'яўляюцца яны ў аграгарадках, што актыўна развіваюцца. Людзі паралельна і навасяллі спраўляюць, і добра развітыя паслугі ад дзяржавы атрымліваюць: ФАПы, крамы, школы і г.д. у аграгарадках, як вядома, рэканструююцца. Таму людзі «адбудоўваюцца» такім чынам «бясплатна», разам з вёскай, пасёлкам. І двойчы адчуваюць дзяржаўны клопат».

Падрыхтаваў Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ТВАЕ ПРАВЫ
Інфармацыя. Парады. Дапамога.
№1

Кватэрнае пытанне
КОЛЬКІ ПЛАЦІЦЬ ІНВЕСТАРУ?

У 1999 годзе ў нас у Вілейцы пачалі будаваць 90-кватэрны дом ЖБК, але потым чамусьці кінулі: да восені 2006-га аб'ект быў замарожаны. Зараз работы пачынаюць зноў і ўжо з новых членаў ЖБК патрабуюць, каб яны аплацілі тое, што зроблена. Што цікава: папярэдні член кааператыва за той аб'ём работ заплаціў $900, новы (мая дачка ў прыватнасці) павінна плаціць $2700. Кажуць, што гэта такая індэксацыя. А чаму і ці так яна павінна рабіцца?

В. КАРАЛЁВА, *Вілейскі раён.*

Як патлумачыў член праўлення грамадскага аб'яднання «Веды» В.В. Савіцкі, парадак і ўмовы вяртання грашовых сродкаў грамадзян (у тым ліку ўзносаў членаў ЖБК), унесеных на аплату будаўніцтва жылога памяшкання ў шматкватэрным жылым доме, пры іх добраахвотным выхадзе або выключэнні са складу ўдзельнікаў будаўніцтва вызначаны Палажэннем, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14 верасня 2006 года № 1207. Гэтым жа дакументам вызначаны парадак і ўмовы ўнясення грашовых сродкаў у якасці ўзносаў новага члена ЖБК на аплату будаўніцтва жылога памяшкання пры яго ўступленні ў арганізацыю грамадзян-забудоўшчыкаў замест члена кааператыва, які выбыў. Гэтае Палажэнне распрацавана ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 чэрвеня 2006 года № 396 «Аб долевым будаўніцтве шматкватэрных жылых дамоў».

У названым Палажэнні прыведзены таксама парадак разліку і індэксацыі сродкаў, якія вяртаюцца. Сума грашовых сродкаў, якая вяртаецца, падлягае індэксацыі з улікам адпаведнага індэкса змянення кошту будаўніча-мантажных работ, зацверджанага на дату выплаты.

Сродкі, якія вяртаюцца, індэксуюцца наступным чынам. Кожны ўнесены забудоўшчыкам, які выбыў, узнос падлягае даацэнцы на фактычную дату яго вяртання шляхам памнажэння на каэфіцыент, які вызначаецца адносінамі дзеючага на фактычную дату вяртання сродкаў індэкса змянення кошту будаўніча-мантажных работ, зацверджанага Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва па кожнай вобласці і г. Мінску, да аналагічнага індэкса, што дзейнічаў на дату пералічэння ўзносу на спецыяльны, бягучы (разліковы) рахунак арганізацыі грамадзян-забудоўшчыкаў, заказчыка (забудоўшчыка).

Індэксы змянення кошту будаўніча-мантажных работ вызначаюцца ў адпаведнасці з афіцыйна апублікаванымі данымі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва.

Разлік узносаў былога інвестара, якія падлягаюць вяртанню, зацвярджаецца ўпаўнаважаным органам (арганізацыяй грамадзян-забудоўшчыкаў) на працягу 7 дзён пасля прыняцця рашэння аб выключэнні інвестара з арганізацыі грамадзян-забудоўшчыкаў.

Вяртанне ўзносаў у поўным аб'ёме ажыццяўляецца ў месячны тэрмін пасля прыняцця іншага інвестара ў склад удзельнікаў будаўніцтва (арганізацыю грамадзян-забудоўшчыкаў), але не пазней, чым 6 месяцаў з моманту прыняцця рашэння аб выключэнні інвестара з арганізацыі грамадзян-забудоўшчыкаў.

Узнос інвестара, які ўступае ў будаўніцтва, вызначаецца як доля праіндэксаванага кошту выкананых работ і іншых затрат (незавершанае будаўніцтвам жылое памяшканне) на дату ўступлення.

Індэксацыя ўзносаў ажыццяўляецца шляхам памнажэння на каэфіцыент, які вызначаецца адносінамі дзеючага на дату прыняцця рашэння аб уключэнні новага інвестара індэкса змянення кошту будаўніча-мантажных работ, зацверджанага Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва па кожнай вобласці і г. Мінску, да аналагічнага індэкса, што дзейнічаў на дату кожнага пералічэння сродкаў на бягучы (разліковы) рахунак падрадчыка.

У выпадку, калі інвестар, які ўступае, не аплаціў узнос на працягу аднаго месяца з дня прыняцця рашэння аб яго ўключэнні ў склад удзельнікаў будаўніцтва (арганізацыі грамадзян-забудоўшчыкаў), разлічаная ва ўстаноўленым парадку сума грашовых сродкаў, якія вяртаюцца, падлягае індэксацыі шляхам памнажэння на каэфіцыент, які вызначаецца адносінамі дзеючага на момант фактычнай аплаты ўзносу індэкса змянення кошту будаўніча-мантажных работ да аналагічнага індэкса, што дзейнічаў на момант прыняцця рашэння аб яго ўключэнні.

У выпадку парушэння новымі інвестарамі тэрмінаў унясення наступных плацяжоў выкананыя работы аплачваюцца з улікам інфляцыі на момант фактычнага разліку з прымяненнем індэксаў, указаных у Палажэнні. Максімальна магчымы тэрмін унясення новым інвестарам узносу вызначаецца органам, упаўнаважаным прымаць рашэнне аб уключэнні новага інвестара замест таго, які выбыў.

Пры адмове ў індэксацыі і вяртанні ўзносаў або нязгодзе інвестара з памерам сумы, якая вяртаецца, і тэрмінамі яе вяртання, а таксама ў іншых выпадках спрэчкі вырашаюцца ў судовым парадку ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Фота Пятра ФАМІНА.

Кантакты сталіся рэаліяй даволі даўно, і сёння гэтую форму найму выкарыстоўвае абсалютная большасць дзяржаўных арганізацый. Між тым, даводзіцца канстатаваць як факт: менавіта апошнім часам працоўныя дагаворы «з абмежаваным тэрмінам» становяцца ўсё больш распаўсюджанай з'явай і ў сферы прыватнай. Прычым тут таксама ўзнікаюць свае няпростыя сітуацыі. Хто вызначае стымулы падчас змянення ўмоў працы, як правільна заключыць кантракт, у якіх выпадках яго можа датэрмінова скасаваць наймальнік або наадварот — работнік? Адказы на гэтыя і іншыя пытанні мы паспрабуем «адшукаць» з дапамогай намесніка дырэктара Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Ірыны Фёдараўны ШЫЛЯЕВАЙ.

А менш — са згоды

Правілы. І выключэнні

Звольніць работніка пасля заканчэння тэрміну кантракта — права наймальніка. Адно, што адначасова ён абавязаны зрабіць пісьмовае паведамленне аб спыненні працоўных адносінаў не пазней чым за два тыдні. Праўда, у дадзеным выпадку існуюць свае выключэнні. Так, пры ўмове адпаведнай згоды наймальнік павінен працягнуць дзеянне кантракта з жанчынай (як варыянт, бацькам або апекуном), якія прыступілі да работы да ці пасля заканчэння «дэкрэтнага», да моманту дасягнення дзіцем 5-гадовага ўзросту. Плюс да таго, кантракт з перадпенсійнымі асобамі (мужчынамі ў 58 ці жанчынамі ў 53 гады) працягваецца прынамсі да дасягнення імі 60 і 55 гадоў адпаведна. Нарэшце, пэўныя меры абароны работнікаў могуць прадугледжвацца ў калектыўных дагаворах, якія для канкрэтных наймальнікаў з'яўляюцца абавязковымі для выканання.

Да слова, заканадаўства вызначае, што заключаць кантракт дазваляецца як мінімум на год, а як максімум — на 5 гадоў. А працягваць кантракт — як мінімум на год. Аднак нельга не заўважыць, што тэрмін працягу можа быць і меншым. Аднак такі варыянт магчымы толькі пры адной умове — пісьмовай заявы непасрэдна работніка і згоды наймальніка.

Раней таксама могуць

Заключэнне кантракта, напрыклад, тэрмінам на год яшчэ не значыць, што работнік застанецца гэты час на сваім месцы ў абавязковым парадку. Працоўныя адносіны могуць спыніцца і раней. Прычым па аднабаковай ініцыятыве наймальніка.

— Наймальнік мае поўнае права скасаваць кантракт датэрмінова адразу ў некалькіх выпадках, — адзначае Ірына Шыляева. — Да прыкладу, прычынай у дадзеным выпадку можа быць парушэнне работнікам працоўных абавязкаў, замацаваных у самім кантракце. Падстава другая — неадпаведнасць займаемай пасадзе ў сувязі з недахопам кваліфікацыі, немагчымасць выконваць свае абавязкі па стану здароўя, ліквідацыя арганізацыі, скарачэнне колькасці персаналу. Апроч таго, развітацца з працоўным месцам раней можна за прагул і іншыя парушэнні працоўнай дысцыпліны.

Дамова. Ці невыкананне?

Кантракт — гэта заўсёды ўзаемныя абавязкі. Таму для датэрміновага звальнення рашэння толькі работніка недастаткова. Рашэнне павінна быць «падмацавана» згодай наймальніка. Калі ж згоды няма — давядзецца адпрацаваць увесь час. Або... спаслацца на парушэнні заканадаўства.

— Невыкананне наймальнікам пэўных пунктаў кантракта дае права на яго скасаванне ўжо па ініцыятыве работніка, — тлумачыць Ірына Шыляева. — Аднак у такім выпадку трэба выканаць пэўную працэдуру, і ў прыватнасці, напісаць заяву ў адзін з трох упаўнаважаных органаў, якія маюць права на вызначэнне парушэння заканадаўства ў адносінах да работніка, — у суд, дэпартамент дзяржаўнай інспекцыі працы ці ў прафсаюзы. Прычым, калі факт парушэння пацвердзіцца, работнік зможа не толькі звольніцца, але таксама атрымаць мінімальную кампенсацыю ў памеры свайго сярэдняга трохмесячнага заробку.

Сяргей ГРЫБ.

Прымаць рашэнне можна месяц

Перш-наперш варта заўважыць, што прыём або перавод з дагавора на няпэўны тэрмін на кантрактную форму найму залежыць толькі ад аднаго — меркавання непасрэдна наймальніка. Прычым, у адрозненне ад дзяржаўнага сектара, для прыватных арганізацый такі крок з'яўляецца зусім не абавязковым. Аднак у любым выпадку, незалежна ад формы ўласнасці, правіла тут будзе агульным — наймальнік павінен абгрунтаваць сваё рашэнне. Пры гэтым у дадзеным выпадку могуць прымацца толькі тры прычыны — вытворчыя, арганізацыйныя ці эканамічныя.

— За месяц да мяркуемага часу пераводу на новую форму найму кожнаму работніку выдаецца пісьмовае паведамленне з праектам кантракта, — кажа Ірына Шыляева. — А далей усё залежыць ад самога работніка. Ён можа пагадзіцца з прапановай, а можа — не пагадзіцца. Аднак у апошнім выпадку наймальнік павінен скасаваць працоўныя адносіны з выплатай двухтыднёвай выхадной дапамогі і кампенсацыі за нявыкарыстаны водпуск. Вядома, калі такі водпуск у чалавека застаўся.

Кожнаму — сваё

Правіла нумар два — для кожнага асобнага работніка кантракт складаецца індывідуальна. Прычым да яго зместу існуюць пэўныя патрабаванні. У прыватнасці, кантракт павінен утрымліваць канкрэтную суму зарплаты ці акладу на момант заключэння, звесткі аб рэжыме работы, рэгламентаваных перапынках, колькасці каляндарных дзён водпуску, нарэшце, аб тэрмінах выплаты зарплаты. Да слова, можна заўважыць, што зарплата кантрактніку можа выплачвацца і аднойчы адзін раз у месяц. Прынамсі, адсутнасць запісу аб «авансе» ніякім парушэннем тут не з'яўляецца. Парушэнне будзе ў іншым — калі ў кантракце ўказваецца не пэўны дзень выплат, а «інтэрвал». І да таго ж нельга не заўважыць, што, незалежна ад часу паступлення фінансавых сродкаў на рахунак арганізацыі, поўны разлік з работнікам за папярэдні месяц неабходна правесці да 25 числа. У адваротным выпадку ёсць ўсе падставы казаць аб пратэрміноўцы.

Стымулы «ў пакеце»

У параўнанні з бестэрміновым працоўным дагаворам кантракт прынята лічыць пагаршэннем умоў працы. А за пагаршэнне прызначаецца своеасаблівая «кампенсацыя». Дакладней, паводле заканадаўства, падобных стымулаў павінна быць два — павелічэнне тарыфнай стаўкі ці акладу да 50 працэнтаў і прадастаўленне да 5 дадатковых дзён адпачынку. Прычым падобныя планкі — максімальныя. Што да мінімуму, то яго, па сутнасці, не існуе. Адпаведна, наймальнік можа дадаць усяго 0,1 працэнта да акладу і 1 дзень водпуску. Галоўнае, каб гэта ўсё ж адбылося.

— Апроч таго, трэба падкрэсліць, што абодва стымулы даюцца адначасова, — працягвае Ірына Шыляева. — У прыватнасці, немагчыма павысіць работніку аклад і пакінуць ранейшую працягласць водпуску. І наадварот: пры пераходзе на кантракт недапушчальна павелічэнне адпачынку без прадастаўлення «надбаўкі» да зарплаты.

Актуальны каментарый

БЯСПЛАТНАЕ ХАРЧАВАННЕ ДЛЯ МАЛЫШОЎ — ПА-НОВАМУ

У Беларусі зменены ўмовы назначэння і парадак прадастаўлення бясплатнага дзіцячага харчавання для дзяцей першых двух гадоў жыцця. Адпаведная пастанова Савета Міністраў № 271 уступае ў сілу з красавіка гэтага года. Яна накіравана на ўзмацненне сацыяльнай падтрымкі малазабяспечаных сем'яў, якія выхоўваюць малалетніх дзяцей, на забеспячэнне іх паўнацэнным збалансаваным харчаваннем. Аб гэтым у гутарцы з карэспандэнтам БЕЛТА паведаміла намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна Шаметавец.

Механізм бясплатнага забеспячэння прадуктамі харчавання дзяцей першых двух гадоў жыцця стартаваў у рэспубліцы ў 1999 годзе. Па дзеючаму заканадаўству права на яго маюць тры катэгорыі сем'яў — шматдзетныя, няпоўныя і сем'і, у якіх маці і бацька з'яўляюцца студэнтамі. Неабходная ўмова прадастаўлення бясплатнага харчавання — сукупны даход на члена сям'і ў месяц не павінен перасягаць 20 працэнтаў сярэднедушавога мінімальнага спажывецкага бюджэту сям'і з 4 чалавек за папярэдні квартал (у лютым гэты «парог» быў на ўзроўні Br53 тыс. 20).

Як паказвае практыка, асноўнымі атрымальнікамі бясплатнага дзіцячага харчавання з'яўляюцца няпоўныя сем'і. Часта адзіным даходам для такіх сем'яў з'яўляецца дапамога па догляду дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў.

Нагадаем, у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 лютага 2006 года № 95 з 1 лютага мінулага года памер дапамог па догляду дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў непрацуючым маці павялічаны да 65 працэнтаў бюджэту пражытачнага мінімуму (БПМ). З улікам надбавак для адзінокіх маці памер гэтай дапамогі ў лютым гэтага года складаў Br193 тыс. 950 на дзяцей ва ўзросце да паўтара года і Br155 тыс. 160 — на дзяцей ва ўзросце ад паўтара да трох гадоў.

«Павышэнне памеру дапамогі стала «перашкодай» для атрымання бясплатнага харчавання. Права на яго пазбавіліся многія сем'і, у першую чаргу сем'і адзінокіх маці. Паколькі сукупны даход такіх сем'яў перасягнуў устаноўлены для атрымання бясплатнага харчавання крытэрый патрэбнасці, сказала субяседніца. — Гэта прывяло да рэзкага скарачэння атрымальнікаў гэтага віду сацыяльнай дапамогі». Так, калі ў 2005 годзе бясплатнае харчаванне атрымлівалі 8,7 тыс. малышоў, то ў 2006 годзе — усяго каля 2 тыс. малышоў.

Галоўная навацыя пастановы Саўміна — адмена катэгарыяльнага прынцыпу і павышэнне «парогу» патрэбнасці пры назначэнні гэтага віду дзяржаўнай дапамогі. Гэта дасць магчымасць пашырыць кантынгент атрымальнікаў такога віду падтрымкі, забяспечыць адраснасць пры яе назначэнні, падкрэсліла субяседніца. Паводле яе ацэнкі, рэалізацыя гэтых мераў прывядзе да таго, што бясплатным харчаваннем змогуць карыстацца 26 тыс. дзяцей ва ўзросце да двух гадоў з малазабяспечаных сем'яў.

(Заканчэнне на 6-й стар.)

Фота Пятра ФАМІНА.

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2007 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды

(паштовы індэкс) (адрас)

Каму

(прозвішча, ініцыялы)

ПВ | месца | літар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету

(індэкс выдання)

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт: падпіскі _____ руб. | пераадрасоўкі _____ руб. | Колькасць камплектаў

на 2007 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды

(паштовы індэкс) (адрас)

Каму

(прозвішча, ініцыялы)

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на II квартал або 6 месяцаў 2007 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе ў рэдакцыю па адрасу **220013 Мінск, вул.Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць у якасці прыза гадзіннікі, майкі, бейсболкі, печ СВЧ, тэлевізар «Віцязь» і суперпрыз — халадзільнік «Атлант». Карткі, наклееныя на паперу ці плёнку, або дасланыя **пасля 30 сакавіка 2007 года** па паштоваму штэмпелю атрымання да ўдзелу ў гульні не прымаюцца. Розыгрыш прызоў праводзіцца **3 красавіка 2007 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 13 красавіка**.

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **да 20 чэрвеня 2007 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II кв. або 6 мес. 2007 года і пашпарта. Дастаўку печы СВЧ, тэлевізара і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 20 чэрвеня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Больш падрабязна правілы гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў нумары газеты за 10 сакавіка 2007 года. Удачы ў гульні!

4 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал або 6 месяцаў 2007 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____ (аддзяленне сувязі)

_____ **на II кв. або 6 мес. 2007 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ (індэкс) _____

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА за 2006 год

Открытое акционерное общество "Центроэнергомонтаж"

Адрес: **220033 г. Минск, пер. Велосипедный, 7**

Информация об открытом акционерном обществе и его деятельности по состоянию на «**01**» **января** 2007г.

5. Количество акционеров — всего **596,** в том числе юридических лиц — **1,** физических лиц — **595**.

6. Информация о дивидендах и акциях:

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	миллионов рублей	112	251
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	рублей	273	523
Обеспеченность акции имуществом общества	тысяч рублей	37	31
Количество простых акций, находящихся на балансе общества	штук	27 012	0

7. Информация о задолженности:

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Просроченная дебиторская задолженность	миллионов рублей	0	0
Просроченная кредиторская задолженность	миллионов рублей	0	0

9. Среднесписочная численность работающих (человек) — **894**

10. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета): **строительство инженерных сооружений**.

Бухгалтерский баланс

Актив	Код строки	На начало отчетного года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
I. Внеоборотные активы			
Основные средства (01, 02)	110	7 316	11 600
Нематериальные активы (04, 05)	120	1	4
Доходные вложения в материальные ценности (02, 03)	130	-	
Вложения во внеоборотные активы (07, 08,16, 60)	140	141	5
Прочие внеоборотные активы	150	-	
ИТОГО по разделу I	190	**7 458**	**11 609**
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	3 887	4 680
В том числе: сырье, материалы и аналогичные ценности (10, 14, 15, 16)	211	3 655	4 123
животные на выращивании и откорме (11)	212	-	
незавершенное производство (издержки обращения) (20, 21, 23, 29, 44)	213	232	557
прочие запасы и затраты	214		
Налоги по приобретенным ценностям (18, 76)	220	261	772
Готовая продукция и товары (40, 41, 43)	230	574	1 132
Товары отгруженные, выполненные работы, оказанные услуги (45, 46)	240	-	
Дебиторская задолженность	250	9 241	8 811
В том числе: расчеты с покупателями и заказчиками (62, 63)	251	8 034	6 787
расчеты с учредителями по вкладам в уставный фонд (75)	252	-	-
расчеты с разными дебиторами и кредиторами (76,60)	253	527	1 181
прочая дебиторская задолженность	254	680	843
Финансовые вложения (58, 59)	260	6	67
Денежные средства (50, 51, 52, 55, 57)	270	486	1 086
Прочие оборотные активы	280	-	-
ИТОГО по разделу II	290	**14 455**	**16 548**
БАЛАНС	390	**21 913**	**28 157**
Пассив	Код строки	На начало отчетного года	На конец отчетного периода
III. Источники собственных средств Уставный фонд (80)	510	572	572
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) (81)	515	-	-21
Резервный фонд (82)	520		
Добавочный фонд (83)	530	11 184	14 639
Нераспределенная прибыль (84)	540	816	
Непокрытый убыток (84)	550	-	-
Целевое финансирование (86)	560	-	-
ИТОГО по разделу III	590	**12 572**	**15 190**
IV. Доходы и расходы Резервы предстоящих расходов (96)	610	-	3
Расходы будущих периодов (97)	620	-248	-123
Доходы будущих периодов (98)	630	11	9
Прибыль отчетного года (99)	640		
Убыток отчетного года (99)	650	-	
Прочие доходы и расходы	660	-	-
ИТОГО по разделу IV	690	**-237**	**-111**
V. Расчеты Краткосрочные кредиты и займы (66)	710	1 871	1 730
Долгосрочные кредиты и займы (67)	720	56	49
Кредиторская задолженность	730	7 651	11 299
В том числе: расчеты с поставщиками и подрядчиками (60)	731	3 716	6 319
расчеты по оплате труда (70)	732	1 002	1 199
расчеты по прочим операциям с персоналом (71, 73)	733	86	63
расчеты по налогам и сборам (68)	734	696	1 225
расчеты по социальному страхованию и обеспечению (69)	735	404	417
расчеты с акционерами (учредителями) по выплате доходов (дивидендов) (75)	736	18	18
расчеты с разными дебиторами и кредиторами (76,62)	737	1 729	2 058
Прочие виды обязательств	740	-	
ИТОГО по разделу V	790	**9 578**	**13 078**
БАЛАНС	890	**21 913**	**28 157**

Отчет о прибылях и убытках
с 1 января 2006 г. по 31 декабря 2006 г.

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
1	2	3	4
I. Доходы и расходы по видам деятельности выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	10	**47 711**	**56 247**
Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	20	**6969**	**7950**
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей) (010-020)	30	**40 742**	**48 297**
В том числе бюджетные субсидии на покрытие разницы в ценах и тарифах	31		
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	40	**34 986**	**40 629**
Управленческие расходы	50		
Расходы на реализацию	60		
Прибыль (убыток) от реализации (030-040-050-060)	70	**5756**	**7668**
II. Операционные доходы и расходы Операционные доходы	80	**14 922**	**17 795**
Налоги, включаемые в операционные доходы	90	**12**	**7**
Операционные доходы (за минусом НДС, иных аналогичных обязательных платежей) (080-090)	100	**14 910**	**17 788**
В том числе: доходы, полученные от продажи активов (кроме ценных бумаг и иностранной валюты)	101	**234**	**177**
доходы от операций с ценными бумагами	102	**41**	**1601**
доходы от участия в уставных фондах других организаций	103		
прочие операционные доходы	104	**14 635**	**16 010**
Операционные расходы	110	**14 877**	**17 755**
В том числе: расходы, полученные от продажи активов (кроме ценных бумаг и иностранной валюты)	111	**173**	**89**
расходы от операций с ценными бумагами	112	**41**	**1601**
прочие операционные расходы	113	**14 663**	**16 065**
Прибыль (убыток) от совместной деятельности	120	0	0
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (100-110+120)	130	**33**	**33**
III. Внереализационные доходы и расходы Внереализационные доходы	140	**703**	**1244**
Налоги, включаемые во внереализационные доходы	150	**53**	**54**
Внереализационные доходы (за минусом НДС, иных аналогичных обязательных платежей) (140-150)	160	**650**	**1190**
Внереализационные расходы	170	**2425**	**1423**
Сумма источников собственных средств, направленная на покрытие убытков	180	**0**	**0**
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (160-170+180)	190	**-1775**	**-233**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) ЗА ОТЧЕТНЫЙ ПЕРИОД (+-070+-130+-190)	200	**4014**	**7468**
Налоги и сборы, производимые из прибыли	210	**1617**	**2020**
Расходы и платежи из прибыли	220	**4**	**98**
Сумма льготы по налогу на прибыль	230	**801**	
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) К РАСПРЕДЕЛЕНИЮ (+-200-210-220-230)	240	**1592**	**5350**

Генеральный директор Адамович Г.П.

Главный бухгалтер Козловский А.В.

Утерянное свидетельство индивидуального предпринимателя № 290224096, выданное Ганцевичским райисполкомом Брестской области на имя Печенкина Сергея Геннадьевича, **считать недействительным.**

Пенсійная рэформа

ПАЙСЦІ Ў «СВОЙ» ЧАС. ЦІ АТРЫМАЦЬ ПРЫБАЎКУ?

У Беларусі могуць змяніцца ўмовы прадастаўлення датэрміновых пенсій работнікам, якія занятыя ў «шкодных» умовах. Прынамсі, як паведаміў падчас выязнога «круглага стала» старшыня пастаяннай камісіі па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Сяргей Камянецкі, пачатак разгляду законапраекта «Аб прафесійным пенсійным страхаванні» запланаваны на вясновую сесію парламента. А ўжо ўвосень праект павінен прайсці другое чытанне.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«Шкоднае» месца — не назаўсёды?

Першая асаблівасць новага закона — змяненне прынцыпу фінансавання датэрміновых пенсій. Чакаецца, што ў будучым пенсіі па Спісу № 1 і Спісу № 2 (ад узнікнення права на іх і да дасягнення мужчынамі 60 ці жанчынамі 55 гадоў) павінны аплачвацца не за кошт агульных сродкаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва, а за кошт дадатковых узносаў «шкодных» прадпрыемстваў. Пры гэтым дадатковыя адлічэнні будуць назапашвацца на кожнага асобнага «датэрміноўшчыка» на рахунках у банках, упаўнаважаных на правядзенне дзяржаўных праграм. І, з мэтай абароны ад інфляцыі, індэксавацца па стаўцы рэфінансавання.

Зрэшты, галоўная адметнасць законапраекта «Аб прафесійным пенсійным страхаванні» ў іншым. Праект прадугледжвае, што датэрміновая пенсія асобам, якія працуюць на неспрыяльных вытворчасцях, да дасягнення агульнаўсталяванага ўзросту будзе выплачвацца толькі пры ўмове пераходу на іншую, «не шкодную» работу. Прычым, на думку распрацоўшчыкаў, падобная норма сама па сабе ў тым ліку сапраўды мае на ўвазе «падштурхнуць» частку грамадзян, якія занятыя на небяспечных для здароўя месцах, паступова іх пакідаць. А ў сваю чаргу гэта — пытанне павышэння працягласці жыцця.

Прычым тут жа нельга не заўважыць — непасрэдна Спіс № 1 і № 2 мяркуецца пакінуць без змяненняў. Аднак увядзенне дадатковага і да таго ж дыферэнцыяванага «прафесійнага» ўзносу па логіцы зацікавіць наймальнікаў укладваць сродкі ў мадэрнізацыю вытворчасцяў. І ў выніку прывядзе — да скарачэння колькасці працоўных месцаў, «шкоднасць» якіх пацвярджаецца атэстацыяй.

— Апроч таго, варта звярнуць увагу: канкрэтны чалавек-«датэрміноўшчык» па сутнасці не страціць нічога, — зазначае начальнік аддзела развіцця пенсійнай сістэмы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна Пагонышава. — У асобнага грамадзяніна, які выпрацаваў патрэбны спецыяльны стаж, ёсць тры варыянты. Па-першае, адразу пакінуць «шкодную» вытворчасць і скарыстацца правам на льготную пенсію ў поўным аб'ёме. Па-другое, чалавек можа застацца на рабоце з асаблівымі ўмовамі, па-ранейшаму мець, як правіла, высокую зарплату, і сапраўды не атрымліваць ільготную пенсію — аднак зноў-такі да моманту «развітання са шкодным месцам», што, як вядома, можа здарыцца нашмат раней наступлення агульнаўсталяванага ўзросту. І, нарэшце, варыянт трэці. Чалавек застаецца на шкоднай пасадзе да агульнаўсталяванага ўзросту. Выплата льготнай пенсіі ў такім выпадку яму не робіцца. Разам з тым дадатковыя адлічэнні, якія будзе рабіць наймальнік на гэтага работніка, не прападуць. Сродкі з «прафесійнага» рахунку будуць выплачвацца ў абавязковым парадку — у якасці «прыбаўкі» да пенсіі асноўнай.

Да слова, не выключана, што непасрэдна памер гэтай прыбаўкі будзе вызначаны ў бюджэт пражыткавага мінімуму пенсіянера. Прычым яе выплата стане рабіцца да моманту, пакуль не акажуцца вычарпанымі сродкі на «прафесійным» рахунку канкрэтнага «льготніка». Праўда, гэта — толькі адна з прапаноў. Прынамсі, адзначаюць у міністэрстве, канчатковага рашэння ў дадзеным выпадку яшчэ не прынята.

Галоўнае пытанне — кадры

ААТ «Гродна Азот» з'яўляецца адным з буйнейшых прадпрыемстваў айчыннай нафтахіміі. І адначасова прадпрыемствам адным з найбольш «шкодных». Бензол, аміяк, вадарод, шум, вібрацыя, інфрачырвонае выпраменьванне і, апроч таго, пастаянная рызыка выбухаў і пажараў. Як вынік, з 7,2 тысячы работнікаў таварыства «Гродна Азот» амаль палова занятая ў неспрыяльных умовах па Спісах № 1 і № 2. Прычым больш за 800 з іх працягваюць працаваць з адначасовым атрыманнем «ільготнай» пенсіі.

Зразумела, што сама неабходнасць дадатковых прафесійных пенсійных адлічэнняў — праблема. І ў тым ліку для па-сапраўднаму «моцных» заводаў. Разам з тым, мяркуюць на «Гродна Азоце», гэта «мінус» далёка не асноўны, тым больш, што прапануецца норма — наймальнік, які ліквідуе «небяспечныя» месцы, аўтаматычна пазбаўляецца неабходнасці рабіць адлічэнні на датэрміновыя пенсіі. Горш іншае. Паводле слоў генеральнага дырэктара Аляксандра Радзевіча, рашэнне аб прызначэнні пенсіі толькі работнікам, якія зменяць «шкодныя» ўмовы працы, можа прывесці да адчувальнага дэфіцыту кадраў. І да таго ж прадпрыемства рызыкуе страціць менавіта вопытных і высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Асобная тэма — механізм увядзення змен. У прыватнасці, адно з актуальных у дадзеным выпадку пытанняў — ці будуць распаўсюджвацца новыя нормы на цяперашніх пенсіянераў-«датэрміноўшчыкаў»? І, нарэшце, самы складаны момант — часовая страта магчымага даходу. 300 тысяч пенсіі нават пры зарплаце ў мільён — грошы ніколі не лішнія. Таму выпадае сумнявацца: законапраект не з'яўляецца адназначным, а яго разгляд будзе няпростым.

Прыняць нельга змяніць

Само паняцце «датэрміновая пенсія» з'явілася ў Савецкім Саюзе ў 30-х гадах мінулага стагоддзя з даволі канкрэтнай мэтай — прыцягнуць людзей на працоўныя месцы з цяжкімі ўмовамі і нізкай зарплатай. Прычым у 1956 годзе былі зацверджаны першыя варыянты «шкодных» прафесій — Спіс № 1 і Спіс № 2. Аднак з гэтага часу Спісы практычна не пераглядаліся. Між тым, зазначыла намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Марыяна Шчоткіна, за паўстагоддзе адбылася мадэрнізацыя вытворчасці, і адпаведна — змяншэнне «фактараў рызыкі» для здароўя.

Плюс да таго ўсё больш востра нагадвае аб сабе іншая праблема — дэмаграфічная. Беларуская пенсійная сістэма заснавана на прынцыпе салідарнасці, у прыватнасці, выплаты цяперашнім пенсіянерам забяспечваюцца за кошт адлічэнняў працуючых грамадзян. Разам з тым не сакрэт: першая катэгорыя становіцца ўсё большай, а другая — меншай. Прычым суадносіны «працуючыя — пенсіянеры» будуць пагаршацца і надалей.

Выйсцем з падобнай сітуацыі магло б стаць павышэнне пенсійнага ўзросту. Аднак, падкрэсліла Марыяна Шчоткіна, падобная мера адносіцца да катэгорыі звышнепапулярных, і на сёння з'яўляецца непрымальнай. Таму прапануецца іншы шлях — змены ўмоў прадастаўлення «льготных» пенсій. Пачатак тут ужо ёсць. Са жніўня мінулага года па агульнаму правілу работа пасля афармлення «датэрміновага адпачынку» не залічваецца ў стаж. Або, дакладней, залічваецца толькі ў выпадку не атрымання пенсіі.

Аднак гэта — толькі першы крок. Другім жа, мяркуюць у міністэрстве, мусіць стаць увядзенне накапляльнай прафесійнай мадэлі. Сапраўды, падлікі паказваюць, што сёння «вывад» ільгот з агульнага фонду дазволіць эканоміць усяго 4 працэнты агульных пенсійных грошай. Аднак толькі пакуль. У будучым, зноў-такі з улікам значнага павелічэння колькасці пенсіянераў, цяперашні паказчык эканоміі павінен узрастаць у прагрэсіі. А ў сваю чаргу гэта — рэзерв павышэння пенсій асобам, якія па аб'ектыўных прычынах не могуць працаваць. І ў тым ліку — цяперашнім «ільготнікам», для якіх рана ці позна пенсія акажацца адзінай крыніцай даходу.

— У параўнанні з іншымі краінамі былога Саюза, беларускі варыянт рэформы падаецца больш мяккім, — адзначае Марыяна Шчоткіна. — Так, у Латвіі, Літве і Казахстане пераўтварэнні скіраваныя на поўную ліквідацыю датэрміновых пенсій па ўмовах працы. У Кыргызстане, Таджыкістане і Азербайджане пераўтварэнні ідуць шляхам павелічэння неабходнага спецыяльнага стажу і скарачэння Спісу № 1, у Малдове цалкам скасаваны Спіс № 2 і робіцца прызначэнне «льготных» пенсій толькі пры ўмове пераходу на «няшкодныя» месцы. Што да Арменіі, Расіі і Украіны, то сёння тут распрацоўваюцца праекты, мэта якіх — пошук новых крыніц фінансавання датэрміновых пенсій і іх выплата выходзячы толькі з «мэтавых» накапленняў.

І ўсё ж, наколькі вялікая вераголнасць прыняцця Закона «Аб прафесійным пенсійным страхаванні» ў нашай краіне? Час да разгляду яго ў парламенце яшчэ ёсць, адпаведна, не выключаюцца пэўныя змяненні. Тым не менш, як паведаміў у гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» старшыня пастаяннай парламенцкай камісіі па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў Сяргей Камянецкі, хутчэй за ўсё, дэпутаты праект падтрымаюць, і прычым — у цяперашнім варыянце. Бо ў адваротным выпадку, зазначыў Сяргей Камянецкі, сама па сабе рэформа датэрміновых пенсій проста губляе ўсялякі сэнс.

Сяргей ГРЫБ.

Мінск—Гродна.

Школа падаткаплацельшчыка

Бацькі дзяцей-інвалідаў маюць права на дадатковую падатковую льготу

Мы працягваем адказваць на пытанні нашых чытачоў. Сёння рэдакцыі адказвае старшы дзяржаўны падатковы інспектар Міністэрства па падатках і зборах РБ Аляксандр ЗЯЛЕЎСКІ.

— Мая дачка атрымлівае першую вышэйшую адукацыю на платнай аснове. Летась я выдаткаваў на аплату яе навучання 2,5 млн рублёў. Даход дачкі складаў усяго 900 тысяч рублёў. Для атрымання сацыяльнага падатковага выліку ці абавязкова нам абодвум станавіцца на падатковы ўлік і падаваць падатковыя дэкларацыі? Можа дастаткова пральгаіраваць толькі мой даход?

Іван ПІНЧУК, *г. Брэст.*

— Сацыяльны падатковы вылік даецца ў памеры фактычна зробленых расходаў на навучанне непасрэдна плацельшчыку. Таму калі расходы на навучанне неслі непасрэдна вы і вашых даходаў для атрымання льготы дастаткова, то дачцэ станавіцца на дадатковы ўлік і запаўняць падатковую дэкларацыю не трэба. У выпадку, калі б вашы даходы былі меншыя, чым панесеныя выдаткі на навучанне, то сумай, якая засталася, магла б скарыстацца ваша дачка шляхам прадастаўлення падатковай дэкларацыі (разліку).

— Летась я набыла кватэру. Пры гэтым сума гэтай платы перавысіла мой даход і даход майго мужа за 2006 год. У інспекцыю па падатках і зборах я прадставіла копію дагавора куплі-продажу кватэры і ўсе квіткі аб плаце. Якім чынам я магу атрымаць вяртанне падатковага падатку ў 2007 годзе? Ці павінна падатковая інспекцыя па месцы жыхарства даць мне нейкія даведкі, якія я змагу прадставіць па месцы работы для таго, каб ажыццявіць вяртанне ўжо ў 2007 годзе недаатрыманых грошай?

Крысціна БУДА, *г. Мінск.*

— У падатковай інспекцыі па месцы жыхарства па вашаму арыгіналу дагавора куплі-продажу кватэры (пасля зверкі яго з копіяй) адказны работнік падатковага органа павінен паставіць штамп (адзнаку падатковага органа) і зрабіць запіс аб тым, у якім памеры прадастаўлены вылік і якая сума засталася непрыкладзіраванай. З арыгіналам дагавора вам трэба звярнуцца па месцы асноўнай працы для таго, каб у 2007 годзе атрымаць маёмасны падатковы вылік па месцы працы. Арганізацыя ў сваю чаргу павінна ўзгадніць суму астатку маёмаснага падатковага выліку, які быў не цалкам выкарыстаны ў 2006 годзе, з падатковым органам па месцы вашага жыхарства шляхам накіравання адпаведнага запыту.

— Выхоўваю сына ва ўзросце 8 гадоў і маю права на стандартны падатковы вылік у памеры дзвюх базавых велічынь. Чула, што ёсць яшчэ стандартны падатковы вылік у памеры 10 базавых велічынь. Хто мае права на такі вылік?

Алена ШЧУКА, *Гродзенская вобласць.*

— Мой сын мае дзіця-інваліда III групы па агульнаму захворванню. Ці мае сын дадатковую льготу па падатковаму выліку ў сувязі з гэтым?

Ларыса Іванаўна, *г. Лепель.*

— Права на стандартны падатковы вылік у памеры 10 базавых велічынь маюць асобныя катэгорыі грамадзян. Да гэтай катэгорыі адносяцца: фізічныя асобы, якія захварэлі і перанеслі прамянёвую хваробу, што была выклікана наступствамі катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, а таксама інваліды, у адносінах да якіх выяўлена прычынная сувязь інваліднасці з катастрофай на Чарнобыльскай АЭС; фізічныя асобы, якія прымалі ў 1986—1987 гг. удзел у работах па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС у межах зоны эксплуатацыі або ў гэты перыяд займаліся эксплуатацыяй або на іншых работах на гэтай станцыі; Героі Сацыялістычнай Працы, Героі Савецкага Саюза, Героі Беларусі, поўныя кавалеры ордэнаў Славы, Працоўнай Славы, Айчыны; фізічныя асобы — інваліды I і II груп незалежна ад прычын інваліднасці, інваліды з дзяцінства і дзеці-інваліды ва ўзросце да 18 гадоў; удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, а таксама асобы, якія маюць права на льготнае падаткаабкладанне ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 17.04.1992 г. «Аб ветэранах».

Калі вы з'яўляецеся маці дзіцяці да 18 гадоў, а таксама маеце дачыненне да пералічаных катэгорый грамадзян, то можаце атрымаць дадатковае права на стандартны падатковы вылік у памеры 10 базавых велічынь.

Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.

Непаўналетнія — па асобных правілах

З улікам па-сапраўднаму ранняй вясны масавыя палявыя работы распачаліся практычна ва ўсёй тэрыторыі Беларусі ўжо ў сакавіку. Між тым, не сакрэт: кожная пасяўная, як і жніво, традыцыйна лічыцца часам павышанай рызыкі. Толькі за апошнія пяць гадоў пры непасрэдным выкананні сваіх прафесійных абавязкаў у краіне загінулі 17 работнікаў сельскай гаспадаркі, і роўна столькі ж атрымалі цяжкія знявечанні. Пры гэтым, адзначаюць у дэпартаменце дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, практычна ўсе гэтыя здарэнні былі зусім «не абавязковымі».

Медагляд ідзе ў лад

Адной з асноўных прычын вытворчага траўматызму падчас пасяўной застаецца выкарыстанне няспраўнай ці разукамплектаванай тэхнікі. І ў прыватнасці, выхад у поле машын пры адсутнасці блакіровачных агароджанняў на іх рухомых частках. Аднак гэта толькі адна з па-сапраўднаму няпростых праблем. Другой, і не менш важнай, з'яўляецца так званы «чалавечы фактар». Каб папярэдзіць работу механізатараў і вадзіцеляў у стане алкагольнага ап'янення, існуе канкрэтнае патрабаванне — кожнае сельгаспрадпрыемства павінна праводзіць перадрэйсавыя медагляды. Аднак, як сведчыць практыка мінулых гадоў, гэта ўмова выконвалася не паўсюль.

— Перадрэйсавыя агляды павінны праводзіцца спецыялістамі, такім чынам, гаспадаркам неабходна або мець такіх спецыялістаў у сябе, або заключаць адпаведныя дагаворы з лячэба-прафілактычнымі ўстановамі, — зазначае начальнік упраўлення нагляду і кантролю дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Станіслаў Камінскі. — Зразумела, што гэта каштуе грошай. Аднак эканоміць тут нельга: у адваротным выпадку кіраўнікі пойдуць на прамое парушэнне заканадаўства і будуць несці адказнасць. Тым больш, што медыцынскія асведчанні скіраваны не толькі супраць парушальнікаў дысцыпліны. Апроч таго, яны дапамагаюць выявіць і своечасова адхіліць ад работы людзей, якія кепска сябе адчуваюць, да прыкладу, з-за павышанага ціску.

Працуе той, хто адпачне

У час пасяўной ці жніва працоўны дзень работнікаў сельскай гаспадаркі можа выходзіць за «стандартныя» 8-гадзінныя рамкі. Галоўнае тут — увайсці ў норму па выніках года, прасцей кажучы, зменшыць працоўны дзень узімку. Або дадаткова заплаціць за перапрацоўку.

Праўда, пры вызначэнні больш працяглага перыяду падчас пасяўной нельга забывацца на яшчэ адну ўмову — рэгламентаваныя адпачынкі. Інакш верагоднасць нясшчасных здарэнняў узрастае з прычыны звычайнай... стомы.

— Пры гэтым месцы адпачынку і харчавання непасрэдна ў полі павінны мець спецыяльныя абазначэнні, бо рашэнне механізатара ці вадзіцеля «паспаць паўгадзінкі ў стозе» можа прывесці да раптоўнага наезду тэхнікі на чалавека, — працягвае Станіслаў Камінскі. — І, дарэчы, адсутнасць спецыяльна адведзеных месцаў з'яўляецца грубым парушэннем правілаў аховы працы, што, згодна з новым Кодэксам аб адміністрацыйных правапарушэннях, цягне за сабой даволі адчувальныя санкцыі: штраф у памеры да 300 базавых велічынь у адносінах да наймальніка, і ад 20 да 50 базавых велічынь — у адносінах да канкрэтнай службовай асобы.

Ёсць небяспека — адмаўляйся

Яшчэ адна абавязковая ўмова — забеспячэнне работнікаў неабходнымі сродкамі індывідуальнай абароны. Пры гэтым, да прыкладу, занятасць у зонах радыяцыйнага забруджвання прадугледжвае варыянт выдачы адразу двух камплектаў спецадзення. У гэтым плане, адзначае Станіслаў Камінскі, апошнім часам наймальнікі становяцца ўсё больш законапаслухмянымі. Аднак, з улікам зноў-такі даволі розных фінансавых магчымасцяў, далёка не ўсе. Між тым, у падобных выпадках сітуацыя з бяспекай шмат у чым залежыць ад... саміх работнікаў.

— Працоўны кодэкс вызначае, што ў выпадку незабеспячэння сродкамі індывідуальнай абароны ці ўзнікнення рэальнай пагрозы жыццю здароўю работнік мае поўнае права адмаўляцца ад выканання тых ці іншых работ без якіх-небудзь наступстваў для сябе, — нагадвае Станіслаў Камінскі. — Пры гэтым у такіх варунках чалавеку павінна прадастаўляцца іншая, адпаведная яго кваліфікацыі, работа. Або, пры ўмове згоды, — работа з аплатай не ніжэй сярэдняга заробку па ранейшым месцы.

Пачаўся дождж — шукай укрыцце

Нарэшце, таксама няпростая тэма — удзел у масавых сельгаспрацах школьнікаў і навучэнцаў. У прынцыпе, пры дасягненні падлеткай 14-гадовага ўзросту гэта дапускаецца. Аднак тут дзейнічаюць асаблівыя правілы. Так, непаўналетнія ні ў якім разе не павінны працаваць у начны час, звышурочна, а таксама ў выхадныя дні. Плюс да ўсяго, існуюць значныя абмежаванні непасрэдна па відах работ.

— Варта памятаць, што падлеткаў катэгарычна забаронена прыцягваць не толькі да работ з ядахімікатамі, але і да работ у месцах знаходжання часовых ці стацыянарных сховішчаў хімічных сродкаў абароны раслін і мінеральных удабрэнняў, а таксама — да работ на адлегласці менш за 5 кіламетраў ад палёў, дзе нядаўна выкарыстоўваліся ядахімікаты і пестыцыды, — падкрэслівае Станіслаў Камінскі. — Да таго ж нялішне нагадаць: падлеткаў да 17 гадоў без дакументаў на права кіравання ні ў якім разе нельга «саджаць» на трактары ці іншую сельгастэхніку. Выключэнне тут можа рабіцца толькі для маладых людзей, якія закончылі курс навучання па прафесіі механізатар і атрымалі правы. Аднак работа такіх непаўналетніх магчыма толькі пад кіраўніцтвам больш вопытных настаўнікаў.

І яшчэ. Як зазначаюць у дэпартаменце, работа вучняў і навучэнцаў ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў можа працягвацца не больш за 4, а ва ўзросце ад 16 да 18 гадоў — не больш за 6 гадзін у дзень. І да таго ж не апошнюю ролю тут павінны адыгрываць... умовы надвор'я. Непаўналетнія не могуць працаваць пры тэмпературы ніжэй 10 і вышэй 25 градусаў цяпла, а таксама ў дождж ці ў снег. Прычым на выпадак ападкаў на палях павінны быць абавязкова прадугледжаны часовыя ўкрыцці.

Сяргей ГРЫБ.

БЯСПЛАТНАЕ ХАРЧАВАННЕ ДЛЯ МАЛЫШОЎ — ПА-НОВАМУ

(Заканчэнне. Пачатак на 5-й стар.)

Рашэннем Савета Міністраў дзеючы крытэрый патрэбнасці павялічаны да 60 працэнтаў бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва (у лютым бягучага года гэты крытэрый быў роўны Br102,3 тыс.). Такім чынам, «планка» патрэбнасці ўзнята амаль удвая.

Бясплатнае забеспячэнне прадуктамі харчавання ажыццяўляецца з месяца падачы заявы на кожныя шэсць каляндарных месяцаў да дасягнення дзіцем двухгадовага ўзросту (уключаючы месяц спаўнення дзіцяці двух гадоў) пры ўмове, што сярэднедушавы даход сем'яў у месяц не перасягае крытэрый патрэбнасці. Рашэнне аб бясплатным забеспячэнні прадуктамі харчавання прымаецца камісіяй па аказанню адраснай сацыяльнай дапамогі. Склад сям'і вызначаецца на дату падачы заявы. Пры разліку сярэднедушавога даходу сям'і ў яго ўключаюцца бацькі дзіцяці (маці, бацька, мачаха, айчым), а таксама непаўналетнія дзеці, якія знаходзяцца на выхаванні ў сям'і, і пражываючыя разам з бацькамі іх непрацаздольныя паўналетнія дзеці.

Трэба адзначыць, што ў склад сям'і не ўключаюцца бацькі, якія з'яўляюцца ваеннаслужачымі тэрміновай службы, курсантамі ваенных навучальных устаноў, устаноў адукацыі МУС, МНС і КДБ, а таксама бацькі, якія адбываюць пакаранне ў месцах пазбаўлення волі або знаходзяцца на прымусовым лячэнні. Не ўключаюцца ў склад сям'і і дзеці, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні. Сукупны даход сям'і вылічваецца за шэсць каляндарных месяцаў, якія папярэднічаюць месяцу звароту за бясплатным харчаваннем. Сярэднедушавы даход сям'і вызначаецца шляхам дзялення сукупнага даходу ўсіх членаў сям'і на шэсць месяцаў і на колькасць членаў сям'і, улічаных у яе складзе.

Калі раней бацькам, якія прэтэндавалі на атрыманне бясплатнага дзіцячага харчавання, трэба было звяртацца ў паліклініку, то з красавіка гэтага года — у раённае, гарадское ўпраўленне (аддзел) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства або ў тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва (калі цэнтр надзелены правамі разгляду такіх заяў). Пры падачы заявы прад'яўляюцца пашпарт або іншы дакумент, які засведчвае асобу. Да заявы прыкладаюцца наступныя дакументы і іх копіі: пасведчанне аб нараджэнні дзіцяці; пасведчанне аб шлюбе — для бацькоў, якія знаходзяцца ў шлюбе; рашэнне суда аб скасаванні шлюбу або пасведчанне аб скасаванні шлюбу — для бацькоў, якія скасавалі шлюб; працоўная кніжка — для непрацуючых членаў сям'і, пры яе наяўнасці; пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі індывідуальнага прадпрымальніка — для бацькоў, якія з'яўляюцца ІП; пенсіённае пасведчанне — для бацькоў, якія атрымліваюць пенсію; пасведчанне інваліда — для бацькоў-інвалідаў; даведка аб нараджэнні дзіцяці — для жанчын, якія нарадзілі дзіця па-за шлюбам, калі звесткі пра бацьку дзіцяці ў кнізе рэгістрацыі актаў аб нараджэнні зроблены па называнню маці; даведка аб фактычна атрыманых даходах кожнага члена сям'і за апошнія шэсць каляндарных месяцаў; дакументы, якія пацвярджаюць суму атрыманых аліментаў.

Спецыялісты органаў па працы, занятасці і сацабароне або цэнтра сацабслугоўвання насельніцтва на працягу пяці рабочых дзён з дня падачы заявы і неабходных дакументаў запытваюць даведкі з месца жыхарства і аб складзе сям'і, даведкі аб памерах пенсій і дапамог, якія атрымліваюцца, калі ў склад сям'і ўключаны пенсіянеры і беспрацоўныя. Але бацькі маюць права і самастойна прадставіць гэтыя дакументы. На падставе атрыманых дакументаў праводзіцца разлік сярэднедушавога даходу сям'і і рыхтуецца праект адпаведнага рашэння. Камісія прымае станоўчае рашэнне або адмаўляе ў бясплатным забеспячэнні прадуктамі харчавання (з выкладаннем прычын адмовы) на працягу пяці рабочых дзён з даты паступлення дакументаў. Не пазней за тры каляндарныя дні копіі рашэння камісіі накіроўваюцца ў дзяржаўную арганізацыю аховы здароўя па месцы жыхарства дзіцяці і аднаму з яго бацькоў. Пры гэтым бацьку паведамляецца аб необходнасці звароту за рэцэптам да ўчастковага ўрача (урача-педыятра) па месцы жыхарства дзіцяці, а таксама аб магазінах, якія ажыццяўляюць бясплатны водпуск прадуктаў харчавання.

Бясплатнае забеспячэнне прадуктамі харчавання дзяцей першых двух гадоў жыцця спыняецца ў выпадку адмовы бацькоў ад дзіцяці, змяшчэння дзіцяці ў дзіцячую інтэрнатную або дашкольную ўстанову з кругласутачным рэжымам знаходжання, смерці дзіцяці з месяца, наступнага за месяцам надыходу названых абставін. Бацькі абавязаны паведаміць упраўленню (аддзелу) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне або цэнтр сацабслугоўвання аб гэтых абставінах на працягу пяці рабочых дзён. Калі гэта не будзе зроблена, сума кошту залішне атрыманых прадуктаў падлягае вяртанню. У выпадку адмовы добраахвотна вярнуць гэтыя сумы, іх спагнанне праводзіцца ў судовым парадку.

«Участковы ўрач (урач-педыятр) на працягу трох рабочых дзён з дня атрымання копіі рашэння камісіі вызначае колькасць рэкамендуемых прадуктаў харчавання з разліку месячнай нормы ў адпаведнасці з прыкладным сутачным наборам прадуктаў харчавання для дзяцей першага і другога года жыцця і выпісвае неабходнае харчаванне на месяц на рэцэптурным бланку, які выдаецца аднаму з бацькоў, — сказала субяседніца. Пры выдачы рэцэпта таты або мамы інфармуюцца аб магазінах, дзе яны могуць атрымліваць бясплатнае харчаванне для сваіх дзяцей».

Алена ПРУС, БЕЛТА.

Работа в теплице (в Польше)

Наш адрес:
Огородное хозяйство
Janów 14, 05-480 Karczew,
Polska / Польша.

Тел. для контактов:
+48-668-136-776
E-mail:info@tomatojtm.pl
Факс: +48-22-780-84-08.

Работаем через агентства Беларуси соответствующего профиля, имеющие необходимые разрешения и лицензии.

Годовой баланс Общества с ограниченной ответственностью «Форвард-Брокер» за 2006 год

220039 г. Минск, ул.Воронянского, 7а, 8 этаж, каб. № 35
тел./факс (017)222-76-63, 222-80-69

(в тысячах белорусских рублей)

АКТИВ	Код строки	На начало отчетного года	На конец отчетного года
1	2	3	4
Основные средства	110	38788,2	59765,1
Нематериальные активы	120	-	242,7
Запасы и затраты	210	3719,9	7965,9
Дебиторская задолженность	250	1967,2	39,0
Финансовые вложения	260	61848,9	70920,5
Денежные средства	270	10982,9	23287,6
БАЛАНС		**117307,1**	**162220,8**

ПАССИВ	Код строки	На начало отчетного года	На конец отчетного года
1	2	3	4
Уставный фонд	510	2740,0	5480,0
Добавочный фонд	530	37643,7	58723,0
Нераспределенная прибыль	540	20570,7	87989,5
Расходы будущих периодов	620	-390,7	-87,5
Кредиторская задолженность	730	56743,4	10115,8
БАЛАНС		**117307,1**	**162220,8**

Отчет о прибылях и убытках Общества с ограниченной ответственностью «Форвард-Брокер» за 2006 год

(в тысячах белорусских рублей)

Наименование показателя	Код строки	2006 год	2005 год
1	2	3	4
I. Доходы и расходы по видам деятельности Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	292191,1	149568,6
Налоги, включаемые в выручку от реализации	020	8765,7	5833,2
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг за минусом налогов, акцизов и т.д.	030	283425,4	143735,4
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	040	180249,6	103734,5
Прибыль от реализации	**070**	**103175,8**	**40000,9**
II. Операционные доходы и расходы			
Операционные доходы	080	8938,2	937,3
в т.ч.: - доходы от операций с ценными бумагами	102	8927,6	928,5
- прочие операционные доходы	104	10,6	8,8
Операционные расходы	110	1159,9	485,3
в т.ч.: - расходы от операций с ценными бумагами	112	1159,9	485,3
Прибыль от операционных доходов и расходов	**130**	**7778,3**	**452,0**
III. Внереализационные доходы и расходы			
Внереализационные доходы	140	1,7	20,5
Внереализационные расходы	170	3979,3	500,1
Убыток от внереализационных доходов и расходов	**190**	**-3977,6**	**-479,6**
ИТОГО прибыль за отчетный период	**200**	**106976,5**	**39973,3**
Налоги и сборы из прибыли	210	25057,2	5587,4
Сумма льготы по налогу на прибыль	230	14500,5	22091,8
ПРИБЫЛЬ К РАСПРЕДЕЛЕНИЮ	**240**	**67418,8**	**12294,1**

СПРАВКА. Расшифровка отдельных внереализационных доходов и расходов.

(в тысячах белорусских рублей)

Наименование показателя	Код строки	На конец отчетного периода	
		Доходы	Расходы
1	2	3	4
Курсовые и суммовые разницы	174	1,7	10,1
Благотворительная помощь	175	-	600,0
Прочие доходы и расходы	178	-	3369,2

Достоверность баланса и отчета о прибылях и убытках частного страхового брокерского унитарного предприятия «Форвард-Брокер» подтверждена аудитором-предпринимателем Ткач Светланой Ивановной (лицензия на осуществление аудиторской деятельности № 02200/0060292 от 03/02/2004 выдана Министерством финансов Республики Беларусь).

Аудиторское заключение аудитора индивидуального предпринимателя Ткач Светланы Ивановны по бухгалтерской (финансовой) отчетности

«По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность ООО «Форвард-Брокер» достоверна, то есть подготовлена таким образом, чтобы обеспечить во всех существенных аспектах отражение активов и пассивов ООО «Форвард-Брокер» по состоянию на 1 января 2007 года и финансовых результатов его деятельности за 2006 год».

ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА II КВАРТАЛ 2007 ГОДА З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

Чарнобыль ИНФОРМ

Местное самоуправление — газета для выбарчыкаў і дэпутатаў мясцовых саветаў

Своя справа — бізнес, эканоміка, фінансы

Жыравандоля — наш культурны асяродак

Чырвоная змена

Купі лепшае! — тавары, паслугі, цэны

Краіна здароўя

ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	7700 рублёў на месяц 23100 рублёў на квартал
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	7450 рублёў на месяц 22350 рублёў на квартал
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	11000 рублёў на месяц 33000 рублёў на квартал
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	10020 рублёў на месяц 30060 рублёў на квартал
ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ» ПРАЗ «МІНГАРСАЮЗДРУК»	63850	6970 рублёў на месяц 20910 рублёў на квартал
	63145	6350 рублёў на месяц 19050 рублёў на квартал
	63858	7043 рублі на месяц 21129 рублёў на квартал

ХУТКА НЕРАСТ. АЛЕ ДЛЯ РЫБАЛОВАЎ ЁСЦЬ ПАСЛАБЛЕННІ

Згодна з Правіламі вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства, з 1 красавіка па 30 мая ў мэтах захавання рыбных рэсурсаў і стварэння спрыяльных умоў для іх аднаўлення падчас веснавога нерасту забараняецца лоўля ўсіх відаў рыбы.

Разам з тым Правілы дазваляюць аматарскае рыбалоўства адной паплаўковай вудай з адным кручком на рыбалова або спінінгам у светлы час сутак з берага. Але пры гэтым трэба памятаць, што ў дзень на чалавека можна здабываць не больш за 5 кілаграмаў рыбы (за выключэннем экзэмпляра, які можа перавысіць гэтую лічбу), пры гэтым кіравацца прамысловай мерай для кожнага віду рыбы (выпускаць экзэмпляры, меншыя за вызначаную прамысловую меру). Нагадаем таксама

Раунэль НАВАЕС (злева) каментуе работу беларускага стыліста Анатоля ЛАЗАРАВА.

«ШЭФ-ЦЫРУЛЬНІКІ» Ў БЕЛАРУСІ

Нашу краіну ўпершыню наведаў знакаміты іспанскі прафесіянал цырульніцкага мастацтва Раунэль Наваес з майстар-класамі для беларускіх стылістаў і цырульнікаў.

Новую модную калекцыю «Барока», у якой адлюстроўваюцца падыходы да сучасных прычосак, прыехалі паглядзець не толькі мінскія стылісты, але і цырульнікі з Віцебска, Магілёва, Брэста. Новая калекцыя — гэта дэманстрацыя жаночага гарманічнага вобраза. «Сюды мы прыйшлі не толькі палюбавацца шоў, — дзеляцца са мною цырульнікі, — але ўзяць нешта цікавае і для сябе, бо з такімі прычоскамі заўсёды можна выйсці на вуліцу» . І сапраўды, калекцыя ўражвае сваёй «прастатой» і густам.

— Прафесійныя майстар-класы такога ўзроўню ў нашай краіне яшчэ не праходзілі, — расказвае супрацоўнік кампаніі «Revlon profession» у Беларусі Ірына Бараусава. — Вельмі прыемна, што новую калекцыю, якая была паказана яшчэ толькі ў дзвюх краінах, Раунэль Наваес адразу прывёз ў Беларусь. Ён вельмі задаволены ўзроўнем падрыхтаванасці нашых стылістаў. Толькі нам яшчэ ёсць куды імкнуцца!

Сам Наваес, які, дарэчы, таксама і стыліст міжнароднай школы стылю ў Германіі, Швейцарыі, Францыі, Іспаніі, дадае:

— Я прыехаў падымаць узровень беларускіх цырульнікаў. Раней жа былі повары, а зараз — шэф-повары. Дык вось я хачу, каб тут былі не проста цырульнікі, а шэф-цырульнікі!

Гэтым летам Раунэль Наваес зноў планае наведаць Беларусь з новай калекцыяй, якая, паводле яго слоў, уразіць абсалютна ўсіх.

Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара.

Інфарм-укол

АЛЕРГІЯ НА ПАЛКАНА

Ужо даўно даказана, што кошкі вылучаюць асаблівыя ферменты, якія правакуюць астматычныя прыступы. Аднак і сабакі — не зусім бяскрыўдныя ў гэтым сэнсе істоты.

Амерыканскія медыкі даследавалі 809 астматыкаў і прыйшлі да наступнай высновы: хоць алергія на сабак сустракаецца радзей, яе прыступы — больш моцныя і працяглыя.

БАСЕЙН НЕБЯСПЕЧНЫ ДЛЯ ЛЁГКІХ

Як вядома, для дэзінфекцыі вады ў басейнах выкарыстоўваецца хлор. Аматары паплаваць павінны памятаць, што трыхларамін, які вылучаецца з яе, небяспечны для лёгкіх.

Мікрачасціцы хлору наносяць такую ж шкоду, як цыгарэты і забруджанае выхлапамі паветра. Асабліва разбуральна яны ўплываюць на дзіцячыя лёгкія. Пры гэтым небяспека інтаксікацыі існуе толькі ў закрытых басейнах, паколькі ў адкрытых трыхларамін выпарваецца ў атмасферу. Калі моцны пах хлору выклікае ў вас рэзі ў вачах і сухасць у горле — ведайце, што гэта першыя прыкметы таксічнага ўздзеяння шкодных мікрачасціц.

ХАЧУ ПАЖАДАЦЬ...

Добры дзень, родныя словы!

Дарагі чытач, вы, напэўна, не раз чулі: «**Жадаю** сказаць», «**Жадаю** пачуць» і нават «**Жадаю** цукерак». Як бы забылі людзі простае слова «**хачу**».

А, між тым, яшчэ са сваёй 127-гадовай даўніны «Слоўнік беларускай гаворкі» Івана Насовіча напамінае нам, што **жадаць** — гэта «страстно хотеть» (а не проста **хацець**). А якраз у гэтым апошнім значэнні **хацець** у нас падчас неабдумна і ўжываюць слова «**жадаць**», забываючы, што ў жадаць ёсць і найбліжэйшы паплечнік-заменнік **прагнуць** (моцна хацець).

Гэтае (большае, чым проста хацець) значэнне ў слова **жадаць** ажывае і ў некаторых фразеалагізмах, такіх, як «колькі душа жадае (пажадае)» — нароўні з яго варыянтам «Колькі душа прымае (прыме)» — гэта значыць, без усялякага абмежавання, уволю, удосталь, напрыклад, **есці**. У тым жа шэрагу, дзе, скажам, у дачыненні есці стаяць і іншыя падобныя рупліўцы — фразеалагізмы: **еш не хачу, колькі ўлезе, на поўную (усю) губу, хоць жывот распаражы, хоць распаражыся, як на дзяды, за трох дурных** і г.д. — з гумарам і ўсур'ёз.

Да няправільнага ўжывання **жадаць** у значэнні **хацець** далучылася, відаць, і калькаванне з далёка не ўзорнай рускай мовы ў некаторых выданнях, дзе таксама замест **хотеть** настырна лезе **желать**.

Прывяду некалькі няўдалых прыкладаў з «Комсомольской правды», «Смены» і інш., якія крытыкуюцца ў даведніку журналіста «Трудности русского языка» пад рэдакцыяй Л.І. Рахманавай (Изд. Московского университета, 1981, стар. 119): «Судя по всему, он **желает** [следует: *хочет*] стать спринтером высокого класса». «Я в будущем **желаю** [следует: *хочу*] специализироваться и повышать квалификацию в области свиноводства». «Отпускной месяц дается раз в году, и каждый волен провести его как **желает** [следует: *хочет*]».

У рускай мове ў дзеяслова **желать** большае пашырэнне, чым у беларускага **жадаць**, яшчэ і таму, што некаторыя формы, напрыклад, дзеепрыслоўі, ад **хотеть** у рускай мове не ўжываюцца. Вось звычайны беларускі сказ: «Я, хочучы дапамагчы, падышоў да яго» не перакладзеш даслоўна: «Я, **хотя** помочь, подошёл к нему». Тут міжволі папросіцца «*желая*».

Або ці не даводзілася вам чуць на сходах такія рускія прастамоўі: «Кто **желает** высказаться?». А старшыня сходу, напэўна, якраз думаў, што ён вядзе сход узорна па-руску.

Або ў цырульні — лісліва-ўгодліва, яшчэ дарэвалюцыйнае: «Желаете побриться?». Ці з-за прылаўка: «Что вы желаете?».

Таму простая засцярога: перш, чым ужыць слова **жадаць**, зважайце, ці не лепш тут гучыць **хацець**, вядома ж, памятаючы і пра напамін І. Насовіча.

А рускія фразеалагізмы перакладаюцца адпаведнымі беларускімі: **«и знать не желает» — «і слухаць не хоча»...**

Затое як добра пачуваецца дзеяслоў **жадаць** у значэнні **сычыць**! Як добра гучыць ён у застоллях! Хіба магла б, здаецца, абысціся без яго наша славутая даваенная песня «Бывайце здаровы» з яе пажаданнем, якое і сёння гучыць вельмі надзённа:

Яшчэ вам **жадаем**
Прыбытку у хаце —
Не мала, не многа —
Штогод па дзіцяці.
Не будзе вам крыўды
Яшчэ і за тое,
Калі пашанцуе
На год і па двое.

Дзякаваць Богу, што сёе-тое з гэтага пажадання і спраўджваецца. (Як паведамляла БЕЛТА, летась у Беларусі нарадзілася 828 двайнятак, 13 трайнятак, а ў Жлобіне... як тут лепш сказаць, бо, здаецца, і слова адпаведнага напашэве не знаходзіцца — і адны чацвераняткі!).

Вядома ж, гэтыя словы **жадаць, пажадаць** разам са словам **сычыць** цудоўна прыдаюцца на юбілейных урачыстасцях, дзе звычайна юбіляру шчодра жадаюць пражыць аж 100 гадоў. Праўда, наш вядомы паэт, празаік, гісторык, выдавец «Беларускага кнігазбору» Кастусь Цвірка на гэта пры нагодзе з дасціпам заўважыў: «А навошта абмяжоўваць Божую ласку? Можа, Бог дасць мне пражыць і 120 гадоў!..».

А пад канец згадаю і яшчэ дасціпадказ аднаго знаёмага на маё прывітанне, як яму адзначалася сёлетняе чатырохдзённае свята 8 Сакавіка: «Выпіў больш, чым мог, але менш, чым **хацеў**...». Значыцца, выпіта не па-беларуску шмат, але сказана вельмі па-беларуску. Бо гумар — адна з самых яскравых рысаў беларускага характару.

Рубрыку вядзе Анатоль КЛЫШКА.

Анталогія беларускай песні

Вясною 1995 года Алесь Петрашкевіч прапанаваў Міхасю Башлакову і Марыне Марозавай напісаць песні да спектакляў, якія рыхтавалі народныя тэатры паводле яго п'есы «Дагарэла свечка...». Драматург нават вызначыў музычна-вобразную канву вакальных твораў — у традыцыях народнай працяжнай песні. Песні атрымаліся вельмі меладычныя і амаль адразу фальклярызаваліся (адна з іх — «Лілея на цёмнай вадзе» змешчана ў «Звяздзе» за 4 мая 1996 года). Яны гучаць паўсюль на Гомельшчыне і асабліва ў дні, калі ладзяцца святы беларускай паэзіі. Многія святочныя мерапрыемствы адбываюцца ў вёсцы Грабаўка Гомельскага раёна — на радзіме Міхася Башлакова. Песню «Каліначка» запісала Таццяна Моўчан.

Міхась ШАВЫРКІН.

КАЛІНАЧКА

Верш Міхася БАШЛАКОВА Музыка Марыны МАРОЗАВАЙ

Што ж ты, каліначка,
Цветам убралася,
Што ж ты, дзяўчыначка,
Засумавалася?
Ой, да, ой, да
Засумавалася.

Ветры усхопяцца —
Цвет пазрываецца.
Слёзы накоцяцца,
Сэрца параніцца.
Ой, да, ой, да
Сэрца параніцца.

Лісцейка восені
Падае золкае.
Ягады познія
Самыя горкія.
Ой, да, ой, да
Самыя горкія.



Валянцінкай ТОЛЬКІ БОГ?..

Анекдот ёсць... Пад канец мінулага веку па нашых (тады савеціх яшчэ) дарогах, высокае замежнае начальства ехала. І з прыгодамі, бо пастаянна, то тут, то там даводзілася скідваць скорасць, а то і наогул — збочваць. «Нічога не зробіш», — разумелі госці, — рамонт.

Праз год-другі прыехалі яшчэ раз. Бачаць — на тых самых дарогах акурат той самы малюнак...

Тады яны (па разліку ці дабраце душэўнай) дапамагчы рашылі — з прапановай выступілі. Можам, маўляў, камандзіраваць да вас нашых спецыялістаў, і вы — раз і назаўсёды — пазбавіцеся ад праблем з дарогамі.

Наша кіраўніцтва прапанову гэтую вывучыла, падзякавала і ім адказала, што мы, маўляў, таксама можам — камандзіраваць да іх... нашых спецыялістаў. І тады ўжо яны раз і назаўсёды пазбавяцца ад праблемы... беспрацоўя.

Да кансенсусу, відаць, так і не прыйшлі, бо...

Шаша. Палова перакрыта — рамонт. Пад адпаведным знакам паслухмяна, прывычна скідваем скорасць, ледзьве паўзём. І пры гэтым... даганяем нейкі старэнькі, ледзь жывы «керагаз». Бензін з яго ледзь не жыўцом гоніць: дыхаць няма чым. І не аб'едзеш, бо правыя колы той (з дазволу) машыны — на адной паласе, левыя — на другой... «Міргаем» фарамі, каб ці туды, ці сюды ўжо — «не бачыць», сігналім — «не чуе»...

Абмінаючы, хацелі паглядзець на «вадзілу» і за рулём — ледзь разгледзелі: хлапчаня — дробненькае, маладзенькае...

І паўбяды было б, калі б везла яно толькі сябе, а то «кітайскае насельніцтва» ў салоне: «шашачкі» на «борце» — «таксуе» хлопец, насельніцтву паслугі аказвае!

...За што змагаліся, як кажуць. Канулі ў вечнасць чэргі на таксі: машын сёння хоць адбаўляй. Адкуль? Са старых праверэных часам, дзяржаўных таксапаркаў, з недзяржаўных фірмаў, «іпэшных» з ліцэнзіямі, без іх...

Адпаведна, пасажыры (што, зразумела, добра!), могуць выбіраць, з кім куды ехаць, каму плаціць, у якую машыну садзіцца, а ў якую не...

І ўсё ж, як на мой (мо недасведчаны, погляд?), добра было б, каб папярэдне, **да іх**, нехта яшчэ (прычым вельмі адказна, кваліфікавана!) праверыў тэхнічны стан той машыны, пераканаўся ў прафесійнай падрыхтоўцы, у майстэрстве вадзіцеля.

Ці рынак цяпер?

А значыць, выратаванне тапельцаў справа рук саміх жа тапельцаў і сцеражонага толькі Бог сцеражэ?

Свят-свят-свят, да пары?..

Валянціна ДОЎНАР.

Надвор'е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА	+12 — +14 °C	МАСКВА	+10 — +12 °C
ВІЛЬНЮС	+12 — +14 °C	РЫГА	+13 — +15 °C
КІЕЎ	+12 — +14 °C	С-ПЕЦЯРБУРГ	+8 — +10 °C

Без ападкаў

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.56	19.35	12.39
Віцебск —	6.45	19.26	12.41
Магілёў —	6.46	19.25	12.39
Гомель —	6.44	19.21	12.37
Гродна —	7.12	19.50	12.38
Брэст —	7.13	19.50	12.37

Месяц

Першая квадра 25 сакавіка.
Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Венядзікта, Расціслава;*
К. *Лідзіі. Бенядыкта, Мацея, Эрнеста, Яна.*

27 сакавіка

Дзве даты

1267 год — паводле звестак Магілёўскай хронікі, заснаваны горад Магілёў. 430 гадоў таму, у **1577 годзе,** Магілёў атрымаў магдэбургскае права, адначасова яму быў дадзены першы афіцыйны герб — «вежа мурована высоко выведеная».



1854 год — Англія і Францыя аб'явілі вайну Расіі. Пачатак Крымскай вайны за панаванне на Блізкім Усходзе. Ваенная і эканамічная адсталасць феадальнай Расіі абумовіла і яе паражэнне.

Цытата дня

«Ці змог бы хлопчык, якім вы былі, ганарыцца тым мужчынам, якім вы сталі?»
Лорэнс Пітэр.

Усміхнёмся!

— Гэтым летам, Ваван, паеду ў адпачынак на бязлюдны востраў! Пяць гадоў там не быў!

— А жонцы гэтая ідэя спадабаецца?

— Яшчэ як спадабаецца! Яна, мабыць, там за гэтыя гады вельмі па мне сумавала!

☺

Сапраўдны сябар правяраецца грашыма, жанчынамі і свабоднай кватэрай.

☺

Маршрутка. Адна з пасажырак — бабулька, у якой раптам нешта вывалілася з сумкі. Вадзіцель жартуе:

— Што ўпала, тое ўсё маё!

Бабулька:

— Ты едзь сабе ціхенька, а то я зараз упаду і буду ўся твая!

Бухгалтерский баланс на 01.01.2007 г.
Минского обувного открытого акционерного общества «Луч»

Актив	Сумма млн. руб.	Пассив	Сумма млн. руб.
I. Внеоборотные активы		**III. Источники собственных средств**	
Основные средства	30 177	Уставный фонд	697
Нематериальные активы	4	Резервный фонд	174
Вложения во внеоборотные активы	318	Добавочный фонд	32 958
Итого по разделу I	30 499	Нераспределенная прибыль	1 393
II. Оборотные активы		Итого по разделу III	35 222
Запасы и затраты	633	**IV. Доходы и расходы**	
Налоги по приобретенным ценностям	91	Расходы будущих периодов	-370
Готовая продукция и товары	667	Доходы будущих периодов	18
Товары отгруженные, выполненные работы, оказанные услуги	1 519	Итого по разделу IV	-352
		V. Расчеты	
Дебиторская задолженность	1 238	Краткосрочные кредиты и займы	509
Финансовые вложения	1 706	Кредиторская задолженность	1 072
Денежные средства	98	Итого по разделу V	1 581
Итого по разделу II	5 952	**Баланс**	**36 451**
Баланс	**36 451**		

Отчет о прибылях и убытках за 2006 год
Минского обувного открытого акционерного общества «Луч»

Наименование показателей	Сумма млн. руб.	Наименование показателей	Сумма млн. руб.
I. Доходы и расходы по видам деятельности		Операционные расходы	800
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	6 822	в том числе: расходы, полученные от продажи активов (кроме ценных бумаг и иностранной валюты)	5
Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	1 180	расходы от операций с ценными бумагами	795
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных обязательных платежей)	5 642	Прибыль от операционных доходов и расходов	287
		III. Внереализационные доходы и расходы	
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	3 676	Внереализационные доходы	43
Управленческие расходы	856	Налоги, включаемые во внереализационные доходы	5
Расходы на реализацию	177	Внереализационные доходы (за минусом НДС, иных аналогичных обязательных платежей)	38
Прибыль от реализации	933	Внереализационные расходы	304
II. Операционные доходы и расходы		Прибыль от внереализационных доходов и расходов	-266
Операционные доходы	1 089	**Прибыль за отчетный период**	**954**
Налоги, включаемые в операционные доходы	2	Налоги и сборы, производимые из прибыли	453
Операционные доходы (за минусом НДС, иных аналогичных обязательных платежей)	1 087		
в том числе: доходы, полученные от продажи активов (кроме ценных бумаг и иностранной валюты)	11	Расходы и платежи из прибыли	-7
доходы от операций с ценными бумагами	797	**Прибыль к распределению**	**508**
доходы от участия в уставных фондах других организаций	279		
прочие операционные доходы			

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	млн.руб.	63	68
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	рублей	90	97
Обеспеченность акции имуществом общества	тыс.руб.	50	42
Количество простых акций, находящихся на балансе общества	штук	-	-
Просроченная дебиторская задолженность	млн.руб.	1317	1323
Просроченная кредиторская задолженность	млн.руб.	176	192

Количество акционеров, всего — 7285, в т.ч.: юридических лиц — 6, физических лиц — 7279.
Среднесписочная численность работающих (человек) — 73.

Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг — сдача в наем имущества.

Генеральный директор Н.Ф. Стриж
Главный бухгалтер В.А. Тарасенко

27 сакавіка — Міжнародны дзень тэатра

ЛІЧБЫ МАСТАЦТВА

Тэатр — гэта задавальненне. Не толькі для гледача. Дзяржава сёння падтрымлівае 28 тэатраў краіны, на фінансаванне іх новых пастановак за год накіравана 400 мільёнаў беларускіх рублёў, паведаміў журналістам Першы намеснік Міністра культуры Беларусі Уладзімір Рылатка. Калі падзяліць на дваццаць восем, а потым яшчэ ўлічыць колькасць прэм'ер за год у кожным тэатры...

Але задавальненне гэта сапраўды дарагое. Таму што ўсім нам дарагое само тэатральнае мастацтва — промень жыцця сярод вялікай колькасці штучных эмоцый, якімі цябе імкнуцца гучна «запаліць». Тэатр гаворыць ціха. Але ягоная цішыня шматзначная.

Напрыклад, ціха, непрыкметна можна жыць без цікавых тэатральных фестываляў. Але «іх у нас ёсць»: 100—150 мільёнаў ідзе на штогадовыя датацыі фестывальных праграм. Калі пільна прыглядзецца, ёсць сярод іх міжнародныя, якія праходзяць у нас у краіне. Прынамсі, у гэтыя дні на сцэне тэатра Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў адбываецца шосты дзіцячы міжнародны фестываль «Крок у неба», прыехалі тэатры з Расіі, Украіны, Літвы, Польшчы. «Белая вежа» ў Брэсце ёсць. А мінчане ўсё ўспамінаюць колішнюю «Панараму»... Да восені — Купалаўскі тэатр мае намер яе адрадзіць сёлета. Народны артыст Беларусі Валерый Раеўскі спіс агучыў — каго і чаму запрасілі. Ён жа ведае, чаму Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы з яго беларускай мовай добра прымаюць на фестывалях у іншых краінах, прычым, без перакладу...

А ці хочам мы ведаць, што патрэбы нацыянальных тэатраў, такіх, як Купалаўскі ці імя Горкага, дзяржава фінансуе на 70—75 працэнтаў? І гэта лічбы, пра якія іншыя могуць марыць: невялікія тэатры датуюцца на 65—70 працэнтаў. У асаблівым становішчы з-за рамонту Тэатр оперы і балета. За гэта яму «накінулі» — да 90 працэнтаў выдаткаў пакрываецца з дзяржбюджэту. Яшчэ штосьці тэатры зарабляюць самі. Апошнім часам сталі зарабляць трошкі больш. А ці заўважылі гэта артысты? Цікава, ці заўважылі яны, як падраслі іх заробкі: да мільёна ў вялікіх цэнтральных тэатрах і ад 450 да 550 тысяч у маленькіх, перыферыйных?

Можна, сапраўды можна парадавацца за іх. І за тое, што пракладзе беларускае мастацтва шлях на Усход. Балет і опера гастралююць у Кітаі, Карэі, Тайландзе. Сталічны тэатр юнага гледача паедзе па экзотыку ў Арабскія Эміраты. Прашу заўважыць: у багатыя Эміраты! Калі паглядзець на такія магчымасці тэатраў паказаць сябе, то няма чаго нам прыбядняцца.

Калі б не хацелася быць патрыётам. Так, я люблю беларускі тэатр. Люблю, калі ён не аднастайны, калі ў ім віруе жыццё, а не адчуваецца нафталінавы пах. Калі ў ім ёсць асобы. Калі да тых, што ёсць, далучаюцца новыя асобы, маладыя. 60—70 мільёнаў у год ідзе на падтрымку пастановак маладых рэжысёраў. Гэта прыкладна шостая частка. Значыць, на шэсць рэжысёраў, якія працуюць даўно, павінна штогод з'яўляцца адна маладая асоба, якая хоча перавярнуць зямлю, ці хоць бы беларускі тэатр — а без гэтага жадання як ісці ў мастацтва?.. Але ён усё трымаецца, такі ж як і трыццаць, дваццаць гадоў таму. І Беларуская акадэмія мастацтва працуе, штогод тэатры папаўняюцца ня выпускнікамі. Не разумею, у чым тут справа: можа ў нашым беларускім кансерватызме? У павазе да прызнаных аўтарытэтаў, якіх хопіць і так, больш не трэба — тады гэта ўжо быццам бы здаровы кансерватызм?..

Апошняе, думаю, трэба адкінуць. Дзяржава ж робіць конкурсы для маладых рэжысёраў ці драматургаў. Хочацца верыць, што не здарма! Значыць, ёсць адчуванне праблем. Першы намеснік міністра Уладзімір Рылатка назваў самую актуальную на сёння. Яна, у прынцыпе, тая ж, што і на ўчарашні дзень: беларуская драматургія і прыток у яе новых сіл. Ёсць задума на базе тэатра Беларускай драматургіі стварыць Цэнтр беларускай драматургіі. Але задача стаіць фантастычная нават для цэнтралізаванага яе вырашэння: каб беларускія п'есы складалі трэцюю частку рэпертуару тэатраў. Тут якраз юбілей Купалы і Коласа падаспеў, у тэатраў ёсць нагода падняць паказчыкі па беларускай драматургіі. Прыкмета года: сёлета ў Беларусі з'явіцца многа «Прымакоў»...

Класікі заўжды дапамагаюць, што было б без іх? Прычым не толькі з паказчыкамі тэатраў. Стаў іх п'есы — і вось табе вечныя беларускія пытанні, на ўсе часы, амаль што гамлетаўскія.

Ларыса ЦІМОШЫК.

КІРМАШ

штотыднёвы рэкламны выпуск № 11 (543)

аддзел рэкламы ☎ 287-17-79

Рэквізіты для аплаты:
р/р 3012210270016
у ААТ "Белінвестбанк"
г.Мінска, код 739
УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АББЕСТКІ

Прадаецца

■ Дом з г/п, лазня, сад, агарод 60 сотак, побач рэчка, лес, у Бярэзінскім раёне.
Тэл. (8-017) 231-16-23.

■ Дом драўляны, абкладзены цэглай, у в. Барадзіно, дзяржакт на 25 сотак зямлі, г/пабудовы, 3,5 тыс. у.а.
Тэл. (8-02155) 4-25-29.

■ Жылы драўляны дом пад знос, памер 6х13, 15 км ад Нясвіжа.
Тэл. 8-029-135-79-31.

■ Дом у г.п. Гарадзея Нясвіжскага раёна, плошчай 113 кв.м, маецца газ, вада, участак 20 сотак, г/п, гараж.
Тэл. (8-01770) 57-548, пасля 19.00.

■ Дом драўляны, ашалёваны, 100 кв.м, узорнай культуры, г/п, гараж, склеп, тэлефон, 50 сотак зямлі, побач возера, прыемнае месца для адпачынку.
Тэл. (8-02354) 39-444.

■ Дом-дача ў в. Каменка Шчучынскага раёна, сад, тэлефон, побач возера, лес.
Тэл. (8-01514) 35-017.

■ Гараж 3х6 у Мінску па вул. Трасцянецкай, падвал, ахова, 7,9 тыс. у.а.
Тэл. 8-029-654-11-62.

■ Кватэра ў будуемым 2-кватэрным доме з магазінам-майстэрняй (11 км ад Брэста), пастаянная сумесная справа.
Тэл. 8-029-601-69-81.

■ «Масквіч-412» 1991 г.в., прабег 39 тыс. км, танна.
Тэл. (8-01633) 21-156.

■ Дом у в. Забродцзе Вілейскага раёна, маюцца г/п, калодзеж, сад, участак 18 сотак.
Тэл. (8-01774) 73-337, 8-029-292-44-58.

■ «Ява-350» 1985 г.в., 250 у.а.
Тэл. (8-01797) 46-836, пасля 18.00.

■ Трактар Т-40 1999 г.в.
Тэл. 8-029-936-28-09.

■ Трактар Т-16, 1600 у.а.
Тэл. 8-029-774-49-81.

■ Электракацёл КПЭ-60 на 60 л для варкі ежы, з нержавейкі, новы, вуллі на 16 рамак новыя, рэсоры да легкавога прычэпа «Зубраня».
Тэл. (8-01710) 27-972.

■ Гармонік «Беларусь» у футляры, два колы да мапеда, нядорага.
Тэл. (8-01719) 47-822.

■ Сячкарня з электрарухавіком.
Тэл. 8-029-706-84-63.

■ Пчолы каўказскія з вуллямі Лявіцкага, нядорага.
Тэл. (8-01597) 99-532.

■ Пішучая машынка малога фармату (Erika).
Тэл. (8-017) 284-26-50.

■ Самаробны трактар 20 к.с. — 1100 у.а., цыркулярка, бароны, прычэп.
Тэл. (8-01770) 35-363, пасля 15.00.

Куплю

■ Мотаблок МТЗ і з/ч да яго.
Тэл.: (8-01717) 56-912, 8-029-564-62-70.

■ Аўтамабіль «Аўдзі» ці «VW», можна з невялікімі дэфектамі.
Тэл. (8-029) 771-51-78.

■ Куплю трактар Т-16 з дакументамі, магчыма на з/ч.
Тэл. 8-029-706-84-63.

■ Старыя фотаапараты, аб'ектывы, значкі, паштоўкі па фотатэматыцы.
Тэл. 8-029-850-17-29.

■ Трактар Т-25 ці МТЗ, з гаспадарчымі агрэгатамі да іх.
Тэл. 8-029-936-28-09.

Рознае

■ Брыгада выканае ўсе будаўнічыя работы хутка і якасна з матэрыялу заказчыка.
Тэл. 8-029-761-87-25.

■ Зрубліу зруб з матэрыялу заказчыка.
Тэл. (8-02158) 28-270.

■ Сям'я здыме 1-пакаёвую кватэру, дом ці 1/2 дома ў г. Мінску ці прыгарадзе. Своечасовую аплату гарантуем.
Тэл. 8-029-259-16-41.

■ Абіўка мяккай мэблі.
Тэл. (8-017) 240-71-44.

ЗВЯЗДА

КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ
Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі
220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ваша прозвішча, адрас, хатні тэлефон.

Тэлефон для даведак 287-17-79.

Пашпарт серыя_____ № _____ Выданы_____

Подпіс_____ Дата_____

ОДО "СТОМИЛБЕЛ"
Минск, ул. Маяковского 111-50
РЕМНИ ПРИВОДНЫЕ
РУКАВА ВЫСОКОГО ДАВЛЕНИЯ
К СЕЛЬХОЗТЕХНИКЕ ОТЕЧЕСТВЕННОГО И ЗАРУБЕЖНОГО ПР-ВА, ПРОМЫШЛЕННОМУ ОБОРУДОВАНИЮ И АВТОТРАНСПОРТУ
САЛЬНИКИ (МАНЖЕТЫ)
Т./ф: (017) 223-64-40 223-10-13
(0162) 41-67-03 (0165) 34-58-49
stomil bel
TPGarant

*Сардэчна віншуем дарагую **Аксану Аляксандраўну КАРПЕЙЧЫК** з в. Райца з днём нараджэння. Жадаем моцнага здароўя, поспеху у працы, дабрабыту.*

Мама, муж, дачушка.

*Віншую дачушку **Жанну Мікалаеўну ВЯЛЬКО** з днём нараджэння. Зычу шчасця і здароўя і заўжды каб была ў душы вясна.*

Бацька і ўся вялікая сям'я, в. Гоцк.

*Віншуем **Іну Міхайлаўну САНЧУК** з днём нараджэння. Шчыра жадаем здароўя, кахання, удачы і шчасця ў жыцці.*

Калегі.

*Віншуем з днём нараджэння **Юрыя Віктаравіча ДУНЦА.** Жадаем шчасця, здароўя, плённай працы, дабрабыту і радасці ў сям'і.*

Насця і Наташа, в. Камарова.

*Сардэчна віншую з днём нараджэння **Вольгу Мікалаеўну БАЛТРУКАНІС** з в. Лапенкі.*
Хай будзе заўсёды здароўе і сіла,
Жыццё няхай будзе доўгім, шчаслівым.

Цётка Вера, в. Галынь.

Считать недействительными страховые полисы по обязательному страхованию ГО владельцев транспортных средств на тер. РФ серии ААА 0291812646—0291812665 СООО «Белкоопстрах».

ЗАО «АМКОДОР-УНИКАБ» ТРЕБУЕТСЯ

слесарь-сборщик по сборке сложных металлоизделий методом электросварки по технической документации. Оплата от 500 тысяч рублей.

Телефон отдела кадров: 8 (01773) 6-81-04.

ЗАО «Амкодор-Уникаб» имеет возможность оказывать услуги по раскрою листового металла толщиной от 1 мм до 8 мм.

Тел.: 8 (01773) 5-38-83, 8 (01773) 6-04-32.

Згубленае пасведчанне інваліда I групы серыі 08 № 0084375, выдадзенае на імя Заранчука Алега Іванавіча, *лічыць несапраўдным.*

У суд Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці паступіла заява аб прызнанні памерлым **МАЛАШЭВІЧА Сяргея Іванавіча**, 2 кастрычніка 1964 года нараджэння, ураджэнца в. Астроўчыцы Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці, які пражываў у г. Светлагорску па вул. Сацыялістычнай, 53, кв. 68. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра С.І. Малашэвіча, паведаміць іх суду Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У суд Слуцкага раёна Мінскай вобласці паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **СВЯТЛІЧНАГА Ігара Дзмітрыевіча**, 8 лютага 1969 года нараджэння, ураджэнца в. Рудня Слуцкага раёна Мінскай вобласці, апошняе вядомае месца жыхарства: г. Слуцк, вул. Сацыялістычная, д. 140, кв. 42. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра І.Д. Святлічнага, паведаміць іх суду Слуцкага раёна на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У вытворчасці суда г. Наваполацка Віцебскай вобласці знаходзіцца грамадзянская справа аб прызнанні адсутнай без вестак **ВАСІЛЬКОВІЧ Вольгі Міхайлаўны,** 1971 года нараджэння, ураджэнкі г. Наваполацка, якая пражывала ў г. Наваполацку па вул. Паркавая, д. 4, кв. 47. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць нейкія звесткі пра грамадзянку В.М. Васільковіч, паведаміць іх суду г. Наваполацка на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У суд Кастрычніцкага раёна г. Мінска паступіла заява аб прызнанні памерлым **БЕЛАВУСА Анатоля Сямёнавіча**, 6 мая 1959 года нараджэння, ураджэнца сяла Буралом-1 Міёрскага раёна Віцебскай вобласці, апошняе вядомае месца жыхарства ў г. Мінску — вул. Казінца, 120-354. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра грамадзяніна А.С. Белавуса, паведаміць іх суду Кастрычніцкага раёна г. Мінска (вул. Сямашкі, 33) на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У ЦЭНТРЫ ЕЎРОПЫ ПАВІННА БЫЦЬ ЗАБЯСПЕЧАНА ЕЎРАПЕЙСКАЯ ЯКАСЦЬ ПАСЛУГ

Вадзіцель бензавоза Анатоль ІОДКА.

АЗК № 36.



На АЗК № 41 шмат маладых супрацоўнікаў. Алена ГУМЕННАЯ працуе тут бармэнам-прадаўцом.

Аператараў Алену КАЧАЛАВУ і Настассю ПЕРАВЁРТАВУ можна ўбачыць не толькі на іх працоўных месцах, але і на маляўнічых рэкламных плакатах каля АЗК № 41.

БЯСПЕЧНЫЯ ЎМОВЫ: НЕ ТОЛЬКІ ДЛЯ СВАІХ РАБОТНІКАЎ, АЛЕ І ДЛЯ КЛІЕНТАЎ

Дарэчы, карэспандэнты «Звязды» не маглі не заўважыць, што на кожным сходзе кадравага дня вельмі падрабязна прааналізавалі ўсё, што звязана з такім прынцыпова важным пытаннем для кожнай аўтазапраўкі ці склада захоўвання нафтапрадуктаў, як ахова працы. Былі абмеркаваны вынікі нядаўна праведзеных з усімі работнікамі заняткаў, пытанні забеспячэння проціпажарным абсталяваннем, набыцця спецыяльнага адзення — не толькі зручнага, але і прывабнага па дызайну.

— У нашым калектыве надаецца першачарговая ўвага пытанням пажарнай бяспекі, прафілактыкі прафесійных захворванняў, прадухілення траўматызму, — зазначае інжынер па ахове працы і тэхніцы бяспекі **Пётр Бяленка.** — Вучым, падказваем людзям, як сябе паводзіць, каб пазбегнуць розных ускладненняў у працэсе работы. За апошні час прайшлі перападрыхтоўку ўсе нашы спецыялісты на чале з галоўным інжынерам. Пастаянна праводзіцца атэстацыя рабочых месцаў на адпаведнасць патрабаванням па ахове працы, санітарнай гігіене і іншым стандартам. Бачым праблемнае пытанне — стараемся яго вырашыць. У прыватнасці, вельмі важная справа зроблена на мыйцы АЗК № 36, дзе сваімі сіламі пабудавана практычна новая кацельня, якая дазволіць не толькі пастаянна падтрымліваць аптымальны тэмпературны рэжым, але і дае выгаду з пункту гледжання энергазбяражэння. Праверка ведаў па ахове працы адбываецца штогод, прычым гэта датычыцца ўсіх работнікаў — ад начальніка аўтазаправачнай станцыі да прыбіральшчыка тэрыторыі. Не здаў адпаведны экзамен — не будзеш дапушчаны да работы.

Клапоцяцца, зразумела, аб бяспечных умовах не толькі для сваіх работнікаў, але і для кліентаў. Усе аўтазаправачныя станцыі і склад захоўвання нафтапрадуктаў, як пераканаліся журналісты «Звязды», аснашчаны разнастайнымі плакатамі папярэджання, знакамі бяспекі ў мэтах строгага выканання правілаў дарожнага руху. Вельмі сур'ёзны падыход і да проціпажарнага абсталявання: штогод згодна з графікам ажыццяўляецца паверка і перазарадка ўсіх вогнетушыцеляў з атрыманнем адпаведных дакументаў.

Фірменнае спецадзенне — таксама зусім не дробязнае пытанне.

— У СП ЗАТ «Слаўнафта-Старт» распрацаваны адпаведны дызайн рабочага адзення, — гаворыць Пётр Бяленка. — Гэта спецыяльныя касцюмы і для работнікаў аўтазаправачных станцый, і для электрыкаў, рамонтнага персаналу, спецыялістаў нафтабазы, і для прадаўцоў нашых магазінаў, афіцыянтаў, бармэнаў. Ёсць ужо нават дызайн, скажам так, лёгкага адзення для кухараў, паколькі ім даводзіцца працаваць ва ўмовах павышаных тэмператур.

Спецадзенне і сапраўды зручнае і прыгожае, аднак яго трэба мяняць (раз у год) і існуюць пэўныя цяжкасці з пашывам, дакладней, з матэрыялам, які павінен быць антыстатычным. Вытворцы такой сыравіны ад супрацоўніцтва не адмаўляюцца, але просяць, каб была вялікая партыя. А нам, кажа Пётр Бяленка, столькі не трэба. Дык, можа, як на запраўчных станцыях індывідуальна падыходзяць да абслугоўвання кожнага кліента, так трэба ставіць да іх заказаў і прамысловым прадпрыемствам?

Начальнік АЗК № 36 Галіна ШОКА.

На складзе нафтапрадуктаў № 12.

Дырэктар склада нафтапрадуктаў Міхаіл ЮРКОЎ.

НАФТАПРАДУКТЫ І ...КВЕТКІ

Журналісты «Звязды» звярнулі ўвагу, што на сустрэчах кадравага дня абмяркоўваюцца не толькі чыста вытворчыя праблемы, але і пытанні добраўпарадкавання тэрыторый. Практычна ўсё ў гэтым накірунку выконваецца ўласнымі сіламі — набываюць пасадачны матэрыял, разбіваюць газоны. І самім прыемна, і кліентам. Дарэчы, АЗК № 41 прызнаны пераможцам, у АЗК № 36 — другое месца ў гарадскім агляд-конкурсе ў намінацыі «Лепшае кветкавае афармленне». А філіял у цэлым першынстваваў па выніках першага этапу рэспубліканскага конкурсу на лепшую кампазіцыю па азеляненню і добраўпарадкаванню тэрыторый і ўзнагароджаны дыпломам Гродзенскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

І яшчэ адно назіранне. Мы жывём ва ўмовах рынкавай эканомікі, але, мяркуючы па танальнасці сустрэч у працоўных калектывах, вялікая ўвага надаецца і планаванню работы. Здавалася б, невялікае адставанне аднаго з падраздзяленняў ад намечаных арыенціраў становіцца прадметам падрабязнага аналізу.

Зрэшты, удакладнілі ў гродзенскім філіяле СП ЗАТ «Слаўнафта-Старт», тут не даводзяцца планы, а даюцца заданні кожнаму структурнаму падраздзяленню філіяла, зыходзячы з узроўню мінулага года і тэмпаў росту на гэты. І сапраўды, трэба ж на нешта раўняцца і ведаць, да чаго імкнуцца. Каб забяспечыць тую рэнтабельнасць, якая дазволіць кожнаму калектыву нармальна жыць, атрымліваць дастойную зарплату і прэміяльныя. Пры гэтым прынцыпова важна не дапусціць, каб была нейкая абязлічка. Ніхто не павінен жыць за кошт іншага, агульных вынікаў. Бо хіба ж гэта справядліва, калі аднаму — абы, як кажуць, дзень да вечара, а нехта будзе «гарбаціцца» па поўнай праграме, зарабляючы ў тым ліку і на першага? «Не, кожны павінен зарабляць на сябе» — неаднойчы падкрэслівалася падчас кадравага дня. Ведаць, колькі за змену рэалізаваць прадукцыі, памыць машын... І абавязкова якасна, паколькі ў адваротным выпадку будзе пазбаўлены прэміі. А аўтазапраўка, адпаведна, страціць кліента, які мог стаць для яе пастаянным. Гэта як з прычоскай, калі ты стараешся сесці да пэўнага цырульніка, паколькі ўпэўнены ў якасці яго працы.

Тут захоўваюцца гаруча-змазачныя матэрыялы.

На ўчастку, дзе мыюць аўтамабілі, дзейнічае самае сучаснае абсталяванне. Тут гаспадарыць машыніст мыйнай установкі Міхаіл СТАНЦЭЛЬ.

— Адсюль адгружаюцца гаруча-змазачныя матэрыялы, — кажа аператар таварнай Сяргей БАРДЗІЛОЎСКІ.

Аператар АЗК № 41 Уладзімір СВІЦЕЛЬСКІ заўжды параіць аўтавадзіцелям лепшыя маркі маслаў.

«ВІЗІТНАЯ КАРТКА» КРАІНЫ

Аб гэтым — якасці прадукцыі, таваразнаўстве, культуры абслугоўвання, стварэнні самых спрыяльных умоў для кліентаў — таксама ішла гаворка на сходах кадравага дня. Запомніліся словы, што аўтазаправачная станцыя, асабліва ў памежным рэгіёне — гэта не проста прадпрыемства па забеспячэнню аўтамабіляў бензінам, дызпалівам і звадкаваным газам, а ў пэўным сэнсе «візітная картка» нашай краіны. Калі госць прыязджае ў Беларусь і спыняецца на АЗК, то ў яго адразу ж складваецца ўражанне не толькі аб гэтым канкрэтным прадпрыемстве, але і ў цэлым аб краіне. А паколькі мы знаходзімся ў цэнтры Еўропы, то павінны забяспечыць і еўрапейскую якасць паслуг. Зразумела, не толькі для сваіх гасцей, а перш-наперш для саміх сябе.

Безумоўна, у гэтым накірунку зроблена яшчэ далёка не ўсё, ёсць шмат задумак на будучыню. Каб было не горш, чым, напрыклад, у Фінляндыі, дзе на першым паверсе аператарскага будынка аўтазаправачнага комплексу — жаночая і мужчынская цырульні, «Макдональдс», гандлюючь біжутэрыяй, на другім — гасцініца, рэстаран. Побач — спецыяльныя пляцоўкі пад навесамі, дзе ляжаць нарыхтаваныя для барбекю дровы і вугольчык. Прыехалі сям'ёй, спыніліся і адпачываюць, падагрэўшы свой правіянт альбо купіўшы, што хочаш, у кафэ.

— Мы таксама не збіраемся абмяжоўвацца тым асартыментам паслуг нашым кліентам, які ёсць ужо сёння, і маем планы па іх пашырэнню, — гаворыць галоўны інжынер філіяла СП ЗАТ «Слаўнафта-Старт» у Гродне **Міхаіл Калодка**. — У прыватнасці, у пасёлку Пагранічны, што ў Бераставіцкім раёне, будзе пабудаваны комплекс прыдарожнага сэрвіснага абслугоўвання. Праектам прадугледжаны стаянка на 60 вялікагрузных аўтамабіляў, станцыя тэхнічнага абслугоўвання, мыйка легкавых і грузавых машын, гасцініца на 20 месцаў, кафэ, магазін, кіёскі па афармленню неабходных для перасячэння дзяржаўнай мяжы дакументаў.

Цяпер гэты праект праходзіць экспертызу і неабходныя ўзгадненні з тым, каб сёлета, як намечана, пачаць будаўніцтва. Акрамя таго, запланавана пабудаваць яшчэ дзве аўтазаправачныя станцыі — у абласным цэнтры і ў Гродзенскім раёне. Ці не замнога будзе? А давайце задумаемся, як устроена наша псіхалогія. Машыну дзе хочацца паставіць? Побач з домам. Так і з аўтазапраўкамі. Чым менш кліент будзе рухацца ў пошуку прадпрыемства па забеспячэнню палівам, тым лепш з пункту гледжання і экалогіі, і нагрузкі на транспартныя магістралі і вуліцы ў гарадах і, зразумела, для аўтаўладальніка. Але часта здараецца так, што хоць у гэтым месцы ўсе экалагічныя пытанні і могуць быць вырашаны на сто працэнтаў, аднак АЗК будуецца недзе на ўскраіне. Вадзіцель едзе туды пяць-шэсць кіламетраў і, да таго ж, шкодзіць пры гэтым той жа экалогіі. Хоць тэхналогіі, па якіх сёння ў нас будуюцца аўтазаправачныя станцыі, цалкам бяспечныя і для людзей, і для навакольнага асяроддзя. Кожны аб'ект, падкрэсліваюць у гродзенскім філіяле СП ЗАТ «Слаўнафта-Старт», праходзіць экалагічную экспертызу, і яна ніколі не дазволіць рэалізацыю праекта, калі там не будуць вырашаны ўсе пытанні бяспекі людзей і экалогіі. Заўважце, апасенні ўзнікаюць толькі перад пачаткам будаўніцтва, а калі пабудавалі, то ніякіх праблем нідзе не існуе, усе задаволеныя.

У ІНТАРЭСАХ СЕЛЬГАСВЫТВОРЦАЎ

Даволі актуальным, на думку Міхаіла Калодкі, з'яўляецца і пытанне набліжэння да кліентаў баз захоўвання нафтапрадуктаў. Лічыцца, што сто кіламетраў да склада — нармальная адлегласць. Але праблема ў тым, што не ўсе клієнты маюць тэхніку, аўтазаправачныя цыстэрны для перавозкі паліва, абсталяваныя ў адпаведнасці з патрабаваннямі Праматамнагляду. Іншы і рады прыехаць за гэтым палівам за сто кіламетраў, аднак у яго няма такой магчымасці. Развіць такую сетку па колькасці транспарту прадпрыемствы, якія займаюцца рэалізацыяй нафтапрадуктаў у Гродзенскім рэгіёне, пакуль таксама не могуць. Таму ў інтарэсах кліентаў і ўяўляецца мэтазгодным размяшчэнне на тэрыторыі вобласці яшчэ некалькіх складоў, каб наблізіць іх да спажыўцоў. Падобны вопыт ёсць у нашых суседзяў з Беластоцкага ваяводства Польшчы, дзе для пэўных тэрыторый ствараюцца так званыя зліўныя пункты. Там назапашваецца паліва, кліенты, тыя ж фермеры, прыязджаюць на трактары альбо на кані, запампоўваюць паліва і прывозяць дахаты.

Дарэчы, калі размова зайшла аб аграрніках, то нельга не заўважыць, што СП ЗАТ «Слаўнафта-Старт» аказвае вялікую падтрымку сельгасвытворцам. Бывае, канешне, праблематычна з разлікамі, але за мінулы год толькі гродзенскі філіял за кошт рэалізацыі нафтапрадуктаў са скідкай скарацію расходы аграрнікаў вобласці прыкладна на 10 мільярдаў рублёў. Цяпер таксама маецца такая магчымасць. Дарэчы, у Мінскай вобласці нядаўна быў праведзены тэндар па забеспячэнню сельгасвытворцаў дызельным палівам і яго выйграла СП ЗАТ «Слаўнафта-Старт». У гэты рэгіён пастаўлена дызпаліва на суму 18 мільярдаў рублёў.

Барыс ПРАКОПЧЫК, Віктар ПАЗНЯКОЎ, Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

Ветліва сустракаюць наведвальнікаў Святлана СКІБА і Марыя КЛІМУК — прадаўцы магазіна, які размешчаны на АЗК № 41.

НЕ ТОЛЬКІ Ў НЕАБМЕЖАВАНАЙ КОЛЬКАСЦІ, АЛЕ І З ЦЭНАВЫМІ СКІДКАМІ

Да ўвагі прадпрыемстваў і арганізацый

Пры рэалізацыі нафтапрадуктаў оптам, пры стопрацэнтнай папярэдняй аплаце (не пазней за апошні рабочы дзень перад днём адгрузкі) кліентам СП ЗАТ «Слаўнафта-Старт» прадастаўляюцца скідкі ад цаны. Прычым, калі раней скідка рабілася на пэўны від паліва, то цяпер суб'ект гаспадарання атрымлівае цэнавую скідку на аб'ём розных нафтапрадуктаў, будзе гэта дызпаліва альбо бензін.

Пры рэалізацыі з АЗК па электронных картках прадастаўляюцца скідкі ад 1,5 да 3 працэнтаў

— Сёлета мы плануем сканцэнтраваць сваю працу на забеспячэнні нафтапрадуктамі ўнутранага рынку вобласці, — гаворыць намеснік дырэктара філіяла па камерцыйных пытаннях **Аляксандр Шэршань.** — Наш філіял рэалізуе са склада захоўвання ў Гродне шырокі асартымент нафтапрадуктаў у неабмежаванай колькасці. Акрамя таго, у СП ЗАТ «Слаўнафта-Старт» рады прапанаваць сваім кліентам высакаякасныя маторныя, трансмісійныя, энергетычныя і індустрыяльныя маслы, а таксама пластычныя змазкі вытворчасці ААТ «Слаўнафта-Яраслаўскі НПЗ імя Дзм.І. Мендзялеева», на якім дзейнічае найноўшая ў Расіі лінія па вытворчасці гэтых прадуктаў, пастаянна ўдасканальваецца тэхналогія вытворчасці і пашыраецца асартымент вырабляемай прадукцыі.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zvyazda.minsk.by **E-mail:** info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 37.095. Індэкс 63850. Зак. № 1682. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12